КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 13 (1243) 26 сакавіка 2016 г.

Соцыум

Акцэнты і мэты пяці гадоў

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 4 сакавіка 2016 года № 180 зацверджана Дзяржаўная праграма "Культура Беларусі" на 2016 — 2020 гады. 18 сакавіка згаданы нарматыўна-прававы акт зарэгістраваны ў Нацыянальным рэестры прававых актаў Рэспублікі Беларусь. Якія прыярытэты вызначаны гэтым дакументам? Якое фінансаванне прадугледжана на далейшае развіццё галіны? Акрэслім асноўныя акцэнты дакумента, які на пяць гадоў стане галоўным для работнікаў культуры. Наступны тэкст заснаваны на вытрымках з праграмы, якая ўтрымлівае чатыры падпраграмы.

Фінансавае забеспячэнне і асноўныя рызыкі

На рэалізацыю Дзяржпраграмы патрабуюцца сродкі ў памеры 29 841 955 560,5 тысячы рублёў, у тым ліку з рэспубліканскага бюджэту — 5 021 262 163,9 тысячы, з мясцовых бюджэтаў — 19 607 345 688 тысяч, з уласных сродкаў арганізацый — 5 213 347 708,6 тысячы рублёў.

Асноўныя рызыкі пры выкананні праграмы звязаны са скарачэннем сеткі ўстаноў, зменай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў краіне, з неэфектыўным кіраваннем рэалізацыяй праграмы, уключаючы кіраванне фінансавымі, кадравымі і матэрыяльнымі рэсурсамі. Для прадухілення негатыўных вынікаў улічваліся наступныя механізмы па кіраванні рызыкамі і меры па іх мінімізацыі: комплекснае вырашэнне задач дзяржпалітыкі ў галіне культуры, падтрымка прыярытэтных кірункаў развіцця нацыянальнай культуры (ахова гісторыка-культурнай спадчыны, падтрымка тэатральна-відовішчных арганізацый і арганізацый кінематаграфіі, развіццё ўсіх відаў мастацтва), мадэрнізацыя і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, забеспячэнне інавацыйнага развіцця, адаптацыя мерапрыемстваў праграмы да сацыяльна-эканамічных змен, варыянтнасць падыходаў да рэалізацыі асобных мерапрыемстваў, актывізацыя ўзаемадзеяння органаў дзяржкіравання з арганізацыямі суайчыннікаў за мяжой, накіраванне пазабюджэтных (уласных) сродкаў арганізацый культуры на выкананне мерапрыемстваў праграмы.

"Спадчына"

У сістэме Міністэрства культуры дзейнічае 151 музей. Сетка скарацілася на 9 адзінак: да Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры ў якасці філіялаў далучыліся музеі Максіма Багдановіча, Петруся Броўкі, да Нацыянальнага гістарычнага — музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, прыроды і экалогіі. Рэарганізаваны ўстановы ў Магілёўскай, Гомельскай і Гродзенскай абласцях.

Заканчэнне чытайце **на старонцы 4.**

4 беларускія тэатры маюць статус "нацыянальны"

6 міжнародных тэатральных фестываляў і форумаў праведзена ў краіне ў 2015-м

8 тэатраў — у рэспубліканскім падпарадкаванні

21 дзяржаўны тэатр — у мясцовым падпарадкаванні

27 САКАВІКА — МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ТЭАТРА

28 дзяржаўных прафесійных тэатраў адносяцца да сістэмы Міністэрства культуры

29 дзяржаўных прафесійных тэатраў працуе ў рэспубліцы

30 навінак пастаўлены паводле п'ес беларускіх аўтараў

120 прэм'ер — да такой лічбы наблізілася колькасць леташніх прэм'ер у дзяржаўных тэатрах

1 681 з іх прыпадае на рэспубліканскія тэатры

8 685 паказаў спектакляў па прагнозных даных праведзена летась

538 512 з іх прыйшлі ў рэспубліканскія тэатры

1 805 001 чалавек наведалі спектаклі ў 2015-м

Працяг тэмы — **на старонках 2, 8 — 9.**

"Круглы стол"

Музейны прадукт для адукацыі

"Круглы стол" пад назвай "Патэнцыял музейнай педагогікі ў выхаванні асобы" адбыўся 22 сакавіка ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы. Удзельнікі сустрэчы надалі ўвагу пытанням супрацоўніцтва ўстаноў адукацыі з дзяржаўнымі музеямі.

Вольга РОПАТ

Сустрэча ўдзельнікаў "круглага стала" — членаў Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, намесніка дырэктара па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце сталічнай гімназіі № 37 Юліі Скадорва, а таксама выкладчыка кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Белдзяржуніверсітэта Вольгі Мірончык пачалася з таго, што супрацоўнікі музея на чале з дырэктарам Аленай Ляшковіч паказалі на жывым прыкладзе работу ўстановы: на інтэрактыўны музейны занятак "Гуканне вясны" прыйшлі школьнікі. Пасля прагляду пачалося абмеркаванне праблемных пытанняў музейнай педагогікі.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Наталля Кучынская падкрэсліла, што ў музейнай педагогікі вялікая будучыня: калі сто гадоў таму пра яе казалі як пра культурную дзейнасць, то зараз яна становіцца навукова-практычнай дысцыплінай, і ў гэтым працэсе трэба задзейнічаць, у тым ліку, нашу эмацыйнасць. Балазе музейная педагогіка знаходзіцца на стыку музеязнаўства, педагогікі і псіхалогіі. Старшыня камісіі Аляксандр Сягоднік у сваю чаргу адзначыў, што музейная педагогіка — складнік сістэмы адукацыі. Канешне, не кожная школа мае магчымасць стварыць музей або музейны пакой, але чаму б установам адукацыі не рухацца ў гэтым кірунку. Іншы шлях дэманструе Дзяржаўны літаратурны музей імя Янкі Купалы, які зараз выходзіць на іншы ўзровень працы, — праграмнае супрацоўніцтва. (Алена Ляшковіч, дарэчы, падкрэсліла, што ўстанову ў 2015 годзе наведала амаль 125 тысяч чалавек, з якіх 75% — школьнікі, а за апошнія сем гадоў колькасць наведвальнікаў наогул павялічылася амаль у два разы.) Так, распрацавана праграма доўгатэрміновага ўзаемадзеяння са сталічнай гімназіяй № 37. Юлія Скадорва прывяла прыклад: прысвячэнне ў гімназісты адбылося на базе музея, а ўжо на тэматычны тыдзень "Гуканне вясны", арганізаваны гімназіяй, прыехаў музей.

Загадчык аддзела культурна-адукацыйнай работы музея Вольга Пархімовіч дадала, што выкарыстанне мультымедыйных тэхналогій стала новым узроўнем падачы інфармацыі. У барацьбе за свайго наведвальніка купалаўцы больш увагі надаюць музейна-педагагічным інтэрактыўным праграмам. Так, напрыклад, на мерапрыемства "У пошуках Папараць-кветкі" спачатку прыйшоў толькі адзін клас гімназіі № 16, а потым — усе вучні: з першага па адзінаццаты класы. Музей праводзіць музейна-педагагічныя заняткі на базе ўстаноў адукацыі: распрацаваны 4 тыпы заняткаў для вучняў малодшых класаў і дзевяць — для 5 — 11 класаў. У 2015-м у супрацоўніцтве з IT-спецыялістамі быў створаны шрыфт "PIASNIAR", які змешчаны ў Сеціве ў вольным доступе і ўзнаўляе почырк беларускага паэта. А ідэю прапанаваў чалавек, які не мае ніякага дачынення да музея.

Затым Вольга Пархімовіч акрэсліла тэму якасці музейных паслуг, а таксама ўзаемадзеяння паміж школамі і музеем. Названыя аспекты ацанілі педагогі і вучні сталічных школ у час анкетавання, у якім прымалі ўдзел 100 чалавек.

Заканчэнне чытайце **на старонцы 6.**

Праекты развіцця

І ўсё ж ёсць нейкая пасіўнасць…

З нашай паездкі з генеральным дырэктарам Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Уладзімірам Пракапцовым у родны для яго край атрымалася значна большае, чым візіт ва ўстановы культуры з экскурсам у мінулае. Выйшла цэлае падарожжа па дарагіх для героя мясцінах наогул. Фінальнай кропкай маршруту была Жгунская Буда — вёска, у якой Пракапцоў нарадзіўся.

Алег КЛІМАЎ,
Мінск — Гомель — Добруш — Жгунская Буда — Мінск /
Фота аўтара

А пачаўся ваяж па Гомельшчыне ў абласной сталіцы з... мотаклуба "Начныя ваўкі": у ім размяшчаецца майстэрня скульптара Сяргея Парцянкова. Выстава яго незвычайных работ — стракоз, жукоў і іншых жамярын, выробленых з металічных дэталяў, пройдзе ў Нацыянальным мастацкім у сярэдзіне красавіка. Выпіўшы гарбаты, мы пакінулі творцу адбіраць экспанаты для паказу сталічнай публіцы, а самі выправіліся ў Добруш, дзе першым прыпынкам стаў Раённы краязнаўчы музей.

І замежжа дапамагае...

Кожны раз, наведваючы горад, Уладзімір Іванавіч з'яўляецца ў Раённы краязнаўчы не з пустымі рукамі: звыш 40 карцін — і яго пэндзля, і твораў іншых майстроў — перададзена ім сюды. У папярэдні, лютаўскі, прыезд такім падарункам стаў зімовы пейзаж маэстра "Старыя гнёзды", а цяпер ён прывёз (праўда, толькі часова) палатно Леаніда Дударэнкі "Сельская настаўніца" — партрэт мамы Пракапцова з калекцыі Нацыянальнага мастацкага. З канца 2008 года ў музеі дзейнічае мастацкая галерэя Пракапцова, дзе выстаўляюцца работы як яе заснавальніка, так і яго калег па цэху. У дзень нашага знаходжання ў музеі мы дакрануліся да часцінкі культуры Паднябеснай: апошнія дні працаваў перасоўны праект "Цудоўны Кітай", у рамках якога было прадстаўлена дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, нацыянальныя касцюмы.

— Музей не прастойвае, — кажа дырэктар Віталь Пякарскі. — Па магчымасці стараемся здзіўляць публіку цікавымі выставамі. Людзі гэта бачаць і ходзяць да нас ахвотна. Таму неяк асабліва выкручвацца, каб зарабіць, не даводзіцца. Фінансава садзейнічае пабрацім Добруша — горад Іціген, які не так даўно вылучыў нам 2 тысячы долараў.

Гэта швейцарская камуна — добры, бескарыслівы сябар Добруша. Сёлета акрамя музея партнёры дапамаглі і шэрагу іншых устаноў культуры горада: дзіцячай школе мастацтваў, раённаму палацу культуры, раённай бібліятэцы. І дапамога такая — не разавая: напрыклад, для РПК раней былі набыты аўтобус, інструменты…

Упор на беларускае

...Скончыўшы васьмігодку ў Жгунскай Будзе, у 9 — 10 класах Валодзя Пракапцоў навучаўся ў Добрушы ў сярэдняй школе № 2 імя Героя Савецкага Саюза Фёдара Кухарава. Вясной і ранняй восенню ён дабіраўся да горада (менш за 10 кіламетраў ад вёскі) аўтобусам, пешшу або на ровары, а позняй восенню і зімой разам з сябрам Валодзем Гарбачовым здымаў у Добрушы пакойчык. Культурныя забаўкі прыяцелям прапаноўваў Дом культуры (цяпер — Раённы палац культуры), самым яркім успамінам пра які для нашага героя стаў фільм Уладзіміра Басава "Шчыт і меч".

Заканчэнне чытайце **на старонках 10 — 11.**

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ. / З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Вакол Дня тэатра

Без конкурсу, ды з выйгрышам

Заўтра ў Магілёве завяршаецца XI Міжнародны маладзёжны тэатральны форум "M.@rt.кантакт". Канчатковыя яго вынікі яшчэ будуць падведзены, але папярэднія відавочныя ўжо цяпер.

— Вельмі радуе, — адзначыў міністр культуры нашай краіны Барыс Святлоў у прывітанні, агучаным падчас урачыстага адкрыцця, — што форум год ад году ўмацоўвае свае пазіцыі галоўнай пляцоўкі для маладых таленавітых дзеячаў тэатра Беларусі і замежжа, дзе можна ўбачыць самыя сучасныя і арыгінальныя спектаклі, а таксама абмеркаваць вострыя і актуальныя для тэатральнай моладзі пытанні.

Барыс Святлоў адзначыў такія важкія асаблівасці "M.@rt.кантакту-2016", як "багатая жанравая і тэматычная палітра спектакляў, прадстаўленых на форуме, разнастайнасць творчых форм і метадаў сцэнічнага ўвасаблення". Не меншую ролю, на думку міністра, адыгрывае і асветніцка-адукацыйны складнік фэсту: "Шырокая праграма творчых лабараторый, абмеркаванняў, "круглых сталоў" і іншых мерапрыемстваў, якія заўсёды іграюць вельмі важную ролю ў прафесійным станаўленні пачынаючых творцаў і адкрыцці шырокай дарогі ў чароўны свет мастацтва тэатра".

Калі раней на форуме працавалі два журы — прафесійнае і маладзёжнае, дык летась ад першага адмовіліся. Сёлета вырашылі канчаткова: няхай "M.@rt.кантакт" застаецца фестывальным, а не конкурсным па духу. Дарэчы, такі падыход уласцівы апошнім часам і сусветнай тэатральнай супольнасці: на міжнародныя фестывалі збіраюцца лепшыя калектывы са сваімі лепшымі пастаноўкамі, ужо само запрашэнне становіцца прызнаннем мастацкіх якасцей, спаборніцтву ж перашкаджаюць як арганізацыйныя пытанні (спектаклі трэба развесці ў часе, каб журы паспела паглядзець абсалютна ўсё), так і мастацкія (дык хто з даўно прызнаных класікаў ды авангардыстаў "самы-самы"?). Таму конкурс звычайна праводзіцца ў нацыянальных межах: вызначаюцца лепшыя калектывы, пастаноўкі, асобныя творчыя працы за пэўны перыяд. Ну, а кропкі над "і" на "M.@rt.кантакце" расстаўляюць крытыкі: штодзень адбываецца абмеркаванне ўчарашніх паказаў. Захаваны і прыз глядацкіх сімпатый: за яго можна галасаваць як у зале пасля кожнага з праглядаў, так і праз Інтэрнэт.

Яшчэ адной адметнасцю сёлетняга форуму стала яго большая скіраванасць на гледача. Калі ранейшыя фестывалі, як заўважыў дырэктар Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра Андрэй Новікаў, арыентаваліся на знаўцаў ды спецыялістаў, дык цяпер форум будзе пазіцыянавацца як свята для горада. Выйгрыш відавочны: калі раней на "M.@rt.кантакт" прадавалася каля дзвюх тысяч білетаў, дык цяпер — чатыры з паловай.

Сярод заўзятых гледачоў, як адзначыла на прэс-канферэнцыі тэатральны крытык, прафесар Таццяна Арлова, і кіраўніцтва абл- і гарвыканкамаў, якое "любіць тэатр, разумее, што фестываль дапамагае расці нацыянальнаму мастацтву". Дададзім, што таго ж Валерыя Малашку, намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама, можна бачыць ледзь не на кожным спектаклі. Форум "M.@rt.кантакт" ужо ў адпаведнасці з назвай "аб'ядноўвае, вучыць дабрыні, прыгажосці, гуманнасці", падкрэсліла крытык з Германіі Ніна Мазур.

Барыс Святлоў і Валерый Малашка падчас адкрыцця магілёўскага форуму. / Фота з сайта Магілёўскага гарвыканкама

Марына Шуста (злева) атрымлівае прэмію.

Падчас прэс-канферэнцыі да Міжнароднага дня тэатра ў Мінску.

Удзельнікі беларуска-французскіх праграм.

Прэмія на новы лад

У Нацыянальным прэс-цэнтры першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга ад імя Міністэрства культуры краіны павіншавала прадстаўнікоў тэатральнай супольнасці з Міжнародным днём тэатра.

"Гэта свята з'яўляецца не толькі добрай нагодай уручыць узнагароды і сказаць адзін аднаму прыемныя словы, але і падсумаваць нейкія вынікі развіцця тэатральнага працэсу", — падкрэсліла спадарыня Дрыга.

На прэс-канферэнцыі былі агучаны некаторыя паказчыкі. Прынамсі, летась дзяржаўныя прафесійныя тэатры паказалі 8 685 спектакляў, якія наведала каля двух мільёнаў чалавек. Прамоўца зазначыла, што мінулым годам беларусы пабачылі каля 120 прэм'ер. Прыемна, што трыццаць пастановак былі пастаўлены паводле п'ес айчынных аўтараў. Нашы калектывы змаглі выступіць перад гледачамі ў Азербайджане, Аўстрыі, Германіі, Італіі, Іспаніі, Кітаі, Латвіі, Літве, Польшчы, Расіі, на Тайвані, ва Украіне, у Францыі, Чэхіі і іншых краінах свету. У самой жа Беларусі, нягледзячы на няпростае фінансавае становішча, былі зладжаны 6 міжнародных тэатральных фестываляў. Асаблівы акцэнт прамоўца зрабіла на аднаўленні ў Бабруйску Рэспубліканскага фестывалю нацыянальнай драматургіі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. "Па-рознаму ставіліся мас-медыя да гэтага форуму, але галоўнае, што наша нацыянальная драматургія патрапіла ў цэнтр увагі журналістаў, крытыкаў, шырокай тэатральнай грамадскасці," — адзначыла Ірына Дрыга.

Рэальным вынікам актыўнай дзейнасці айчынных калектываў стала тое, што адразу тры тэатры былі адзначаны спецыяльнымі прэміямі Кіраўніка дзяржавы дзеячам культуры і мастацтва: Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета, Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага і Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр. Яшчэ адной значнай падзеяй сталася адкрыццё пасля пяцігадовага капітальнага рамонту будынка Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача. А ўвосень слынны калектыў будзе адзначаць 60-гадовы юбілей, да якога падрыхтавана нямала цікавых імпрэз.

Па словах прамоўцы, галоўнай падзеяй тэатральнага жыцця ў гэтым годзе стане абноўленая Нацыянальная тэатральная прэмія. Як вядома, было вырашана праводзіць яе адзін раз на два гады, каб тэатры мелі магчымасць вылучыць на конкурс больш прэм'ер. Палажэнне ўжо дапрацавана і хутка з'явіцца ў афіцыйных крыніцах. З 1 красавіка пачнецца прыём заявак ад калектываў, які завершыцца 1 мая, а пасля 1 чэрвеня павінен з'явіцца шорт-ліст намінантаў на прэстыжную ўзнагароду. На лістапад — пачатак снежня запланаваны прагляды лепшых пастановак у рамках Нацыянальнага тэатральнага тыдня. Прафесійнае журы павінна вызначыцца са сваім выбарам напрыканцы каляндарнага года.

Было вырашана захаваць у межах прэміі падзел на секцыі: заяўкі прымаюць у напрамках "драматычны тэатр", "музычны тэатр", "тэатр лялек", "тэатр для дзяцей і юнацтва". У апошнім выпадку свае працы, разлічаныя на юную аўдыторыю, змогуць прадставіць любыя тэатры. Улічваючы магчымую разнастайнасць форм і жанраў, у гэтай секцыі мяркуецца сабраць сінтэтычнае журы.

Змяненні закрануць і намінацыі. Так, было вырашана адмовіцца ад намінацыі "Лепшая рэжысёрская праца". Пры гэтым Ірына Дрыга падкрэсліла, што прыз у кожнай з секцый за лепшы спектакль застанецца. А вось колішнюю намінацыю "Лепшая роля" вырашылі ўзбуйніць: асобна вызначаць лепшую жаночую і мужчынскую ролі. "Без купюр" застаюцца ганаровыя прэміі за мецэнацкую дзейнасць і ўклад у тэатральнае мастацтва.

У Міжнародны дзень тэатра адбудуцца ўрачыстасці ў Купалаўскім тэатры. На сцэне лепшыя дзеячы тэатра па выніках мінулага года будуць узнагароджаны ад імя Міністэрства культуры. "Для нас прыемна, што сярод узнагароджаных акажуцца прадстаўнікі не толькі сталічных, але і рэгіянальных тэатраў", — падкрэсліла Ірына Дрыга.

Злучыць два берагі

На новую прыступку выйшла амаль дзесяцігадовае супрацоўніцтва Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі з Міжнародным грамадскім аб'яднаннем "Тэатро" і французскай тэатральнай асацыяцыяй "Demain le Printemps" ("Заўтра вясна"). Сёлета партнёры распачынаюць праект "Тэатральная арка".

На слыху адукацыйныя праекты "Demain le Printemps". Як кажа мастацкі кіраўнік апошняй Фабрыс Карэй, за часы дзейнасці на майстар-класах у Беларусі пабывала 890 удзельнікаў. Да выбітных беларускіх педагогаў едуць з замежжа як прафесійныя акцёры, так і студэнты, якія хочуць адкрыць для сябе класічную тэатральную школу, заснаваную на спадчыне Станіслаўскага, Неміровіча-Данчанкі, Мейерхольда… У Мінск на дзевяцімесячныя праграмы, а таксама на экспрэс-стажыроўкі прыязджалі амаль з двух дзясяткаў краін. "Мы змаглі пасеяць у іх сэрцах зярняткі любові да Беларусі, — падкрэслівае спадар Фабрыс. — Летась я наведаў знакаміты тэатральны фестываль у Авіньёне, дзе на працягу месяца паказваюць каля 1200 спектакляў з мэтай "прадаць" іх на бліжэйшы сезон добраму імпрэсарыа. Было вельмі прыемна сустрэць там шмат нашых выпускнікоў! Многія са стажораў выраслі ў акцёраў, рэжысёраў, менеджараў, некаторыя заснавалі свае тэатры ці пачалі ладзіць адукацыйныя праграмы".

Лагічным развіццём супрацоўніцтва стала франка-беларуская шматгадовая праграма супрацоўніцтва "Тэатральная арка". Яна прадугледжвае "навядзенне мастоў" у гастрольнай дзейнасці. Прынамсі, на згаданым авіньёнскім фестывалі дырэктар РТБД Уладзімір Карачэўскі заключыў дамову з тамтэйшым камерным тэатрам. П'есу ў выкананні трох французскіх акцёраў мінчане пабачаць у снежні падчас традыцыйнага ўжо "Каляднага рандэву".

У сваю чаргу, распрацоўваецца сапраўднае турнэ РТБД па гарадах Францыі. "Часцей за ўсё беларускія тэатры выязджаюць за мяжу з разавымі паказамі. Мы ж прапанавалі спектакль "Тры Жызелі" Аляксандра Гарцуева сур'ёзным імпрэсарыа. Тамтэйшыя спецыялісты зацікавіліся нашай пастаноўкай і зараз шукаюць магчымасці выйсці на значныя тэатральныя пляцоўкі Францыі. Зараз ствараецца сінхронны пераклад, рыхтуюцца праграмкі, рэкламныя буклеты. Некаторыя рэчы даводзіцца перарабляць, бо зразумелае нам не ўспрымаецца французамі з-за розніцы ў менталітэтах", — распавёў спадар Карачэўскі.

Новым фарматам стаў праект "Teatro club", які намеснік старшыні "Тэатро" па камунікацыях Ірына Русанава назвала ўнікальным у тэатральнай прасторы. У гэты клуб уваходзяць як беларусы, якія любяць радзіму Эйфелевай вежы, імкнуцца вывучыць яе мову, так і французскія дыпламаты і бізнесмены, што жывуць і працуюць у Беларусі. Штомесяц гэтую суполку запрашаюць на спектаклі РТБД, якія, па меркаванні прадстаўнікоў тэатра, найбольш яскрава раскрываюць спецыфіку абедзвюх культур. Пасля паказу ўжо ў нефармальнай абстаноўцы члены клуба могуць пагутарыць з акцёрамі, рэжысёрамі ды іншымі творцамі, заглыбіцца ў гісторыю і культуру абедзвюх краін, знайсці сяброў сярод франкафонаў і франкафілаў.

"Тэатральная арка" адкрывае бясплатныя інтэрактыўныя майстар-класы для ўсіх ахвотных. Удзельнікам "Teatro box" прапануюць бліжэй пазнаёміцца з асновамі акцёрскага майстэрства, засвоіць тэмпарытм, асновы біямеханікі і іншыя акцёрскія тэхнікі, каб пазнаць сцэнічнае мастацтва знутры. Майстар-класы ладзяцца на пляцоўцы Цэнтра беларускай драматургіі. Іх будуць весці выбітныя дзеячы мастацтваў Беларусі і Францыі.

Прэміі сцэнографам

24 сакавіка адбыліся ўрачыстасці з нагоды ўручэння сёлетняй прэміі імя заслужанага дзеяча мастацтваў краіны Івана Ушакова.

Лідарам 16-га па ліку конкурсу, заснаванага па ініцыятыве Зоі Ушаковай, удавы мастака-сцэнографа, сумесна з Музеем гісторыі тэатральнай і музычнай культуры і грамадскім аб'яднаннем "Беларускі фонд культуры", стала Марына Шуста за сцэнаграфію да спектакля "Як я стаў…" Новага драматычнага тэатра. Ганаровай граматай Беларускага фонду культуры была ўзнагароджана Юлія Карымава за афармленне пастаноўкі "Каралева прыгажосці з Лінэна" ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа.

Журналіст Вольга Савіцкая атрымала дыплом UNESCO за дзейнасць па прапагандзе беларускага тэатральнага мастацтва ў СМІ.

К

Матэрыялы паласы падрыхтавалі Надзея БУНЦЭВІЧ і Настасся ПАНКРАТАВА

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Галіна МАХНАЧ.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 5 001. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 25.03.2016 у 17.00. Замова 1110. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

2016 ГОД КУЛЬТУРЫ

Ініцыятыва — бадай самае каштоўнае, што ёсць у развіцці творчасці і культуры. І важна, што ў Год культуры гэтая ініцыятыва праяўляецца з падвоенай энергіяй. А хэштэг #2016годкультуры стаў назвай новай рубрыкі "К" і пазнакай для такіх матэрыялаў на сеціўных рэсурсах газеты.

Крок у Парыж

Прадстаўнікі Пасольства Беларусі ў Францыі, якое стала ініцыятарам і арганізатарам I Беларускіх тэатральных сезонаў у Францыі, зазначылі, што замежная публіка са шчырай цікавасцю сустрэла лірычную камедыю "Лёгкага жыцця ніхто не абяцаў" Тэатра-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм". Пра свае ўражанні, выкліканыя замежнай паездкай, журналісту "К" распавёў рэжысёр-пастаноўшчык спектакля, мастацкі кіраўнік тэатра, народны артыст Беларусі Аляксандр ЯФРЭМАЎ.

Занатавала Настасся ПАНКРАТАВА

Павел Латушка і калектыў тэатра ў Пасольстве.

— Выдатна, што Паслу Беларусі ў Францыі Паўлу Латушку ўдалося дамовіцца з адным са знакамітых парыжскіх тэатраў. Мы выступалі літаральна ў цэнтры французскай сталіцы: тэатр "Ад'яр", пабудаваны ў 1914 годзе, знаходзіцца метраў за трыста ад Эйфелевай вежы. У старадаўнім будынку аказалася дзівосная зала на 360 месцаў, а сцэна — якраз пад нашу дэкарацыю.

Хваляваліся, перажывалі, ці збяруцца людзі, як прымуць, ці прыйдзе аўтар, які планаваў прысутнічаць на ўрачыстым адкрыцці "Беларускіх сезонаў". На маё шчырае здзіўленне і да захаплення акцёраў, зала была перапоўненая. Да нас прыйшлі дыпламаты, прадстаўнікі рускамоўных краін, было вельмі шмат французаў. Спектакль ішоў з сінхронным перакладам. Праўда, часам адбываліся забаўныя недарэчнасці: справа ў тым, што для сінхрона быў задзейнічаны вялікі экран, на які выводзілася шмат інфармацыі, дык вось французы, бывала, смяяліся раней за рускамоўных гледачоў, бо бачылі тую рэпліку на экране раней, чым яна прамаўлялася са сцэны. Спектакль, хоць і нясціпла з майго боку так казаць, прымалі вельмі добра: разумелі, рэагавалі ў патрэбных месцах, задумваліся там, дзе патрэбна. Я ўзяў гэту п'есу да пастаноўкі таму, што яна распавядае не дакладна пра французаў, а ў цэлым пра людзей. Пра тое, што прыходзіць дастаткова сталы узрост, калі чалавек становіцца мякка кажучы, вельмі-вельмі дарослым, жыццё змяняецца, а кахаць хочацца. Гэта п'еса пра каханне, пра яго магчымасці, пра памкненні да яго і пра праблемы, што прыносіць асобе гэта самае каханне.

Зрэшты, на роднай сцэне лірычная камедыя "Лёгкага жыцця ніхто не абяцаў" ідзе вельмі паспяхова. У сярэднім яна мае 96 % напаўняльнасці залы, хоць і значыцца ў рэпертуары не першы год. Мне было прыемна, што спектакль успрымаецца французскай публікай гэтак жа, як і нашай. Я зразумеў тое, што асабіста для мяне было надзвычай важным: мы размаўляем з гледачом на адной мове, на мове драматычнага тэатра, якая зразумела не толькі ў нашым арэале.

Сцэна са спектакля "Лёгкага жыцця ніхто не абяцаў".

Зазначу, што названая п'еса добра вядомая тамтэйшай аўдыторыі: яна вельмі доўга ішла ў французскіх тэатрах. Яе аўтар Жан-Клод Ізлер на слыху ў тамтэйшай публікі: ён з асяродку сучасных аўтараў, якія шмат працуюць для тэлебачання і тэатра. Драматург сапраўды прысутнічаў у зале, мы з ім гутарылі, крыху высветлілі бачанне магчымасцей рэжысуры ў дачыненні да драматургіі. Спадар Жан-Клод быў крыху напружаны з той прычыны, што я злёгку змяніў фінал яго твора. Але тое мне здавалася цалкам мэтазгодным і дапушчальным. Вялікі камплімент французскаму аўтару за тое, што па тыпажы яго галоўны персанаж падобны да ганчароўскага Абломава, нагадвае ў нечым рэфлексуючых інтэлігентаў Чэхава і гэтак далей. Прачытаўшы гэтак цэнтральны характар і пабудаваўшы разам з акцёрам Аляксандрам Цімошкіным (выканаўцам галоўнай ролі) такім чынам вобраз, мне падалося, што я магу змяніць фінал. Арыгінальны быў дастаткова гуллівы, з намёкам на аднаполае каханне, чаго мне не хацелася рабіць. Я ж лічу, да самой п'есы тая тэма мела вельмі апасродкаванае дачыненне. Мы з аўтарам сышліся на тым, што ён з задавальненнем дашле мне сваю наступную п'есу. Ці буду я яе ставіць? Гэта ўжо пытанні мастацкага кшталту. Галоўнае, што бакі разышліся мірна і з узаемнай сімпатыяй.

Мне падаецца, заснаванне беларускіх сезонаў — гэта вельмі дарэчы і вельмі правільна. Традыцыі беларускага тэатра шматвяковыя і надзвычай сур'ёзныя. Прынамсі, у XVII — XVIII стагоддзях у нашым краі спектаклі граліся на сямі — васьмі мовах. Тут была высока развітая культура сцэнічнага мастацтва, існавалі паркавы, вулічны тэатры, тэатры ля рова, ля возера… Чаго каштуе хаця б тэатр, які дзейнічаў у Зорыча ў Шклове, дзе танцавалі сёстры Азарачавы. Вось тэма, якая так і просіцца ў кіно!

Зразумела, тое, што мы выехалі ў Парыж, не стане прарывам у біяграфіі тэатра і наўрад ці зменіць уяўленне еўрапейскай публікі пра Беларусь. Але гэта той неабходны рух, які абавязана рабіць мастацтва, каб адна культура пранікала ў іншую, каб знаходзілася як мага больш кантактаў да ўзаемаразумення людзей, народаў — ужо прабачце мяне за гучныя словы. Не трэба замыкацца, ствараць "нашу беларускую культуру". Сэнс у тым, што зараз беларусы імкнуцца рабіць крокі, каб увайсці ў сусветны культурны працэс. Можа, наша паездка і не самы вялікі з іх, але ён дастаткова дастойны і слушны, з майго пункту гледжання. І тое, што ў Парыж яшчэ паедуць айчынныя тэатры, што яны будуць прадстаўляць наша мастацтва і нашу краіну — сапраўднае дасягненне.

К

Шматгалоссе краіны

Пераможцы агляду-конкурсу "Спяваем разам".

У Рэспубліканскім палацы культуры прафсаюзаў 22 сакавіка прайшоў гала-канцэрт пераможцаў і прызёраў агляду-конкурсу харавой творчасці "Спяваем разам". Лепшыя 14 калектываў — пераможцы абласных і мінскага гарадскога этапаў — прыехалі ў сталіцу, каб прадэманстраваць майстэрства членам журы.

Вольга РОПАТ

Адзін знакаміты хормайстар неяк сказаў: хор — гэта правобраз ідэальнага грамадства, у якім кожны праяўляе свае здольнасці, а людзі ўмеюць чуць адзін аднаго. Супадпарадкаванымі, з "узаемазвязанымі" характарамі, эмоцыямі, настроямі і, вядома, галасамі, падаліся і ўдзельнікі канцэрта як у акапэльным выкананні, так і ў нумарах з акампанементам. Усяго ж у сёлетнім творчым спаборніцтве паўдзельнічала 90 калектываў устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Агляд-конкурс праводзіўся па дзвюх узроставых катэгорыях: дзеці ад 6 да 13 гадоў і падлеткі ад 13 да 18. Асноўнымі крытэрыямі адбору сталі ансамбль, інтанацыя, строй, інтэрпрэтацыя. Дырэктар Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Надзея Васільчанка падкрэсліла: "У старшай узроставай групе спачатку прадугледжвалася па адным першым, другім і трэцім месцы. У выніку ўзнагароды будзем уручаць па двух другіх і двух трэціх месцах, што сведчыць пра высокі ўзровень харавых калектываў. Барацьба паміж імі — напружаная: хары-лаўрэаты аддзяляе адзін ад аднаго невялікая колькасць балаў".

Першае месца ў рэспубліканскім конкурсе "Спяваем разам" атрымалі мінскія ўзорныя хары "Вішанька" (СШ № 115) і "Фэст" (СШ № 201). Спецыяльныя прызы ад журы ўручыла дацэнт кафедры харавога дырыжыравання Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Тамара Слабодчыкава, якая адзначыла высокую якасць выканання песень калектывамі. А мяне ж асабліва ўразіў наваполацкі абразцовы хор "Звонкія галасы", які заняў трэцяе месца. Мяккае, плаўнае выкананне кампазіцыі "Зорная рака" нагадала пейзажную замалёўку: тонкія галасы, якія "перацякаюць" з аднаго ў іншы, прыемная мелодыя — аж да дрыготкі па целе!..

К

Месяц пад камерную

У 29-ы раз Полацк становіцца лакацыяй Міжнароднага фестывалю старажытнай і сучаснай камернай музыкі, што праходзіць з 24 сакавіка па 27 красавіка.

Аліна САЎЧАНКА

Традыцыйна Полацкі фестываль пройдзе ў некалькі этапаў. Гэтым разам для слухачоў падрыхтаваны сем канцэртаў у Камернай зале Сафійскага сабора. Сваё майстэрства прадэманструюць прызнаныя публікай калектывы і салісты з Расіі, Літвы, Эстоніі, Польшчы, Аўстрыі, Кітая.

У чацвер прафесар Санкт-Пецярбургскай дзяржаўнай кансерваторыі, заслужаная артыстка Расіі Ніна Сярогіна і лаўрэат міжнародных конкурсаў, літоўскі піяніст Юргіс Алекнавічус выканалі музыку Бетховена, Пракоф'ева, Скрабіна і Дэбюсі.

Арганная і вакальная музыка XVIII — XX стагоддзя прагучыць 3 красавіка ў выкананні вядомага аўстрыйскага арганіста, прафесара Іагана Трумера і салісткі Беларускай дзяржаўнай філармоніі Тамары Рэмез.

Ніна Сярогіна і Юргіс Алекнавічус.

Гістарычную дакладнасць і музычны прафесіяналізм мусіць дэманстраваць польскі барочны ансамбль "Capella Cracoviensis" праз творы Гайдна, Моцарта, Карловіча, Багдановіча 7 красавіка. У гэты ж дзень адбудзецца ўрачыстае адкрыццё XXIX Міжнароднага фестывалю старажытнай і сучаснай камернай музыкі ў Полацку.

10 красавіка адбудзецца канцэрт харавой музыкі "Спяваюць хлапчукі", арганізаваны сумесна з Беларускім саюзам музычных дзеячаў. Хор хлопчыкаў і юнакоў Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Акадэміі музыкі, хары Мінскага дзяржаўнага палаца моладзі, сталічнай сярэдняй школы № 159, Дзіцячай музычнай школы № 8 імя Рыгора Шырмы — усяго каля сотні маладых выканаўцаў выйдуць на полацкую сцэну.

Наступная імпрэза арганізавана камерным аркестрам "Еўропа-Цэнтр" і салісткай канцэртнай залы Сафійскага сабора Ксеніяй Пагарэлай. 16 красавіка Полацк пачуе старажытную музыку для клавесіна і камернага аркестра. Вечар рускага раманса пройдзе 21 красавіка: у ім паўдзельнічаюць салістка Беларускага акадэмічнага музычнага тэатра Ганна Бяляева (сапрана) і піяністка Юлія Перэу.

Завяршэнне фестывалю будзе прысвечана музыцы Моцарта і прымеркавана да 260-годдзя з дня яго нараджэння. 27 красавіка Сімфанічны аркестр Белтэлерадыёкампаніі пад кіраўніцтвам эстонскага дырыжора Эркі Пекха і салісты, беларускі піяніст Арсеній Садыкоў і кітайскі тэнар Ван Хантао, прадэманструюць разнажанравую творчасць вялікага Моцарта.

Па словах загадчыка канцэртнага аддзела Сафійскага сабора Алены Мартынавай, кожны з 29-ці фестываляў старажытнай і сучаснай камернай музыкі ў Полацку адрозніваецца ад папярэдняга. Арганізатары заўсёды імкнуцца прывезці ў горад на Дзвіне новыя імёны, а таксама аўтарытэтаў з сусветнай музычнай прасторы. Для таго, каб зрабіць вялікае мастацтва больш даступным, было вырашана пакінуць на білеты леташнія цэны — 120 тысяч рублёў. А для тых, хто жадае наведаць усе сем вечароў, існуе цудоўная акцыя з 50-працэнтнай зніжкай на поўны білетны камплект.

К

Музейны тыдзень у Твітары

За тыдзень падпісчыкі музейных твітар-акаўнтаў змогуць "пабываць" у розных музеях свету ў рамках акцыі #MuseumWeek з 28 сакавіка да 3 красавіка.

Вольга РОПАТ

Кожны дзень — новая тэма. Напрыклад, у панядзелак, #secretsMW, музеі раскажуць пра сваё "закуліссе". Ва аўторак, #peopleMW, можна будзе даведацца пра тыя знакавыя фігуры, якія прымалі ўдзел у стварэнні ўстаноў, а таксама пра цяперашніх супрацоўнікаў. Трэці дзень, #architectureMW, прысвечаны гісторыі будынкаў. Пра ўнікальныя экспанаты і калекцыі можна будзе даведацца ў чацвер — #heritageMW. У пятніцу, #futureMW, — першы дзень красавіка — падпісчыкі Твітара пазнаёмяцца з планамі інавацыйных праектаў музеяў. У суботу, #zoomMW, музеі будуць надаваць увагу дэталям архітэктуры і музейным прадметам, а ў нядзелю, #loveMW, работнікі распавядуць пра творы мастацтва, экспазіцыі.

Адным з першых беларускіх музеяў далучыўся да акцыі замкавы комплекс "Мір". Па словах вучонага сакратара Ігара Ложачніка, у першы дзень музейнага тыдня падпісчыкам распавядуць пра работу касіра. А яшчэ — пра падземны ўзровень, дзе засяроджана ўсё інжынернае абсталяванне комплексу. У сераду, магчыма, — пра майстроў XVI стагоддзя і некаторыя архітэктурныя стылі.

Калі нумар рыхтаваўся да друку, было вядома, што да акцыі #MuseumWeek далучыліся Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь і некаторыя яго філіялы, Музей-сядзіба "Пружанскі палацык", Мемарыяльны музей-майстэрня Заіра Азгура.

К

"Лічбавы" падыход

Ці рэальнае "народнае" фінансаванне?

Нездарма кажуць: як няма грошай — не бяда, як сяброў грамада. Прыказка гэтая актуальная сёння як ніколі, асабліва з улікам таго, што Сусветнае павуцінне дазваляе сабраць вакол свайго праекта ці ідэі ў вельмі сціслы тэрмін даволі багата людзей. Некаторыя з работнікаў культуры Беларусі ўжо ўлічваюць названую акалічнасць і актыўна выкарыстоўваюць інтэрнэт-рэсурсы для прасоўвання ды піяр-кампаніі сваіх праектаў, каб зарабіць такім чынам грошы на іх рэалізацыю.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Скажам, на сайце maesens.by сёння некаторыя з іх збіраюць грошы і на выданне свайго песеннага дыска, і на правядзенне пленэру разьбяроў у вёсцы Стойлы на Пружаншчыне, дзе жыў стваральнік "драўлянага народу" народны майстар Мікола Тарасюк. На іншым — talaka.by — адзін знаёмец шукае фінансы на выпуск кнігі Клайва Льюіса "Хронікі Нарніі" ў перакладзе на беларускую мову, а іншы арганізоўвае збор артэфактаў беларускай прамысловай і рамесніцкай вытворчасці, каб прэзентаваць іх пасля ў форме кнігі і віртуальнага музея…

Да слова, з 2013 года на апошнім з названых сайтаў рэалізаваны 43 праекты! А толькі за апошнія восем месяцаў 15 ініцыятыў атрымалі фінансаванне амаль ад тысячы чалавек на суму 378 мільёнаў рублёў.

Яшчэ адна падобная платформа, што месціцца па адрасе ulej.by, запрацавала ў Беларусі ў жніўні мінулага года. За яе аснову была ўзятая паспяховая міжнародная пляцоўка Kickstarter, а сам праект падтрымаў адзін з вядомых беларускіх банкаў — сталы спонсар шэрагу культурных імпрэз. На названым сайце сёння ладзіцца збор грошай і на здымкі кліпа, і на роспіс сцен Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, і на набыццё аўдыя- і відэатэхнікі для правядзення тэатральнага фестывалю… Шэраг прадстаўленых на партале праектаў таксама ўжо сталіся паспяховымі. Так, неабыякавымі людзьмі сабраны 38 мільёнаў рублёў на стварэнне ў адным з раённых гарадоў Беларусі міні-кінатэатра, 23 мільёны — на выданне дыска аднаго з беларускіх гуртоў, 25 мільёнаў на стварэнне арт-пляцоўкі і зоны вольнага адпачынку ў адным з мікрараёнаў Мінска…

Напрыканцы прывяду яшчэ адну лічбу: у 2015 годзе тры названыя беларускія інтэрнэт-пляцоўкі сабралі на свае праекты больш за тры мільярды рублёў! Падаецца, даволі значная лічба, каб зацікавіць тых неабыякавых культработнікаў Беларусі, якія мараць пабачыць рэалізаванымі свае крэатыўныя ідэі і задумкі.

А схема працы падобных платформ, пабудаваных на аснове краўдфандынгу, амаль усюды падобная: аўтар ідэі падае сваю заяўку на, так бы мовіць, "народнае" фінансаванне. У заяўцы ўказваецца сума, патрэбная для рэалізацыі задуманага, а таксама тэрмін, за які гэтыя грошы трэба сабраць. Тыя наведвальнікі сайта, хто ўпадабае тую ці іншую ідэю, можа яе падтрымаць, сплаціўшы пэўную суму праз банк, ды атрымаць нейкія прызы ці бонусы, якія будуць прадугледжаны аўтарам ініцыятывы ў залежнасці ад памеру грашовага пераводу. Калі неабходная сума набіраецца — праект рэалізуецца, а калі не — грошы вяртаюцца ахвярадаўцам.

Чаму я пра гэта распавядаю так падрабязна? Таму што яшчэ ў далёкім 2008 годзе сам, без усякіх "платформаў" і "сайтаў-памочнікаў" збіраў падобным чынам невялікую, па сутнасці, суму на выданне сваёй кнігі, прысвечанай дыялектным гаворкам жыхароў Брэсцкай вобласці. З дапамогай сябра, які працаваў на адным з беларускіх парталаў, змясціў там інфармацыю пра будучую кнігу, апублікаваў шэраг карт і тэкстаў — і справа, ці, дакладней, грошы пайшлі…

Натуральна, усе спонсары выдання, іх прозвішчы і імёны былі пасля ўзгаданы мной удзячным словам у прадмове да кнігі, якая ўжо ў наступным, 2009-м, пабачыла свет… Так што не на словах, а на справе я пераканаўся ў тым, наколькі можа быць паспяховым і эфектыўным гэтае "народнае" фінансаванне.

І калі атрымалася ў мяне, дык чаму не можа быць падобнага поспеху ў музейшчыкаў, бібліятэкараў, клубнікаў Беларусі? Вандруючы па рэгіёнах краіны, я не раз пераконваўся ў тым, што ў нашай краіне крэатыўных і зацікаўленых у сваёй дзейнасці людзей хапае. А не стае ім часам толькі аднаго — грошай. Прычым часцяком жаданая імі сума асігнаванняў вымяраецца не дзясяткам мільёнаў рублёў, а ў разы меншымі лічбамі. Таму асабліва крыўдна, калі той ці іншы цікавы праект культурнай тэматыкі пасля "гібее" ды пакрываецца пылам у нейкіх папках верхняй шуфляды працоўнага стала…

Сёння хаваць свае праекты няма патрэбы: падобныя сайты, пабудаваныя на аснове краўдфандынгу, і створаны дзеля таго, каб адметныя задумкі паспяхова "нараджаліся" і ажыццяўляліся. Бо чым больш будзе такіх малых праектаў, тым больш цікавым будзе жыццё.

Як кажа тая ж народная мудрасць, "усе вялікія справы пачынаюцца з малых учынкаў"… І я з гэтым выслоўем абсалютна згодны. Тым больш у згаданым кантэксце!

Акцэнты і мэты пяці гадоў

Гартаючы Дзяржпраграму "Культура Беларусі" на 2016 — 2020 гады



(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Адна з праблем — адсутнасць паўнавартаснай экспазіцыі Нацыянальнага гістарычнага музея, якая заклікана адлюстроўваць беларускую нацыянальную ідэю. Наспела неабходнасць будаўніцтва адзінага дэпазітарыя для захоўвання музейных фондавых калекцый.

На сёння маецца каля 7,7 тысячы публічных і спецыяльных бібліятэк з агульным фондам каля 180 мільёнаў экзэмпляраў. Міністэрству культуры падпарадкоўваецца каля 37 % бібліятэк краіны. З-за сацыяльна-дэмаграфічных працэсаў назіраецца скарачэнне сеткі сельскіх бібліятэк. Разам з тым бібліятэчныя паслугі — па-ранейшаму запатрабаваныя.

Невысокім застаецца ўзровень інфарматызацыі. Перспектыўным праектам з'яўляецца стварэнне Нацыянальнай электроннай бібліятэкі, карпаратыўнай службы электроннай дастаўкі дакументаў на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама — выкарыстанне воблачных тэхналогій.

Рэалізавана Дзяржпраграма адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі "Слуцкія паясы".

Нявырашаныя праблемы: неналежны тэхнічны стан значнай колькасці аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, адсутнасць распрацаваных і зацверджаных праектаў зон аховы, несанкцыянаваныя раскопкі на аб'ектах археалагічнай спадчыны і яе прысутнасць у сусветнай інфармацыйнай прасторы, недастатковая інфарматызацыя сферы гісторыка-культурнай спадчыны, дэфіцыт рэстаўратараў, недастатковая колькасць аб'ектаў у міжнародных ахоўных спісах, няроўны доступ да музейных і бібліятэчных фондаў жыхароў паселішчаў без стацыянарных устаноў культуры, недахоп фінансавання работ па ахове і рэстаўрацыі аб'ектаў спадчыны.

Мэтавыя паказчыкі

Трэба ўключыць не менш 86 праяў нематэрыяльнай творчасці чалавека да 2020 года ў Дзяржспіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Колькасць дасье на аб'екты спадчыны, падрыхтаваных і прадстаўленых у Цэнтр Сусветнай спадчыны — не менш пяці да 2020 года. Колькасць наведванняў публічных бібліятэк, у тым ліку аддаленымі карыстальнікамі — павелічэнне на 20 % да 2020 года ў параўнанні з леташнім паказчыкам. Прыросты аб'ёму Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь і колькасці музейных наведванняў — у абодвух выпадках павелічэнне за пяцігоддзе на 5 % у параўнанні з леташнім. Колькасць фестываляў, святаў народных мастацкіх промыслаў — не менш за 8 у год. Колькасць мерапрыемстваў з удзелам творчых калектываў нацыянальна-культурных аб'яднанняў — не менш за 50 у год.

Фінансаванне падпраграмы

Аб'ём фінансавання — 9 367 617 140,6 тысячы рублёў, у тым ліку: з рэспубліканскага бюджэту — 1 999 236 193,7 тысячы, з мясцовых бюджэтаў — 6 427 534 379 тысяч, за кошт уласных сродкаў арганізацый — 940 846 567,9 тысячы рублёў.

"Мастацтва і творчасць"

У Беларусі — 28 дзяржаўных тэатраў, з іх 27 — сістэмы Міністэрства культуры (два музычных, 18 драматычных, сем лялечных), адзін — сістэмы Міністэрства абароны. Статус "нацыянальны" маюць чатыры тэатры, званнем "Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь" уганараваны дзесяць тэатраў. Канцэртнай дзейнасцю займаецца 21 дзяржаўная арганізацыя рэспубліканскага і мясцовага падпарадкавання. Ёсць 2,9 тысячы клубных устаноў. Штогод адбываецца 8500 спектакляў, 6000 канцэртаў, больш за 580 тысяч клубных мерапрыемстваў. Кожны год ладзіцца каля 60 міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных фестываляў.

Сярод праблем застаюцца недастатковая канкурэнтаздольнасць і запатрабаванасць нацыянальнага культурнага прадукта, неэфектыўнае выкарыстанне эканамічных механізмаў у дзейнасці тэатральна-відовішчных арганізацый, нездавальняючая прадстаўленасць беларускага кінамастацтва, нізкая акупляльнасць фільмаў у неігравой і анімацыйнай формах, адсутнасць адзіных падыходаў да правядзення конкурсаў эскізных праектаў пры стварэнні манументальных і манументальна-дэкаратыўных твораў, недастатковы ўзровень выканальніцкага майстэрства асобных эстрадных калектываў і выканаўцаў, неўкамплектаванасць кадрамі тэатральна-відовішчных і кінематаграфічных арганізацый.

Мэтавыя паказчыкі

Колькасць праведзеных тэатральна-відовішчнымі арганізацыямі фестываляў, форумаў, свят і іншых культурных мерапрыемстваў — не менш за 14,5 тысячы ў год. Колькасць клубных культурных мерапрыемстваў — не менш за 500 тысяч у год. Прырост колькасці самадзейных калектываў мастацкай творчасці са званнямі "народны" і "ўзорны" — за пяцігоддзе на 150 больш ад леташняга ўзроўню. Прырост аб'ёму даходаў ад кінапаказу і іншых паслуг кінапракатных і кінавідовішчных арганізацый — на 50 % да 2020 года ад леташняга ўзроўню.

Фінансаванне падпраграмы

Аб'ём фінансавання — 19 410 244 312,6 тысячы рублёў, у тым ліку: з рэспубліканскага бюджэту — 2 663 089 893,9 тысячы, з мясцовых бюджэтаў — 12 517 027 600 тысяч, за кошт уласных сродкаў арганізацый — 4 230 126 818,7 тысячы рублёў.

"Архівы Беларусі"

У 32 дзяржаўных архіўных установах, 1123 тэрытарыяльных (раённых і гарадскіх) архівах мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў краіны ўтрымліваецца 14 099 306 адзінак захоўвання (абраных з 1931 года і да нашых дзён), у тым ліку дакументы дзяржорганаў, арганізацый, палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, грамадзян. Для фарміравання Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь паўнавартаснымі па змесце і аптымальнымі па складзе дакументамі ў дзяржаўныя архіўныя ўстановы прымаецца на пастаяннае архіўнае захоўванне больш за 80 тысяч адзінак захоўвання. Крыніцы камплектавання — каля васьмі тысяч дзяржорганаў і іншых арганізацый. Эфектыўнае фарміраванне Нацыянальнага архіўнага фонду магчыма толькі пры пашырэнні плошчаў архівасховішчаў, забеспячэнні эксплуатацыйнай надзейнасці будынкаў і памяшканняў, удасканаленні матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Мэтавыя паказчыкі

Колькасць унікальных і асабліва каштоўных архіўных дакументаў, якія маюць страхавыя копіі — не менш за 600 адзінак захоўвання ў год. Колькасць дакументаў, якія маюць лічбавыя копіі — не менш за 3600 адзінак у год. Колькасць выдадзеных зборнікаў дакументаў і архіўных даведнікаў пра склад і змест дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонду — не менш за пяць у год.

Фінансаванне падпраграмы

Аб'ём фінансавання — 1 033 248 351 тысяча рублёў, у тым ліку: з рэспубліканскага бюджэту — 328 484 520 тысяч, з мясцовых бюджэтаў — 662 389 509 тысяч, за кошт уласных сродкаў арганізацый — 42 374 322 тысячы рублёў.

"Беларусы ў свеце"

Колькасны склад беларускай дыяспары ў свеце складае каля 2,5 мільёна чалавек. Грамадскія аб'яднанні беларусаў актыўна ажыццяўляюць сацыякультурную дзейнасць у Расіі, ва Украіне, у Латвіі, Літве, Эстоніі, Польшчы, Малдове. Беларуская дыяспара прысутнічае ў Аўстраліі, Аўстрыі, Аргенціне, Вялікабрытаніі, Германіі, Канадзе, Нідэрландах, ЗША…

Асноўны механізм узаемадзеяння з беларусамі замежжа быў замацаваны ў Дзяржпраграме супрацоўніцтва з беларусамі замежжа "Беларусы ў свеце" на 2013 — 2015 гады.

Але існуе неабходнасць больш сістэмнага падыходу да вырашэння пытанняў развіцця супрацоўніцтва з беларускай дыяспарай.

Мэтавыя паказчыкі

Колькасць культурных мерапрыемстваў у Беларусі з удзелам замежных калектываў мастацкай творчасці і дэлегацый нацыянальна-культурных аб'яднанняў беларусаў замежжа — не менш за 20 у год. Колькасць мерапрыемстваў з удзелам беларускіх прафесійных і самадзейных калектываў мастацкай творчасці, якія ладзяцца беларусамі замежжа — не менш за 20 у год. Колькасць бізнес-форумаў у Беларусі з удзелам беларусаў замежжа з ліку прадпрымальнікаў — не менш за пяць у год.

Фінансаванне падпраграмы

Аб'ём фінансавання — 30 845 756,3 тысячы рублёў, у тым ліку: з рэспубліканскага бюджэту — 30 451 556,3 тысячы, з мясцовых бюджэтаў — 394 200 тысяч рублёў.

Аб'ём фінансавання падлягае ўдакладненню зыходзячы з макраэканамічных параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь і магчымасцей рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.

Праграму гартаў
Яўген РАГІН

Навучымся rubato?

Вадзім ЯКАНЮК,
доктар педагагічных навук, прафесар, галоўны рэдактар часопіса "Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі"

Уступленне Беларусі ў Балонскі працэс прыўносіць шмат новага для асэнсавання развіцця вышэйшай музычнай школы ў нашай краіне. На гэты конт нярэдка выказваецца нямала скептыцызму.

Але, мяркую, улік рэкамендацый Балонскай дэкларацыі і іншых дакументаў гэтай дыскусійнай платформы дазволіць надаць новы імпульс развіццю нацыянальнай сістэмы музычнай адукацыі, не страчваючы самабытнасці яе першаасноў.

Найперш маю на ўвазе змест адукацыйных стандартаў, вучэбных планаў і праграм. Трэба пазбавіцца ад "залішніх" вучэбных прадметаў, якія не маюць дачынення да прафесійнай падрыхтоўкі музыкантаў. Пры цяперашняй сітуацыі, калі студэнт будзе імкнуцца максімальна поўна выканаць патрабаванні вучэбнага плана, ён будзе вымушаны выбіраць: граць на раялі — ці рыхтавацца да заліку па "Асновах энергазберажэння". А што рабіць у такой сітуацыі выкладчыку?

Аднак справа не толькі ў колькасці вучэбных дысцыплін і аўдыторных заняткаў. Неабходна перабудоўваць вучэбны працэс у адпаведнасці з патрабаваннямі і магчымасцямі інфармацыйных тэхналогій. Асноўнай формай адукацыйнага працэсу павінны станавіцца не лекцыі, а семінары, прысвечаныя абароне студэнтамі індывідуальных праектаў. У вышэйшай школе проста вучыць — позна. Тут студэнты павінны — вучыцца. Гэта падобна на авалоданне манерай ігры rubato, што азначае больш вольнае выкананне, адхіленне дзеля выразнасці ад роўнага тэмпу і строгага рытму. Навучыць граць rubato — немагчыма. Але можна — навучыцца, спазнаючы гэтую манеру ў час выканальніцтва. У гэтым сэнсе ўсе заняткі ў класе па спецыяльнасці (гэта можа быць фартэпіяна, скрыпка, спевы, дырыжыраванне — што заўгодна) уяўляюць сабой унікальную мадэль самаразвіцця музыканта: творчая задача натхняе на пошук яе рашэння, і вынікам становіцца прэзентацыя выканання публіцы.

Вышэйшая музычная школа — гэта частка агульнай сістэмы музычнай культуры. Яна можа паспяхова функцыянаваць толькі ва ўмовах шчыльнага ўзаемадзеяння з музычным мастацтвам: кампазітарскай творчасцю і музычным выканальніцтвам. Але ж прастора такога ўзаемадзеяння ў сучасных умовах вельмі абмежаваная: адзін оперны тэатр, адзін сімфанічны аркестр (у аркестра тэлерадыёкампаніі і ў астатніх інструментальных калектываў — іншыя задачы), адна харавая капэла… І гэта ў Мінску. А што ў абласных цэнтрах, не кажучы пра раённыя? Не дзіва, што на канцэртнай афішы сёння дамінуе "папса", часцяком не самай высокай якасці.

Тым не менш, дастаткова зірнуць на тое інтэнсіўнае развіццё Акадэміі музыкі і ўсёй культуры, што ўласціва апошнім дзесяцігоддзям, асабліва калі Беларусь атрымала дзяржаўны суверэнітэт. Змяніліся вучэбныя планы і праграмы, былі распрацаваны адукацыйныя стандарты, адкрытыя магістратура і аспірантура, створаны савет па абароне дысертацый, у якім абаронена ўжо каля сотні кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, што ў разы павялічыла навуковы патэнцыял ВНУ. Знакавай падзеяй стала стварэнне кафедры беларускай музыкі. Быў пакладзены пачатак нотна-выдавецкай дзейнасці, у 2001-м быў заснаваны навукова-тэарэтычны часопіс, дзе знайшлі ўсебаковае адлюстраванне дасягненні беларускага музыказнаўства. Істотнае развіццё атрымала канцэртная выканальніцкая практыка. З'явіліся новыя калектывы — аркестры і ансамблі. Упершыню ў Беларусі пачалі праводзіцца міжнародныя конкурсы музыкантаў-выканаўцаў. Творчая моладзь атрымала магчымасць удзелу ў прэстыжных міжнародных спаборніцтвах, з'явілася безліч лаўрэатаў, што сведчыць пра міжнароднае прызнанне беларускай нацыянальнай выканальніцкай школы. У нас пачалі вучыцца замежныя студэнты, многія з якіх пазней закончылі аспірантуру БДАМ і паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Ну, а цяперашні Год культуры ўвогуле выклікаў масу ініцыятыў ва ўсіх сферах! І паказаў, як многа залежыць не толькі ад дзяржавы, але і ад кожнага.

Стаць бы моднай. Толькі як?

Дзяніс МАРЦІНОВІЧ,
літаратуразнаўца, журналіст, пісьменнік

У нас існуе праблема: літаральна адсутнічае рынак айчыннай літаратуры. Выдавецтва можа ўзяць рукапіс, падрыхтаваць кнігу, але часцей за ўсё яно не цікавіцца лёсам тыражу, што выйшаў з друку. Ніхто не хоча займацца рэкламай. Каб пра назву яго твора стала вядома, аўтар павінен выступаць у якасці менеджара. Маўляў, сам напісаў, сам і прасоўвай...

Каб айчынныя аўтары мелі попыт у сваёй краіне, неабходна старанна распрацаваная піяр-кампанія вакол кожнай новай назвы. Відавочна, што ў нас пра гэта амаль ніхто не клапоціцца. Звычайнай справай становіцца сітуацыя, калі пісьменнік вымушаны забіраць тыраж у выдавецтве, а потым самастойна ладзіць сустрэчы з публікай. Часам тыя прэзентацыі становяцца галоўным спосабам распаўсюджвання твораў…

Асабіста ў мяне проста няма часу выступаць у ролі менеджара. Таму, калі нехта просіць выступіць, я імкнуся не адмаўляць. Дзякуючы такім запрашэнням я змог сустрэцца з чытачамі ў Маладзечна, Віцебску, Гродна. Зрэшты, у апошнім горадзе папярэдне была праведзена рэкламная кампанія, аб'явы аб сустрэчы з'явіліся ў мясцовых газетах, былі расклеены на вуліцах. Я сапраўды да зямлі кланяюся людзям, якія маюць час, жаданне нешта арганізоўваць і запрашаць!

Звычайна на творчых сустрэчах дарослыя слухаюць і задаюць пытанні з вялікай зацікаўленасцю, бо прыходзяць на іх свядома, а вось школьнікі нават у маленькай аўдыторыі часам не могуць адарвацца ад гульняў на мабільных тэлефонах. У гэтай сувязі згадваю размову з адной настаўніцай інфарматыкі, якая ўгэўнена казала, што неабходна забараняць дзецям сядзець за камп'ютарам, бо сучасныя гаджэты адштурхоўваюць ад кніг. Не ведаю, наколькі слушная яе прапанова, але для мяне сапраўды вялікая загадка, што чытаюць сённяшнія падлеткі. У прыклад прывяду сустрэчу ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі. У межах праекта "Чытаем сваё. Класіка" разам з аўтарам ідэі Ганнай Севярынец мы імкнуліся па-новаму зірнуць на жыццё і творчасць Уладзіміра Караткевіча, а таксама зразумець, якія творы класіка выбіраюць сучасныя падлеткі. Са здзіўленнем пачуў, што многія школьнікі і студэнты нават не адкрывалі ні "Каласы пад сярпом тваім", ні "Чорны замак Альшанскі"! Калі не чытаюць Караткевіча з яго дэтэктыўна-прыгодніцкай літаратурай, дык хто ім будзе цікавы? На мой погляд, тэматыка твораў Мележа і Быкава яшчэ больш далёкая ад сучаснага падлетка.

Верагодна, каб моладзь пачала чытаць сваё, беларуская літаратура мусіць стаць моднай. У гэтым кірунку ёсць некалькі шляхоў. Адна з магчымых стратэгій зацікавіць аўдыторыю — пайсці ад асобы пісьменніка. Людзі, як вядома, любяць паспяховых, таму можна стварыць піяр-вобраз моднага, стыльнага, упэўненага ў сабе пісьменніка. Праўда, трэба разумець, што тут абавязкова паўстане пытанне якасці літаратурных твораў, бо складана сумясціць работу над іміджам з сур'ёзнай творчай працай.

Мяркую, залішняя сціпласць з'яўляецца адной з бед нашых творцаў. Напрыклад, ёсць цудоўны пісьменнік, мой улюбёны аўтар Андрэй Федарэнка. Я падыходзіў да яго, прапаноўваў зрабіць з ім інтэрв'ю, але спадар Андрэй заўсёды адмаўляецца. Усё ж, мяркую, літаратар павінен быць публічным чалавекам. Адмова ж ад з'яўлення ў інфармацыйным полі пойдзе толькі ў мінус…

Як журналіст, я добра ведаю, што нацыянальная літаратура можа патрапіць у поле зроку нашых мас-медыя толькі ў тым выпадку, калі ўзнікае гучная інфармацыйная нагода. Здавалася б, чаго прасцей, але… Летась у Шчучыне назвалі імёны лаўрэатаў першай Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Мне было вельмі прыемна, што мая кніга "Жанчыны Уладзіміра Караткевіча" стала пераможцам у намінацыі "Крытыка". Аднак ці шмат рэцэнзій на творы лаўрэатаў бачылі вы ў друку, ці чыталі інтэрв'ю з узнагароджанымі, ці чулі пра тое, каб ладзіліся творчыя сустрэчы з лідарамі творчага спаборніцтва? На жаль, сітуацыя вакол маёй кнігі, як, відавочна, і твораў іншых пераможцаў, не змянілася… Шкада, але пакуль тэндэнцыя іншая: пра пісьменніка напішуць усе выданні толькі тады, калі ён публічна пасварыцца з кім-небудзь ці патрапіць у іншы скандал…

Занатавала
Настасся ПАНКРАТАВА

Дзе нашы Трыстан ды Ізольда?..

Аляксей ШАДЗЬКО,
акцёр Маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра імя Максіма Горкага, музыкант

Часам задаю сабе пытанне: "Чаму ж я не сыграў ніводнай па-сапраўднаму буйной ролі ў кіно?" Не па часе маей прысутнасці на экране, вядома, а па матэрыяле. Сціпла лічачы сябе не апошнім акцёрам на гэтай планеце, адказу не знаходжу.

Балазе і не прапаноўвалася ж нічога такога — асаблівага. Цяпер не здымаюся наогул (апошняя роля — у фільме "Інсайт", які выйшаў у 2009 годзе): няма нармальных сцэнарыяў. Клянуся, запрасі мяне выпускнік ВГИКа зняцца ў яго дыпломнай работе, дзе будуць чалавечыя дыялогі, жыццёвы сюжэт, жывыя людзі, характары, я б сам яму даплаціў за гэты праект! А сёння і малако не ратуе акцёраў ад той шкоды, якую і ім, і гледачам, і культуры наогул наносіць сучасны расійскі кінематограф (пра шэдэўры кшталту "Вострава" Паўла Лунгіна я не кажу). Ды і ўпісаліся яны ўжо ва ўсю гэтую халтуру, растварыліся ў ёй.

Вось мне тэлефануе дама: "Мы хочам прапанаваць вам ролю ў серыяле". — "Пра што ён, як называецца?" — "Так і так". — "Ну-у-у… — у прынцыпе, мне ўжо ўсё зразумела. — Добра, дашліце, калі ласка, сцэнарый". — "...Навошта?.. Мы не дасылаем сцэнарыі". — "Дык а чаго ж вы тады тэлефануеце?" — І ўсё ж прыходзіць сцэнарый на сотню старонак. Я чытаю дзве першыя — і ўвесь стос аркушаў ляціць у сметніцу. Тэлефануе дама на наступны дзень: "Ну?" — "Я змог прачытаць толькі дзве першыя старонкі". — "Ну?" — "...Разумееце, гэта павінна быць нечуваная сума, каб я ў гэтым... зняўся. Я вам яе назаву, а вы мне скажаце: "Вы што, ачмурэлі?! Вас жа ніхто не ведае!" Дык вось, дрэнна, што мяне ніхто не ведае. А трэба чытаць сякія-такія артыкульчыкі пра мяне, ведаць маю творчасць. Вы самі знаёмыя з ёй хоць крыху?" — "..." — "А каго тады вы ведаеце? Гошу?" — "...Мы больш за такую суму вам заплаціць не можам..." — "І дзякуй Богу. Але за званок і сто старонак дзякуй". І яшчэ гісторыя. Актрыса майго тэатра сасватала мяне ў адну карціну. Прыходжу на пробы. Памочнік рэжысёра ў гневе: "Я вам дваццаць разоў казала, а вы ўсё седзіце! Хутка заходзьце!" Ну я ёй пару ласкавых і сказаў... Вось такое сёння расійскае кіно, якое пачынаецца са "сцэнарыяў" і хамства памрэжаў.

З Беларусі не тэлефануюць, не клічуць. Ды і дзе здымацца? У Дзмітрыя Астрахана? У нацыянальным блокбастары? У пераспевах накшталт "Белыя росы. Вяртанне"? І нібыта рэжысёры, якія атрымалі адпаведную адукацыю, у нас ёсць. Але што яны знялі? А сцэнарысты? Сцэнарый "Інсайта" Алены Калюновай быў нядрэнны. Праўда, пры стварэнні фільма яго, лічу, сапсавалі.

Якім мог бы аказацца сёння беларускі фільм? Можа, варта пакапацца ў гісторыі Радзівілаў, знайсці там цікавую плётку, казку, легенду. Каб з канфліктамі, з любоўнай лініяй. З нашымі Трыстанам і Ізольдай. Урэшце, выдумаць сюжэт, заснаваны на рэаліях таго часу. Як "Тры мушкецёры" Аляксандра Дзюма. Але каб не атрымалася так, як у апошняй экранізацыі "Ціхага Дона" Сяргеем Урсуляком, дзе казакі — нібы толькі што ад люстэрка. Дзіўная лажа для рэжысёра, які зняў "Жыццё і лёс"...

Занатаваў Алег КЛІМАЎ

Дзяжурны па нумары

Жыццё і міфы

Летась у № 35 "К" ад 29 жніўня быў апублікаваны мой матэрыял пад назвай "Чужых талерак нам не трэба! Як сваю знайсці?.." У гэтай своеасаблівай інструкцыі па адаптацыі маладых спецыялістаў гаворка вялася пра трох паспяховых работнікаў культуры з трох розных раёнаў Беларусі. Гэтыя людзі (усе — з вышэйшай адукацыяй) толькі пачалі набываць досвед. Прайшло паўгода. Я пацікавіўся, што адбылося ў маіх выпадковых знаёмых за гэты час і, самае галоўнае, ці не змянілі яны месца працы.

Яўген РАГІН

Першае, што хочацца зрабіць, дык гэта развеяць міф пра тое, што малады спецыяліст на першым месцы працы доўга не затрымліваецца. Прынамсі, мае знаёмыя з Кобрына, Докшыц і Дзятлаўскага раёна да новага запісу ў працоўнай кніжцы не імкнуцца і па сёння. Але давайце спынімся больш падрабязна на кожным з іх.

Лілія Туручко — загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі. Гэта тая, якая адразу адчула сябе ў сваёй талерцы і пачала фантанаваць ідэямі, таму была ўзнагароджана кіраўніцтвам раёна за актыўную жыццёвую пазіцыю… Датэлефанавацца да Ліліі не змог. У бібліятэцы дзяўчаты паведамілі, што нарадзіла яна нядаўна дачку і з лютага знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку. Але калегі запэўнілі, што Ліля і ў думках не трымае развітацца з калектывам і абавязкова вернецца ў бібліятэку.

Андрэй Чабан — мастацкі кіраўнік народнай студыі "Калейдаскоп" Докшыцкага ГЦК. Усё такі ж жвавы. Не жаніўся, часу няма. А вось інтэрнат далі. У "Калейдаскопе" па-ранейшаму пятнаццаць чалавек. Вельмі шчыльны графік гастроляў па раёне. Дый сам Андрэй у якасці вакаліста пастаянна выступае на самых розных канцэртах у Віцебску. Ці не так нараджаюцца зоркі?

Ніна Баклушына — дырэктар СДК у вёсцы Раклевічы. У лютым пабудавалі дом, адсвяткавалі з мужам пярэбары. Доўга хваліла новага начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Дзятлаўскага райвыканкама Наталлю Калодка. Маўляў, патрабавальная, адказная… У СДК — чатырнаццаць клубных фарміраванняў і гурткоў. З красавіка дадасца яшчэ адзін — па вывучэнні ёгі (знайшлі спецыяліста!). Такіх у раёне больш няма. Клубнае фарміраванне "Што? Дзе? Калі?" (кіруе дырэктар базавай школы Аляксандр Васюкевіч) па выніках мінулага года заняла на Гродзеншчыне другое месца. Леташні план па аказанні платных паслуг насельніцтву выкананы на 110 %. Выкананне сёлетняга плана — 54 мільёны рублёў — таксама справа рэальная. Дзеля гэтага вельмі актыўнае супрацоўніцтва наладжана з санаторыем "Радон". Сама Ніна Баклушына кіруе клубам прагрэсіўнай моладзі (рабочыя і спецыялісты Раклевічаў), удзельнічае ў адраджэнні велікоднага абраду вёскі, вынікова спявае ў жаночым трыа…

Карацей, жыццё працягваецца. Пабачым праз час, якія яшчэ вяршыні скорацца нашым знаёмым.

К

"Круглы стол"

Музейны прадукт для адукацыі

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Як высветлілася, аглядавай экскурсіяй як музейным прадуктам карыстаюцца 49 % настаўнікаў. Да ўсяго, 37 % педагогаў выказалася за тое, што найбольш запатрабаваныя школай менавіта тэматычныя экскурсіі. На пытанне "Якія музеі Мінска вы ведаеце?" большасць школьнікаў адказала: Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (38 %), Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы (22 %) і Нацыянальны мастацкі музей (11 %). Ад музеяў навучэнцы чакаюць атрымання карыснай інфармацыі (30 %) і атрымання задавальнення ад убачанага і пачутага (23 %).

Вольга Мірончык вылучыла асноўныя тэндэнцыі развіцця культурна-адукацыйнай дзейнасці замежных музеяў. Па яе назіраннях, недзе пяць гадоў таму ў беларускім грамадстве наведвалі музей дзеля таго, каб даведацца штосьці новае. Але Вольга Уладзіміраўна пераканана, што ў музей людзі павінны прыходзіць па тое, каб "перажыць" гісторыю, падзеі эмацыйна, атрымаць уражанне ад убачанага. Яна падкрэсліла: беларускія музеі не адстаюць ад музеяў заходніх. Работнікі фондаў, зразумела, — эліта прафесіі, таму і функцыя дакументавання лічылася асноўнай. Але ў XXI стагоддзі культурна-адукацыйная функцыя выходзіць ужо на першыя пазіцыі.

Якія асноўныя тэндэнцыі заходніх музеяў вылучае даследчыца? Па-першае, вывучэнне ўласнай аўдыторыі. "Нашы калегі зразумелі: для таго, каб эфектыўна працаваць з публікай, яе трэба добра ведаць. Вывучэннем складу наведвальнікаў, акрамя саміх супрацоўнікаў, займаюцца ахвотныя на спецыяльных універсітэцкіх курсах. Сегменты музейнай аўдыторыі на Захадзе — школьнікі, мясцовыя дарослыя, дарослыя з рэгіёнаў, сем'і, дарослыя турысты. Акрамя гэтага звяртаецца пільная ўвага на студэнтаў, пенсіянераў (якія ўсё больш заваёўваюць папулярнасць як катэгорыя гасцей тамтэйшых устаноў), маладых прафесіяналаў, беспрацоўных, этнічныя меншасці", — падкрэсліла Вольга Уладзіміраўна.

Уласна, дадае яна, роля музея паступова змяняецца: ён становіцца месцам дыскусій і творчай дзейнасці. Прычым на Захадзе ўстанова пачынае выконваць усё большую ролю ў адукацыі дарослага насельніцтва праз спецыяльна распрацаваныя праграмы. У 1970-я заходнія музеі пачалі надаваць увагу людзям з асаблівасцямі. Сёння, напэўна, няма такога музея, які не працаваў бы з інвалідамі.

Сучасны музей пачынае адмаўляцца ад традыцыйнай мадэлі "эксперт — публіка". Бо апошні складнік названай мадэлі выступае абсалютна раўнапраўным партнёрам, тым больш аўдыторыя і стварае музейны працэс. Заходнія музеі працуюць з настаўнікамі. Галоўнае — навучыць педагога дзейнічаць "па-музейнаму" праз адукацыйныя семінары, курсы павышэння кваліфікацыі, летнія курсы, адмысловыя цэнтры, праграмы… На Захадзе аддалі перавагу формам работы з індывідуальным наведвальнікам, тым, хто сам адкрыў дзверы ўстановы культуры.

Як на падвядзенні вынікаў "круглага стала" адзначыла Юлія Скадорва, "хочацца, каб і іншыя музеі перанялі вопыт супрацоўніцтва з установамі адукацыі. Над якой тэмай яшчэ можна працаваць? На маю думку, над тэмай сям'і".

К

Гасцям музея прадэманстравалі інтэрактыўную праграму.

"Пралангіраваць" легенду

Буйныя творцы, сыходзячы, пакідаюць пасля сябе не толькі духоўную спадчыну, але і вялікі пласт работы з ёю. Для навукоўцаў, даследчыкаў — гэта і задавальненне, і прафесійны інтарэс. Але для сваякоў такой асобы, у першую чаргу, — справа гонару і вялікая адказнасць. Як працуе з вобразам, асобай і творчасцю Кандрата Крапівы, 120 гадоў з дня нараджэння якога адзначалася ў сакавіку, "К" распавяла ўнучка літаратара, кандыдат мастацтвазнаўства Алена АТРАХОВІЧ.

Аліна САЎЧАНКА

— Гэты год у кантэксце юбілею Кандрата Крапівы прапануе імпрэзы і дзеі рознага маштабу. Частка з іх ужо прайшла, нешта адбудзецца. Паспяхова прайшоў вечар памяці Крапівы ў Маскве ў Культурным цэнтры пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь. Па словах дырэктара гэтага цэнтра, мерапрыемства мела рэзананс.

Алена Атраховіч.

Той самы малюнак Ігара Атраховіча, сына Крапівы.

Кандрат Крапіва падчас працы.

Урэшце, тое пацвердзілі і Лідзія Макарэвіч, дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, што падрыхтаваў для Масквы ўнікальную выставу "Ад маленства да сталасці", і Ала Сцебакова, дырэктар Тэатра-студыі кінаакцёра, што прывёз у Маскву спектакль "Хто смяецца апошнім". Я адчула цікавасць людзей да асобы Кандрата Кандратавіча. Такога маштабу мерапрыемствы патрэбныя, каб папулярызаваць асобу значнага чалавека і за межамі краіны.

Разам з тым, у рамках юбілею Крапівы праходзяць мерапрыемствы ў бібліятэках, школах нашай краіны. Я з задавальненнем бываю на такіх сустрэчах, імкнуся раскрыць асобу Крапівы шырэй, чым гэта постаць пададзена ў падручніках. Нядаўна праводзіла сустрэчу з васьмікласнікамі 23-й гімназіі Мінска: паказала ім фотаздымкі, прэзентацыю, размова выбудавалася ў пытаннях і адказах. Ад дзіцячай цікавасці становіцца вельмі прыемна. Дарэчы, хлопчыкі праяўлялі збольшага інтарэс да ваеннага мінулага Кандрата Крапівы — пісьменнік прайшоў чатыры вайны. Дзяўчынкі пыталіся пра асабістае жыццё літаратара, першае каханне.

Не магу не адзначыць навуковыя чытанні, прысвечаныя юбілею Кандрата Крапівы, у Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Сёлета ў падзеі прымалі ўдзел госці з замежжа. З кожным разам навуковая дзейнасць Крапівы раскрываецца ўсё шырэй. Калі літаратурны, драматургічны кірунак больш на слыху, то пра нармалізатарскую дзейнасць па станаўленні літаратурнай мовы, беларускай граматыкі збольшага ведаюць толькі вучоныя.

Выдавецтва "Мастацкая літаратура" выпускае выбранае Кандрата Крапівы. Гэта будзе падарункавы варыянт кнігі яго аўтарства. Мы з галоўным рэдактарам выдавецтва Віктарам Шніпам выступілі як складальнікі выдання, выбіраючы творы па прынцыпе актуальнасці — тое, што знаходзіцца па-за часам, жывое, дынамічнае, блізкае сучаснасці.

Зараз у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі праходзіць выстава з Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь, дзе ёсць дакументы, звязаныя з творцам. Я нядаўна гутарыла з супрацоўнікамі бібліятэкі, і мне распавялі, што сярод чытачоў гэтыя дакументы выклікалі інтарэс.

Рэгіёны таксама не засталіся ў баку ад святкавання юбілею Крапівы. На Уздзеншчыне, з якой паходзіць літаратар, рэгулярна ладзіцца фестываль гумару і сатыры. І сёлета ён прысвечаны юбілею Кандрата Кандратавіча. Канешне, тое выдатна, што людзі адгукаюцца. А гумар майго дзеда якраз блізкі да народа і народных крыніц!

Кандрат Крапіва: ад "недзе побач" да віртуальнага музея

■■■

— Кандрат Кандратавіч як драматург заўсёды сам працаваў з акцёрамі і рэжысёрамі, імкнуўся да сумеснага разумення ролі і героя. Гэта тычыцца і спектакля Леаніда Рахленкі "Хто смяецца апошнім", і работы Валерыя Раеўскага "Брама неўміручасці" ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Крапіву заўсёды было вельмі важна, каб галоўная думка твора была ярка выражана ў пастаноўцы. На ўласныя вочы бачыла працу над "Брамай неўміручасці", таму што дзед браў мяне на рэпетыцыі ў тэатр. Раеўскі, тады яшчэ малады рэжысёр, задумаў па тых часах вельмі авангардны спектакль з экстравагантным афармленнем, выкарыстаннем электроннай музыкі. Ён жадаў набліжэння да сучаснасці. І тут адбыўся момант сутыкнення. Кандрат Крапіва не быў кансерватарам, прымаў многія ідэі ад акцёраў і пастаноўшчыкаў, але ў гэтым выпадку падкрэсліў, што такі ход, фармалізаваны, містычны, адцягвае ўвагу ад самага важнага. Я памятаю гарачыя спрэчкі: Раеўскі бегаў туды-сюды з залы на сцэну і назад, ён нешта даказваў, нават не гаварыў — крычаў! Але ў спрэчках знайшоўся кампраміс. Не ўсё Кандрат Кандратавіч прыняў, але пастаноўка атрымалася, у тым ліку дзякуючы наладжанаму ў выніку кантакту. Калі ўяўляць сабе культуру ў выглядзе струны, то нацягнутая — гэта класіка. Яна, павагаўшыся, зноў вяртаецца ў свой нацягнуты стан. Мастацтва таксама праходзіць па гэтай траекторыі: раз — адхілілася, а потым зноў прымае зыходнае становішча. Менавіта таму класіка і лічыцца вечнай. Але наш час патрабуе навацый, я з гэтым згодная. Сёння мы маем вельмі розныя трактоўкі класічных твораў, і я асабіста не маю нічога супраць гэтага. Але, зноў жа, важна, каб нічога сутнаснага ў гэтых навацыях не страцілася.

Некалькі гадоў таму да мяне як уладальніка аўтарскіх праў з прапановай паставіць мюзікл па п'есе "Брама неўміручасці" звярнуўся адзін тэатр. Я добра разумею, што мюзікл — форма модная. Многія класічныя творы зараз ставяцца ў гэтым жанры, тая ж чэхаўская "Чайка" ў Маскве. Але калі гэта мюзікл, то тэкст павінен падпарадкавацца хаця б законам рытму, не кажучы ўжо пра рыфмаванне. Адсюль вынікала, што твор Крапівы трэба было перапісваць на вершы. Тэатр сказаў, што гатовы гэта зрабіць. На такі варыянт я не дала згоду. Кандрат Кандратавіч сам цудоўна валодаў паэтычным словам, і каб ён бачыў "Браму неўміручасці" ў вершах, такой бы яе і стварыў.

Тэатр-студыя кінаакцёра, калі ставіў "Хто смяецца апошнім", таксама звярнуўся да мяне асабіста з тым, каб унесці ў п'есу рэжысёрскія змены. Такім чынам атрымалася, што дзеянне па часе ў спектаклі расцягнута ад 1930-х да нашых дзён. Такі ход быў выкарыстаны для таго, каб паказаць актуальнасць тых самых праблем. Змянілася і канцоўка п'есы (па некаторых крыніцах, сам Кандрат Крапіва планаваў развязку, блізкую да сённяшняй тэатральнай, але абставіны таго часу не дазволілі яму зрабіць гэта). Мы доўга раіліся, бо трэба ж аргументаваць рашэнне. Урэшце, прыйшлі да таго, што такі адкрыты канец, "пралангіраванасць" вобраза дапамагае герою дзейнічаць па-за межамі спектакля. Кандрат Крапіва, верагодна, згадзіўся б з такой трактоўкай.

■■■

— Мне прыемна, што і мой дзесяцігадовы ўнук Глеб таксама пачаў цікавіцца жыццём прапрадзеда па меры сталення. Ён распрацаваў праект "Мінскія адрасы Кандрата Крапівы". Канешне, я дапамагла яму і выступіла ў якасці навуковага кіраўніка.

Мінск стаў для Кандрата Крапівы родным горадам, на пастаяннае месца жыхарства ён пераехаў сюды ў 1925-м годзе. У Мінску ён і пайшоў з жыцця ў 1991-м. Уявіце сабе, колькі гадоў ён тут жыў! І мы выявілі, што гэта тэма нікім не раскрытая, бо ўсім вядомы толькі яго апошні адрас на праспекце Незалежнасці, 76. Мы з Глебам пачалі ездзіць па Мінску. Многае нам распавяла мая мама, нявестка Крапівы, якая ведае яго з 1944 года. Па адным з адрасоў знайшліся людзі, што жылі з маім дзедам у адным пад'ездзе ў 1930-я. Цікавая гісторыя атрымалася і з домам па вуліцы Маладзечанскай, яна некалі пралягала ля Царквы Марыі Магдалены. Месца, дзе стаяў дом, мы адшукалі не па фотаздымку, а па замалёўцы майго бацькі, які ніколі б у жыцці не ўявіў, што яго малюнак стане гістарычным дакументам. У адрасным спісе таксама пасляваенны дом па праспекце Незалежнасці, 12. Глеб зрабіў свежыя фотаздымкі нашых адкрыццяў. Галоўнае, што яны звязаныя не толькі з прыватнай гісторыяй Кандрата Крапівы, але і з лёсам цэлага горада. Унук распавёў, што яго аднакласнікі вельмі жыва адрэагавалі на яго праект і прызналіся, што такім чынам больш цікава вывучаць творчасць асобы, якая жыла і працавала недзе побач з табой. У выніку працы мы атрымалі фотаэкскурсію, якая была ацэнена і супрацоўнікамі Музея гісторыі беларускай літаратуры. Верагодна, гэты праект музей аднойчы і ўвасобіць.

■■■

— Даўно агучваю ідэю стварэння мемарыяльнага музея імя Кандрата Крапівы. Такая маштабная фігура мае права быць прадстаўленай у нашай культурнай прасторы і праз асобную экспазіцыю. Зараз амаль увесь архіў пісьменніка знаходзіцца ў Музеі гісторыі беларускай літаратуры, чым я вельмі задаволена, бо пытанне захоўвання — справа вельмі складаная. Тым больш, што ва ўмовах установы дакументы і асабістыя рэчы Крапівы даступныя гледачу. Акрамя таго музей ладзіць выставы, некаторыя з іх дэманструе і за мяжой.

Ды хацелася б мець і сталую пляцоўку, але я разумею: гэта не так проста. І пакуль такой магчымасці няма, узнікла альтэрнатыўная ідэя — віртуальны музей. Гэта таксама вялікая праца, важна, каб яе ажыццявілі прафесіяналы пад патранатам якой-небудзь культурнай установы. Тым больш на канферэнцыі ідэю падтрымалі навукоўцы. А практыка стварэння такіх музеяў існуе, ёсць на што абапірацца. Інфармацыі для віртуальнага праекта таксама хапае, бо дакументы сумленна захаваныя не толькі літаратурным музеем, але і навуковай бібліятэкай Акадэміі навук. Фрагменты архіву ёсць у музеях Купалы і Коласа…

К

Дык хто сказаў, што ўсе хлопцы збеглі ў ІТ-сферу?

Чаго жадаюць абітурыенты?

"Музей маёй мары", "Турыстычны маршрут маёй мары"… І калі прыдуманы студэнтам ідэальны музей наўрад ці проста матэрыялізаваць, то распрацаваць уласны турыстычны маршрут якраз даволі рэальна. Дык вось, распрацоўкай праектаў, якія маюць такія назвы, займаюцца на занятках на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, дзе 19 сакавіка прайшоў Дзень адкрытых дзвярэй для будучых абітурыентаў. Патэнцыйныя студэнты прыехалі, каб даведацца пра вучэбны працэс, інтэрнаты і стыпендыі.

Вольга РОПАТ

На факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый рыхтуюць бібліятэкараў-бібліёграфаў (плюс — менеджар альбо метадыст) і менеджараў па культурнай спадчыне і турызме.

Падчас прэзентацыі спецыяльнасцей "Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць" і "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны" адразу заўважыла, што зацікаўленасць у культурных прафесіях ёсць не толькі ў дзяўчат: амаль палова прысутных у аўдыторыі — юнакі. А дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Алена Паўлава дадала статыстычны паказчык: "Цягам некалькіх гадоў працэнт юнакоў на факультэце (а гэта — блізу 30 %) не змяняецца". Дык хто сказаў, што ўсе хлопцы збеглі ў сферу ІТ-тэхналогій?

Цікава, што за кожнай кафедрай факультэта замацаваны пэўныя рэгіёны краіны і раёны Мінска. Таму нядаўна з прафарыентацыйнай мэтай (з падрыхтоўкай адпаведнай праграмы, якая ўключае ў тым ліку гульні і квэсты) выкладчыкі са студэнтамі наведалі адну з бібліятэк Дзяржынска і магілёўскую гімназію. Плануюць паехаць бліжэйшым часам яшчэ і ў Асіповічы.

Падчас Дня адкрытых дзвярэй.

Чым прываблівае абітурыентаў факультэт, дэвізам якога можа стаць знакамітае выслоўе "Хто валодае інфармацыяй — той валодае светам"? Намеснік дэкана па выхаваўчай рабоце Ала Фядорына адзначыла, што той чалавек, які ўмее знаходзіць, збіраць, апрацоўваць і прадстаўляць інфармацыю, заўсёды будзе запатрабаваны на рынку працы. У гэтым кантэксце старшы выкладчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Юлія Галкоўская падрабязна апавяла аб працэсе навучання на спецыяльнасці "Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць". Будучых студэнтаў чакаюць праектная праца, семінары ў форме гульні, падрыхтоўка мерапрыемстваў для ўніверсітэта і бібліятэк…

Але ўсё ж такі большая частка абітурыентаў, як было пазначана ў спісах удзельнікаў Дня адкрытых дзвярэй, жадала даведацца пра спецыяльнасць "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны". Па інфармацыю з'ехаліся з Барысаўшчыны, райцэнтраў (скажам, Баранавічаў, Іўя), з абласных гарадоў — Брэста і Віцебска. Яшчэ на пачатку "прадстаўлення" спецыяльнасці Алена Паўлава паабяцала, што на факультэце навучаць размаўляць па-беларуску — у якасці "бонусу" да профільнай адукацыі. Вучэбны ж працэс уключае, сярод іншых цікавостак, і наведванне рэгіянальных музеяў краіны, двойчы на год ладзяцца выезды ў нашы славутыя замкавыя комплексы, а пасля першага курса будучых музеязнаўцаў чакае практыка па археалогіі. Дарэчы, свае праекты многія студэнты робяць не толькі па-беларуску, але і на англійскай або нямецкай мовах, існуе беларуска-літоўская праграма па папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны Вялікага Княства Літоўскага, а летась прайшоў беларуска-германскі семінар.

Былі патлумачаны і некаторыя тонкасці. Не сакрэт, што многія з абітурыентаў мараць працаваць экскурсаводамі. Але перад тым суіскальнікам такой працы давядзецца здаць экзамен на адпаведны сертыфікат. Хвалявала моладзь і "вострае" пытанне — размеркаванне студэнтаў. Як высветлілася, сярод прапаноў ад факультэта адзначыліся Смаргонь, Рагачоў, Ушачы, Гродна, Бабруйск... Дарэчы, крыху распавялі і пра лепшых выпускнікоў, якія зараз працуюць у Гомельскім абласным музеі ваеннай славы, Вілейскім раённым краязнаўчым музеі, Віцебскім абласным краязнаўчым музеі, у Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы… Асабліва адзначылі Дзіяну Шантар (яна родам з Шаркаўшчынскага раёна Віцебшчыны), якая некалькі гадоў у Нацыянальным мастацкім была куратарам акцыі "Ноч музеяў".

Пасля прэзентацыі спыталася ў абітурыентаў, чаму яны бачаць менавіта музейную справу ў якасці будучай прафесіі. Чым спадабалася спецыяльнасць, тым больш заробкі — не самыя высокія?.. Больш упэўненыя адказалі, што любяць экскурсіі і мастацтва. Размову падхапіў студэнт І курса ўніверсітэта Дзяніс Хварастоў: "У мяне з'явілася цікавасць да нацыянальнай беларускай культуры. Ва ўніверсітэце я зразумеў: наша краіна мае патрэбу ў вялікім культурным уздыме". Да ўсяго, Дзяніс упэўнены: на культуры можна зарабіць грошы, калі аднесціся да гэтай справы сур'ёзна.

Дадам, што наступным разам Дзень адкрытых дзвярэй на факультэце пройдзе 16 красавіка. А пакуль будучыя бібліятэкары-бібліёграфы ды менеджары могуць падумаць над рознага кшталту пытаннямі, бо калі ў аўдыторыі пануе цішыня падчас такіх сустрэч, становіцца неяк няёмка… І думаеш: дык чаго ж жадаюць будучыя студэнты?

К

Пра Коласа — з "Элегіяй"

Дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская паведаміла "К" пра новы праект установы, заснаваны на супрацоўніцтве з творчымі калектывамі нашай краіны і замежжа. Агульныя мерапрыемствы, да прыкладу, запланаваны з Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатрам імя Якуба Коласа, з шэрагам мінскіх устаноў культуры, а таксама з Дзяржаўным мемарыяльным гісторыка-літаратурным і прыродна-ландшафтным музеем-запаведнікам Аляксандра Пушкіна "Міхайлаўскае". У вялікай гасцёўні музея, як і падчас жыцця Песняра, будзе шматлюдна і цікава.

Яўген РАГІН

Рэалізацыя праекта была распачата 22 сакавіка. У Музей Якуба Коласа завітаў народны калектыў аўтарскай песні "Элегія", які дзейнічае пры Цэнтры эстэтычнага выхавання аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Вілейскага райвыканкама. Кіраўнік цэнтра і "Элегіі" Таццяна Захарыч распавяла, што супрацоўніцтва калектыву са сталічнымі музеямі — даволі сталае, але ўпершыню "Элегія", якой спаўняецца дваццаць гадоў, прыехала ў поўным складзе.

У Музеі Якуба Коласа выступае «Элегія».

Вілейскія госці глядзеліся і "чуліся" ў коласаўскім антуражы вельмі арганічна. Нездарма Таццяна Захарыч акцэнтавала, што "Элегія" займаецца літаратурнай аўтарскай песняй. Аналагаў па нашых рэгіянальных установах культуры я не прыгадаю. У рэпертуары калектыву — звыш за 90 твораў на ўласныя тэксты і музыку, а таксама — на вершы беларускіх паэтаў, у тым ліку і класікаў. Так што ўсё было вытанчана і велічна: і мелодыя, і словы, і пастава кожнага артыста. У складзе "Элегіі" — музыканты, паэты, мастацкія чытальнікі. На рахунку творцаў — шэсць дыскаў, леташні называецца "Песні над Віліяй". Шмат увагі надае ансамбль мастацкаму чытанню, таму стала супрацоўнічае з акцёрам і рэжысёрам Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь Алегам Вінярскім.

— Функцыя "Элегіі" — асветніцкая, — кажа Таццяна Захарыч. — Мы асвятляем жыццё беларускім Словам…

Ці былі ў артыстаў складанасці з тым, каб дабрацца з Вілейкі да сталіцы поўным складам, з апаратурай, музычнымі інструментамі? Не, адказвае кіраўнік калектыву, бо супрацоўніцтва з раённымі ўладамі — шчыльнае і плённае. Старшыня Вілейскага раённага Савета дэпутатаў Наталля Радзевіч нават прыехала разам з "Элегіяй" і прадставіла калектыў. Хапае ў яго і фундатараў. Словам, вандроўкі ансамбля — планавыя, беспраблемныя. Ён нават у міжнародных фестывалях удзельнічае.

Актыўнасць "Элегіі" нараджае шматлікія аўтарскія праекты. Яны рэалізоўваюцца разам з Вілейскай царкоўнай дабрачыннай акругай, з дабрачынным гісторыка-культурным фондам "Крокі" памяці Першай сусветнай вайны, з беларускім радыё…

І апошняе. План па аказанні платных паслуг насельніцтву ў "Элегіі" ёсць. Ён выконваецца. Аднак, па словах мастацкага кіраўніка калектыву Таццяны Захарыч, не гэта галоўнае. Важна, маўляў, каб душа беларускасцю жыла.

К

Тактыка культурнага развіцця

Аншлаг — паказчык якасці

Фестывалі бываюць рознымі. І не ў тым справа, раённыя яны, абласныя ці рэспубліканскія. Галоўнае, падаецца, у тым, наколькі карысныя яны для гледачоў і ўдзельнікаў. "К" паведамляла ўжо, што Магілёўшчына распачала Год культуры абласным фестывалем народнай творчасці. Дык вось, у мерапрыемстве па чарзе бяруць удзел лепшыя самадзейныя калектывы дваццаці аднаго раёна, а таксама Магілёва ды Бабруйска. Інакш кажучы, з фестывалю народнай творчасці Год культуры на Магілёўшчыне распачаўся, ім жа і скончыцца.

Яўген РАГІН

Ініцыятар акцыі — Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы, які славіцца нестандартным і маштабным падыходам да справы. Дырэктар Алег Хмялькоў распавядае, што фінальны гала-канцэрт адбудзецца ў Палацы культуры вобласці. А пакуль творчыя справаздачы раёнаў адбываюцца ў зале (480 месцаў) абласнога метадцэнтра. Распачаў акцыю Магілёўскі раён, працягнуў Бялыніцкі, а ў мінулы чацвер выступіў ужо Бабруйскі.

Канцэрты, білет на якія каштуе дваццаць тысяч рублёў, праходзяць, па словах Алега Хмялькова, з аншлагам. Лепшага доказу таго, што мерапрыемствы якасныя, і не назавеш. Яшчэ адно тлумачэнне папулярнасці імпрэз у тым, што "імпарт" сельскага мастацтва на сцэну абласнога цэнтра — справа, мякка кажучы, не будзённая. Не, творчыя справаздачы мастацкай самадзейнасці на ўнутрыраённым узроўні — досыць рэгулярныя. Але выхад на вобласць, ды яшчэ з удзелам усіх без выключэння рэгіёнаў, ажыццяўляецца, як падаецца, упершыню.

Уменне гаспадарыць — таксама мастацтва. І той, хто ў свой час **не баяўся "рэпетыцый",** досыць упэўнена адчувае сябе і сярод накладных ды рахункаў-фактур.

"Перад рэалізацыяй творчага праекта, — тлумачыць Алег Хмялькоў, — мы праманіторылі сітуацыю. Аказалася, што нашу прапанову падтрымалі ў першую чаргу непасрэдныя ўдзельнікі імпрэз — самадзейныя артысты. Вынік у пэўнай ступені прадказальны. Для творцаў гэта — і адказны іспыт, і цудоўная магчымасць праявіць сябе. Без названых складнікаў не бывае росту ў мастацтве…"

Натуральна, крыху інакш успрынялі навіну начальнікі аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, бо ім апрача творчага пытання прыйшлося вырашаць і гаспадарчае: вышукваць транспарт і бензін. Але ўменне гаспадарыць — таксама мастацтва. І той, хто ў свой час не баяўся "рэпетыцый", досыць упэўнена адчувае сябе і сярод накладных ды рахункаў-фактур. Урэшце, аксіёма творцы-гаспадарніка (а такімі, спадзяюся, з'яўляюцца большасць нашых начальнікаў раённых аддзелаў): без прадуманага матэрыяльнага падмацавання не бывае і духоўных прарываў.

А цяпер больш падрабязна прааналізуем, чым уразілі магілёўскую публіку, скажам, бялыніцкія артысты. Цэлым спектрам вартых увагі прэзентацый. На вуліцы перад метадцэнтрам працавалі рамесніцкія падворкі. У фае кіраўнікі хлеба- і сыравытворчасці рэкламавалі сваю прадукцыю. Райбібліятэка прапаноўвала паслугі фітабара. Школа мастацтваў і народныя майстры праводзілі майстар-класы па выцінанцы і пляценні паясоў. Музеі паказвалі 3D-візітоўкі. Былі запрошаны і ганаровыя грамадзяне Бялыніч. На сцэне выступалі народныя ды ўзорныя калектывы, а ў выставачнай зале па вуліцы Болдзіна прэзентаваліся сорак жывапісных работ бялыніцкай мастачкі Ларысы Журавовіч.

К

Адкуль жа "...Вушы"?

Да Міжнароднага дня тэатра (і адначасова ў сувязі з вясновымі канікуламі, калі можна дадаткова запрашаць на прагляды школьнікаў двойчы на дзень) Маладзёжны тэатр эстрады прапанаваў прэм'еру дзіцячага мюзікла "Прынц — залатыя вушы".

Надзея БУНЦЭВІЧ

Дзеці і іх бацькі атрымалі добры падарунак. І пачынаецца ён не ўласна са спектакля, а з той атмасферы, што пануе ў фае за паўгадзіны да пачатку. Можна зрабіць аквагрым, сфатаграфавацца ў вобразе галоўнага героя казкі, прасунуўшы галаву ў "акенца" на фанернай выяве, скласці на хуткасць мазаіку, пагуляць з мімамі. Дый у самім спектаклі інтэрактыву стае. Акрамя таго, што герої пастаянна ходзяць праз усю залу, паціскаючы рукі дзятве, у канцы спектакля маленькія гледачы і самі зрываюцца з месцаў, дапамагаючы героям збіраць чарадзейныя яблыкі (жоўтыя ды чырвоныя паветраныя шарыкі, да якіх прымацавана зялёнае лісце).

Мастацкі кіраўнік тэатра Вячаслаў Панін выступіў аўтарам п'есы, склаўшы яе з перапляцення матываў розных казак і мультфільмаў. Такія прыкметы сучаснасці, як згаданая постмадэрнісцкая сумесь, а таксама кліпавасць некаторых нумароў, удалае выкарыстанне прыёмаў мантажу спрыяюць драматургіі, надаюць спектаклю пругкі тэмпарытм. Вабяць сцэнічныя строі мастака Наталлі Цыганковай, якая ў свой час неаднаразова станавілася лаўрэатам Міжнароднага фестывалю авангардной моды "Мамант": чаго каштуюць хаця б касцюмы разбойнікаў, дзе цяльняшкі спалучаюцца з фантазійна-касмічнай тэмай накшталт "Зорных войнаў".

Сама назва — "... Залатыя вушы" — міжволі настройвае на музыку як галоўны складнік спектакля. Песенныя вершы Ірыны Гаранец цалкам адпавядаюць жанру мюзікла, бо рухаюць сюжэт, а не спыняюць яго музычнымі "стоп-кадрамі". Кампазітарам названы Аляксандр Сухараў, вядомы па гурту "Эквокі". Але ў спектаклі, як і звычайна ў праектах гэтага тэатра, шчодра выкарыстоўваюцца многія ранейшыя напрацоўкі: і песні з вядомых мультфільмаў, і частка сцэнічных строяў "на падборы". Гэта ніяк не рэжа ні вуха, ні вока, бо ўсё стылёва вытрымана — у тым ліку, і праз аднаго аранжыроўшчыка (Віталь Скадорва). Тым не менш, сухараўскія фрагменты адразу прыцягваюць да сябе ўвагу — і меладычнымі ходамі, і ўпадабанымі "фірменнымі" гармоніямі, што парушаюць праславутую абмежаванасць у "тры акорды".

Дык чаму б тэатру не выйсці, нарэшце, на паўнавартасны аўтарскі мюзікл, прасякнуты сапраўдным музычным развіццём? Бо пакуль тое, што называецца гэтым жанравым азначэннем, мае дачыненне найперш да песеннага рэвю, калі асобныя нумары — вядомыя і новыя — яднаюцца адзінай сюжэтнай лініяй. І зікла, сучаснае аркестравае гучанне.

Думаецца, такі зварот да жанру мюзікла ў яго самым высокім прафесійным сэнсе будзе здольны вывесці тэатр на новыя рубяжы. Бо пакуль Маладзёжны тэатр эстрады скіраваны найперш на гумар і забаўляльныя шоу, а мог бы ўзнімаць куды больш разнастайныя тэмы. Гэта, дарэчы, дапамагло б артыстам выйсці з аднастайнай акцёрскай манеры, калі ўсе героі шаржыравана ўтырыруюць жэсты, інтанацыі, працуючы выключна ў эстэтыцы "Маскі-шоу", увесь час крычаць, нягледзячы на падгучку і абсалютна спраўную гарнітуру.

Заўважна, што тэатр імкнецца напоўніцу раскрываць свой творчы патэнцыял. З'явіліся ў трупе Дзмітрый і Андрэй Дубешкі — узнік спектакль "Двое з куфэрка — бы адбітак у люстэрку". Падабенства артыстаў-братоў выкарыстана і ў спектаклі "... Залатыя вушы". Ды той жа Андрэй Кунец (Прынц, у якога з-за гульні "ў Шрэка" замест заняткаў чараўніцтвам выраслі аспіны вушы) не ўпершыню атрымлівае цэнтральныя ролі, дэманструючы не толькі свае спеўныя, але і багатыя акцёрскія, пластычна-харэаграфічныя магчымасці. Гэты малады артыст, які з'яўляецца яшчэ толькі студэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, — сапраўдная знаходка для тэатра! І, тым больш, для жанру мюзікла. Значыць, трэба шукаць для яго праекты "на вырост", дзе можна было б адыйсці ад іміджу вечнага балакі. Тое ж можна сказаць і пра іншых удзельнікаў: ім трэба расці і развівацца, спрабаваць сябе ў розных стылістыках і амплуа, а не паўтараць да бясконцасці адноўчы знойдзеныя вобразы і манеру. Інакш — хаджэнне па замкнутым коле. І — зноў безальтэрнатыўнасць Музычнага тэатра ў час вылучэння на Нацыянальную тэатральную прэмію ў адпаведнай намінацыі, што мае на ўвазе аперэту ці мюзікл. К

Сцэна з дзіцячага мюзікла "Прынц — залатыя вушы".

Эдуард Жакевіч. Графічная пластыка.

Галерэя "Акадэмія" Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў спрычынілася да святкавання 40-годдзя факультэта дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы выставай "ХТО", на якой экспануюцца творы выкладчыкаў кафедры графічнага дызайну.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Што ж такое (вы)творчасць?

Як настаўніку літаратуры неабавязкова быць літаратарам, так і таму, хто рыхтуе спецыялістаў мастацкай сферы, няма пільнай патрэбы самасвярджацца яшчэ і праз мастацкую творчасць. Гэта, так бы мовіць, у прынцыпе. Бо самому якасна рабіць нейкую справу і вучыць гэтай справе іншых — дзве розныя прафесіі, для якіх патрэбны два розныя таленты. Але зусім някепска, калі ў выкладчыка ўсё ж такі ёсць яшчэ і творчы досвед, і мастацкі талент. У такім выпадку большая верагоднасць таго, што ён здолее з павагай паставіцца і да таленту вучня, і ні ў якім разе не стане, як кажуць, ламаць чужую натуру праз калена.

Студэнтам кафедры графічнага дызайну згаданага факультэта нашай акадэміі, мяркую, з выкладчыкамі пашчасціла. Яны ведаюць і што такое творчасць, і што такое вытворчасць. Ім ёсць што сказаць грамадзе, а гэта азначае, што яны здольныя і прыслухоўвацца да іншых. А вядома, што навучальны працэс, пабудаваны на сумоўі і паразуменні, можа быць вельмі плённым.

Удзел ў выставе бяруць дызайнеры — выкладчыкі кафедры. У кожнага — адметны почырк. Увогуле яны ўніверсалы, могуць плённа працаваць у розных галінах дызайн-графікі, а таксама ў сумежных з ёй сферах. Але кожны мае ўлюбёную тэхніку і тэматычныя прыярытэты. Уладзімір Васюк і Вячаслаў Семянько шануюць "кансерватыўныя" тэхнікі. Першы ў аўтарскіх аркушах колерам не карыстаецца ўвогуле, другі — зрэдку. Абодва майстры перадаюць настрой і думкі праз безліч адценняў шэрага. Гэта на тле бязмежных магчымасцяў каляровага друку дазваляе ім разважаць на прасторы аркуша пра нязменныя чыннікі Быцця, пра Прастору і Час, не збіваючыся на вонкава эфектнае, але сутнасна — другаснае і эфемернае. Уладзімір Даўгяла вядомы як ілюстратар кніг. Яго вабяць тэксты, якія дазваляюць занурыцца ў рамантызаваны свет еўрапейскага Сярэднявечча. Стылёва ягоныя аркушы нагадваюць мініяцюры старажытных хронік. Ён шануе акварэль.

Наталля Коўш знайшла сябе ў фатаграфіцы. Фактычна яна малюе аб'ектывам. У яе руках камера становіцца рэнтгеначскім апаратам, які прасвечвае аб'ект ці з'яву наскрозь, па "костак". Да асновы. Камера — асноўны інструмент і для Уладзіміра Цярэнцьева. Ягоныя фотаграмы, імпрэсіяністычныя па духу, успрымаюцца эстэтычнай рэфлексіяй, але пры нагодзе, у пэўным кантэксце, пры тэматычным дачыненні могуць набыць функцыянальнасць.

Руслан Найдзен — рафінаваны эстэт. Тэма, змест, канцэпцыя — ўсё гэта для яго не тое каб другаснае, але і, відавочна, не галоўнае. Паводле ягонай завядзёнкі, ўсё ім зробленае мусіць найперш быць прыгожым. Свае работы ён групе ў серыі, ідэю раскрывае праз паслядоўнасць выяў. Мне гэта нагадвае графічныя аповеды Казіміра Малевіча і дае падставы меркаваць, што адштурхоўваецца Найдзен менавіта ад творчасці вялікага супрэматыста. Адно што Малевіч і гламур (уласцівы Руслану Найдзену па жыцці) — рэчы несумяшчальныя. Дызайну, аднак, пасуюць парадоксы…

Вось і Юрый Тарэеў — майстар парадоксаў. Гэта асаблівасць ягонага мыслення добра прыдалася да практыкі стварэння тэатральных плакатаў. Гэта іпастась творчасці Тарэева грунтоўна прадстаўлена ў дадзенай экспазіцыі. Эдуард Жакевіч, адзін з ветэранаў кафедры, вядомы найперш як дызайнер кнігі. Тэхнічная і іншая спецыяльная літаратура для мастакоў, што звязаная з паліграфіяй, ніколі не лічылася прэстыжнай справай. Куды як больш цікава аздабляць літаратуру мастацкую. Эдуард Жакевіч гэты стэрэатып зламаў. Кожную работу ён робіць як унікальную. Аздобленыя ім кнігі разлічаныя на шчыльнае кола спецыялістаў, але іх з цікавасцю будзе гартаць і той, хто да тых спецыяльнасцяў дачынення не мае. Майстру належыць значная роля ў станаўленні сучаснай беларускай кніжнай культуры, кніжнага дызайну. Ганна Мельнікава на гэтай выставе запомнілася работамі, якія больш пасуюць станковай графіцы, чым дызайну. Хоць сёння паміж гэтымі з'явамі няма неадольнай мяжы. Эмацыйнасць, пачуццёвасць, зрэшты, не пярэчаць функцыянальнасці. Сказанае тычыцца і работ Наталлі Кузьмянковай.

Выкладчыкі кафедры графічнага дызайну на гэтай выставе прадэманстравалі свой творчы патэнцыял, паказалі, што можна паспяхова сумяшчаць творчую майстэрню і вучэбную аўдыторыю, працу па прафесіі і перадачу свайго досведу моладзі. Ну а амбіцыйнай моладзі ёсць на каго раўняцца… К

Вячаслаў Семянько. "Адлюстраванне адлюстравання".



Наталля Коўш. Фотаграфіка.



Юрый Тарэеў. Тэатральны плакат.

Ганна Мельнікава. "Адбітак".

Выносьце смецце...

Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр зрабіў тры адкрыцці адначасова. Першае — у сутарэннях свайго памяшкання адкрыў камерную сцэну. Другое — акцёра сваёй трупы Дзмітрыя Багаслаўскага, больш вядомага нават як драматурга, адкрыў не проста як рэжысёра (бо той і заканчваў нашу Акадэмію мастацтваў па спецыяльнасці рэжысура, і рабіў некалькі самастойных прац у розных тэатрах), а менавіта як найталенавітага пастаноўшчыка. Нарэшце, адкрыў для беларускай публікі імя сучаснага ўкраінскага драматурга Наталлі Варажбіт, паставіўшы яе п'есу "Саша, вынесі смецце".

Надзея БУНЦЭВІЧ

І спектакль, і прыдатная для яго сцэна з'явіліся па ініцыятыве ўсё таго ж Багаслаўскага. Ужо адно тое, што тэатр падтрымаў свайго выхаванца, заслугоўвае ўвагі і пашаны (часцей здараецца, на жаль, наадварот: гасцям — даверу больш). Тым больш прыемна, што сцэна аказалася не проста камернай, а менавіта эксперыментальнай, што ў іншых тэатрах сустрэнеш не часта.

Хаця, па вялікім рахунку, які тут эксперымент? Усё надзвычай проста, не выходзячы за межы мінімалізму. Але кожная дэталь, любая дробязь — усё скіравана на мастацкі вынік. Няма нічога выпадковага — дакладней, выкліканыя аб'ектыўнай сітуацыяй "выпадковасці" абыграны так, нібы ўзніклі яны цалкам заканамерна. Адна з іх — сама сцэнічная прастора. Выцягнуты пакой, трубы на столі, незразумелае металічнае збудаванне накшталт часткі апоры для лініі электрапередач, справа "ў канцы тунэля" — прыступкі, што вядуць да дзвярэй. Але такая, мякка кажучы, далёка не самая ідэальная тэатральная пляцоўка ўжо сама па сабе ўспрымаецца часткай адмыслова зробленай сцэнаграфіі (Вольга Грыцаева), задуманай акурат да гэтага спектакля. Ураканне дапаўняюць некалькі змешчаных на сценах тэлевізараў, спачатку — без выявы, з чорна-белым мільгаценнем, якое быццам "зацягвае" ў іншае вымярэнне, па той бок існавання. Герої выходзяць да стала, дзе будзе мясіцца цеста на памінальныя піражкі, — і ты адразу адчуваеш сябе прысутным не ў глядацкай зале, а ў іх кватэры. Пранясенне дзеі на могілкі вырашаецца вельмі проста: невялічкі блінец з цеста вешаецца на металічную апору — вось і помнік гатовы. А мука, што сыплецца на стол, набывае значэнне адразу некалькіх сімвалаў. Гэта і час з "пясочным" гадзіннікам, і хлеб, які асацыюецца з жыццём, і снежная зіма, што нагадвае пра смерць, і прыказка, якая вядзе да "перамір'я" паміж імі: маўляў, усё перамелецца — мука будзе. У пэўны момант "ажываюць" тэлевізары, выступаючы ў ролі "сямейнага фотаальбома": замест "снежнай замеці" (той жа "мукі") на экранах узнікаюць успаміны. А "Белы цеплаход", пра які спяваецца ў вядомай песні Юрыя Антонава, чамусьці ўяўляецца вылепленым з таго ж піражковага цеста.

Але ўсё гэта не мела б ніякага сэнсу, каб не акцёрская ігра — шчырая, пранізлівая, без ценю найгранасці ці наўмыснай "гульні", без аніякага фальшу. Акцёраў — не пазнаць, быццам у іх за плячыма зусім іншая школа. І кожны — супер-зорка: Аляксандр Пашкевіч (Саша), Любоў Пукіта (яго дарослая падчарка Аксана) і асабліва Наталля Анішчанка (жонка Каця), на якой і трымаецца практычна ўсё дзеянне і якая адразу задае яму неабходную танальнасць. Атмасферу хатняй даверлівасці не парушаюць і сцэнічныя строі. Мастачка Вікторыя Ця-Сен змяняе сваю звыклую манеру — сумяшчэнне несумяшчальнага, мазаічнага злучэння кідкіх, жудасна яркіх, ледзь не флюарэсцэнтных фарбаў, якія канцэнтруюць на сабе ўвагу, адначасова адцягваючы яе ад уласна персанажаў. У "Сашы…" — усё наадварот: касцюмы быццам "не заўважаеш", настолькі яны натуральныя. І цалкам адпавядаюць свайму прызначэнню — падкрэсліць твары, а не ўбранні, дапамагчы ўнікнуць у псіхалагічны стан герояў, для якіх у тыя моманты зусім няважна, у што яны апрануты і як глядзяцца збоку. Мы ўвогуле бачым нават не герояў, а іх аголеныя душы, для якіх вопратка нічога не значыць. І калі "душа з душою гаворыць", таксама няважна, што жанчыны — на гэтым свеце, а мужчына — на тым. Ён не можа вярнуцца, як бы яны ні енчылі. А праз год, калі пачынаецца вайна і "шостая мабілізацыя", ужо яны самі — супраць яго вяртання, як бы ён ні прасіўся, спасылаючыся на патрыятызм.

П'еса, напісаная па замове тэатра "Трэверс" (Шатландыя) і прысвечаная падзеям ва Украіне, магла б стаць палітызаванай "агіткай" на тэму "вайны і міра" ў іх сучасных рэаліях. Але рэжысёр акцэнтуе зусім іншае: сямейныя каштоўнасці і праца — што павінна быць у прыярытэце? Бо менавіта праца — самаахвярная, у літаральным сэнсе на "вынас цела" — забівае Сашу за першым разам (прыступ здарыўся пасля вымовы начальства). І яна ж заб'е яго — у другі, нанова. Жанчыны не згодны перажываць падвойную смерць блізкага чалавека. І яны маюць рацыю. Бо менавіта на іх трымаецца жыццё, пакуль мужчыны рвуцца да доблесцяў, подзвігаў, славы. У такім кантэксце звыклая побытавая фраза, вынесеная ў назву спектакля, таксама набывае метафарычнае значэнне: смецце можа быць і ў галаве… К

Сцэна са спектакля "Саша, вынесі смецце".

Аўдыя & Відэа

ТЭКСТ

Алег КЛІМАЎ, спецыяльны карэспандэнт "К"

Таццяна КУШНЕР, аўтар песень, спявачка, кліпмэйкер

Лютаўскія аўдыя/відэаработы айчынных выканаўцаў рэцэнзуюць аўтар песень, спявачка, кліпмэйкер Таццяна КУШНЕР (А) і спецыяльны карэспандэнт газеты "Культура", музычны крытык Алег КЛІМАЎ (В).

АЎДЫЯ

Alla, міні-альбом "Кава/Мокрыя/Пакаштуй мяне"

А.: Тры кампазіцыі, запісаныя гранічна мінімалістычна і як бы паза часам, толькі голас, фартэпіяна ды трохі камп'ютарных эфектаў. Ці то гэта вынік апрацоўкі, ці то сам вакал такі спецыфічны, але слухача наганяе... кагнітыўны дысананс: дарослыя жаночыя песні выконваюцца нібы голасам з тэлевізійнай... "Калыханкі".

"Эратычна і смела" — так апісваецца мінёён у прэс-рэлізе, што больш характарызуе работы, напрыклад, Мадоны. У Alla песні мяккія ды хатнія, трохі адстароненыя, не дзеля масавай аўдыторыі. Усё вельмі асабіста, любоўна, вытанчана ды на беларускай мове, што парадавала.

А.: На альбомнае вяртанне герояў нулявых гомельскіх вясёлых "металістаў" ніхто не разлічваў. Здаецца, нават самыя гарачыя фанаты расчаравана перанеслі гэты гурт у раздзел "былыя". Праз 12 гадоў пасля выпуску дэбютнага студыйніка, прайшоўшы праз трыумф і страты, каманда выдала другі поўнафарматнік. Да якасці запісу, сыгранасці, "дарослых аранжыровак" пытанняў няма. Дыхтоўна, выразна, "люта". Мяркуючы па ўступленнях да трэкаў "Аэрастаты" і "Я ведаю", гэта цалкам магла б быць новая работа "Tool" або "KoRn".

Музыка ёсць, каманда ёсць. Як прызнаюць і самі музыканты, у новым альбоме адсутнічае галоўная "фішка" калектыву — хуліганскі напор і пірацкі "гумар шыбеннікаў", тое, што і зрабіла "ТТ-34" у свой час з'явай. Пазітыўная цяжкая музыка перастала быць пазітыўнай.

Гэты рэліз мне ўдалося паслухаць "жыўцом" у Мінску. Публіка, так бы мовіць, слэмілася, "адрывалася", як магла. У другім настальгічным аддзяленні на сцэну выйшлі былы фронтмэн Аляксандр Пацёмкін і іншыя знакавыя ўдзельнікі "ТТ-34" мінулых гадоў. З гэтай хвіліны ў зале пачаўся сапраўдны экстаз. Цяперашняму інтэлігентнаму фронтмэну Любаміру Крыжаноўскаму, пры ўсіх яго вартасцях, не хапае бязбашеннай харызмы Пацёмкіна. Склаці бы іх разам!

Што я ўбачыла падчас адроджанага сеансу метал-дыскатэкі? Доўгачаканы рэюніён, "бісоўкі" і шчаслівых барадатых дзецюкоў. Усе ачысціліся. Любоў, радасць, урачыстасць, новая надзея там, дзе яе ўжо не было. Хай так і застанецца: у Беларусі мала паспяховых і верных сабе андэграўндных гуртоў.

В.: Дні суцэльнага ўгарнага балагана, якім "ТТ-34" у пачатку-сярэдзіне 2000-х пабілі сярэднестатыстычнага меламана і ўвялі ў задуменны транс "олдскульных" металхэдаў, мінулі даўно. Не, з канцэртнага рэпертуару "тэтэшнікаў" не зніклі іх адвечныя бавейкі кшталту "Джэк" альбо "Бум!", але з нейкага часу каманда пераарыентавалася на тэксты, так скажам, сацыяльныя ды ўхілу філасофскага. Выйграў бэнд ад гэтага ці прайграў? На мой погляд, мікст арганічны, бо якасць сур'ёзнага слоўнага матэрыялу не саступае раздзяўбайскаму. Але "разначкі" (гэта тычыцца і аранжыровак, і тэкстаў), якімі так здзівілі хлопцы пры сваім старце, мабыць, ужо сатлелі: арыгінальных знаходак у цяперашнім музычным навале — мінімум, а новымі тэкстамі склад цяпер мала чым адрозніваецца ад іншых "надзённых" калег-цяжкавагавікоў. Тыя "ТТ-34" скончылася. Шкада.

Дыск склалі песні, якія публікуюцца ўпершыню, тыя, што ўжо выдаваліся інтэрнэт-сінглямі, ды іх свежыя версіі. Прагназую, што вялікую частку старадаўніх фэнаў гурта работа не расчаруе (для іх ёсць адмысловыя "вішанькі", як, напрыклад, удзел у запісе аднаго з былых фронтмэнаў "ТТ-34" Аляксандра Пацёмкіна). Ці здабудзе ансамбль новых прыхільнікаў? Здабудзе. А чарговы поўнафарматнік выдасць гадоў гэтак... ну праз 10.

ВІДЭА

Гурт "Iowa", кліп на песню "Тры дні холаду"

А.: Шкада, мне не дастаўся на рэцэнзію папярэдні кліп гэтага гурта на песню "Б'е біт", які мяне парадаваў. Дадзеная работа, зрэшты, таксама вельмі якасная.

Досыць простае, вобразнае, мінімалістычнае відэа. Гурт рэпеціруе, дзяўчына перажывае. У "Тытаніку" вочы гераіні служылі для рэжысёра парталам у мінулае. Тут — гэта дзверы ва ўнутраную зіму. У вельмі спакойнай манеры, праз лятаючую камеру, як у фільмах Іньярыту, нас праводзяць туды і назад. Дзе мінус тысяча па Цэльсіі і безаблічныя мужчыны. Страчанасць ды бездапаможнасць, пазбаўленне усякай надзеі. Спадзяюся, пры праглядзе гэтага кліпа ні ў аднаго гледача не ўзмацнілася зімовая дэпрэсія, і што ў песні сапраўды зашыфравана надзея на добры зыход, як сцвярджаюць аўтары.

Не магла не заўважыць, нават наводзіла даведкі, ці не стаў Андрэй Хлывнюк супрацоўнічаць з "Iowa", надта ўжо тэкст ды музыка так падобны да эго "Бумбокса". Можа, проста такі моцны ўплыў гурта?..

В.: Паўнамоцныя прадстаўнікі беларускай папулярнай музыкі ў Расіі пладавітыя далей няма куды. Разнастайныя рэлізы ідуць ад іх адзін за адным, а ў лютым гурт аднаначыўся кліпам. У im вакалістка Кацярына Іванчыкава пакутуе ў дымным тумане; ускудлачаныя кветкі, як разбітае сэрца; мужчынская натура, што знікае; фігуры маладых людзей, сярод якіх няма таго, якога шукае, чакае гераіня песні. Не знойдзе і, напэўна, змерзне, і спевы не выратуюць. Усе памерлі! І кампазіцыя ўся ў міноры, ледзь трывожная і безнадзейная па сэнсе. Так і хочацца падбадзёрыць дзяўчыну: "Ды плюнь ты на яго, Кацюха! Вунь колькі маршрутак вакол і колькі ў іх выдатных хлопцаў — шафёрах ды пасажырах!" Усё ў цябе будзе добра, як у лепшым фільме!"...







І ўсё ж ёсць нейкая

Пра традыцыйную (і не толькі) культуру замоўце слова: з Уладзімірам Пракапцовым па яго родных мясцінах

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Усе яго серыі Пракапцоў паглядзеў акурат там у канцы 1960-х. У ДК, натуральна, працавалі ўсялякія гурткі... Але ні адзін з іх Пракапцоў не наведваў.

— Мне ж ужо 15 — 16 гадоў было, — тлумачыць Уладзімір Іванавіч, — перарос я іх. І хоць, наколькі памятаю, у ДК быў мастацкі гурток, маляваннем я займаўся толькі ў школе, а таксама афармляў насценгазеты.

У Дом культуры Валодзя хадзіў, каб паглядзець на выступы артыстаў мастацкай самадзейнасці, школьнікаў. І нават сам прымаў удзел у конкурсах — спяваў у школьным хоры, хаця свае вакальныя даныя ён ацэньвае сціпла. Праходзілі тут і конкурсы тых самых насценгазет... Праўда, прызавых месцаў яму не дасталося.

— Тагачаснае культурнае жыццё Добруша я ахарактарызаваў бы словам "масавасць", — працягвае Пракапцоў. — З установамі культуры было беднавата, затое ў іх дзейнасць уцягваліся ледзь не ўсе гараджане — ад малога да вялікага. Ну а калі адзначаліся буйныя святы, на тутэйшым востраве нейкім чынам змяшчаўся ці не ўвесь горад.

Добруш, дарэчы, называюць Маленькай Венецыяй. "Вінаватая" ў тым рака Іпуць, якая дзеліць яго на дзве часткі. У цэнтры горада на згаданым Пракапцовым востраве знаходзіцца зона адпачынку, да якой вядзе пешаходны мост. І ў гады маладосці нашага героя, і сёння тут пляцоўка для шматлікіх мерапрыемстваў: балазе з інфраструктурай усё як мае быць.

А інфраструктура РПК натхняе на творчыя здзяйсненні: сем яго калектываў маюць званне "народны", ёсць студыя гуказапісу, а, значыць, і вакальна-інструментальныя ансамблі. На некалькі хвілін мы зазірнулі ў пакой, дзе рэпеціраваў ансамбль ветэранаў "Світанак". Усяго ж у палацы займаецца каля 300 чалавек.

— Працэнтаў на восемдзясят надаем увагу нацыянальнаму мастацтву, упор робіцца на беларускія танцы ды песні, — кажа дырэктар РПК Сяргей Стацкевіч. — А да нашых фірмовых мерапрыемстваў я б аднёс раённы конкурс дзіцячай творчасці "Музычны Алімп", Міжнародны фестываль творчасці для людзей з абмежаванымі магчымасцямі "Мы разам!" ды, вядома, славянскі культурны фестываль "Спасаўскі кірмаш". На месцах адраджаем абрадавыя святы, нават праводзім агляды.

Уладзімір Пракапцоў: з партрэтам мамы ў раённым краязнаўчым музеі і з мамай на падворку роднай хаты.

Да болевых кропак Сяргей Яўгенавіч аднёс тое, што публіка канцэрты заезджых артыстаў стала наведваць з меншым імпэтам.

— Уладзімір Іванавіч казаў пра масавасць, энтузіязм у гады яго маладосці. А ў мяне сэрца радуецца, калі я бачу дзяцей і дарослых, якія ідуць у Палац. Ды ўсё ж ёсць нейкая пасіўнасць…

Таму супрацоўнікам РПК даводзіцца прыкласці намаганні, каб пераканаць людзей, што свет не абмяжоўваецца працай і домам, што ён стане для іх нашмат ярчэйшым, багацейшым ды шырэйшым, калі яны знойдуць час, каб рэалізаваць нейкія творчыя схільнасці.

З Палаца культуры мы перамясціліся ў Раённы цэнтр дадатковай адукацыі, у будынку якога калісьці размяшчалася школа № 2. Яго служачыя бегла азнаёмілі Уладзіміра Іванавіча з навучальным працэсам. Не пакінуў мастак без прыемнага сюрпрызу і гэту ўстанову, падарыўшы некалькі выданняў, звязаных з выяўленчым мастацтвам.

Памятаць пра людзей

Па дарозе ў Жгунскую Буду пытаюся ў Пракапцова:

— Уладзімір Іванавіч, вы любілі хадзіць у кіно, спявалі, але выбралі шлях мастака. Чаму так адбылося? Той жа музыкант, гарманіст, пэўна ж лічыўся першым хлопцам на вёсцы?..

— Неяк наш сусед, аграном, падарыў маім бацькам таўшчэзныя выданні, у якіх распавядалася і пра расліны, выведзеныя Мічурыным. І такія там былі прыгожыя ілюстрацыі — маляваныя грушы, яблыкі. На мяне тая садавіна зрабіла наймагутнае ўражанне, і я... пачаў яе перамалёўваць. А чаму не музыкантам? Па-першае, пры вясковым клубе не было ніякіх гурткоў, а гэта значыць, навучыцца граць не змог бы. Па-другое, вёска ўяўляла з сябе стараверскі арэал. Адпаведна, гэта была ў некаторай ступені закрытая ў сабе супольнасць людзей, са сваімі традыцыямі, святамі, паводзінамі ў побыце.

Жгунабудская сельская бібліятэка.

Але, вядома, не толькі ўплыў садавіны ад Мічурына прывёў Валодзю да выяўленчага мастацтва. Спрыялі таму і спрыяльныя варункі: родны дом, прырода, пахі лета і зімы, пералётныя птушкі, ранішняя дымка, далёкае ды блізкае неба. Няспешнасць, грунтоўнасць наваколля ды ўсведамленне ўжо з юных гадоў таго, што людзі жывуць толькі аднойчы і што гармонія — вось яна, перад вачыма. Напэўна, неяк так.

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Свіслач /

Падарожжа ў Кнігаград

Свіслацкая дзіцячая бібліятэка — гучнагалосае месца, дзе дзеці не толькі чытаюць, але і абмяркоўваюць прачытанае, удзельнічаюць у тэатралізаваных пастаноўках паводле вядомых твораў. І каб юным чытачам хацелася зноў прыходзіць сюды, каб ім было тут утульна, цікава, камфортна, бібліятэкары заўсёды знаходзяцца ў пошуку.

Майстар-клас па маляванцы ад Святланы Скавырка.

Падчас выступлення лялечнага тэатра кнігі "Кніжынка".

Выступае Яўген Лук'янчык.

Не першы год пры бібліятэцы працуе лялечны тэатр кнігі "Кніжынка", гаспадыняй якога з'яўляецца саламяная беларуская лялька з такім самым імем. Змястоўныя і павучальныя тэатралізаваныя пастаноўкі знаёмяць з сюжэтам і літаратурнымі героямі, "ажыўляюць кнігу". Інсцыніраваныя дзеі па творчасці беларускіх пісьменнікаў Уладзіміра Караткевіча, Васіля Віткі, Уладзіміра Мазго, Міхася Пазнякова, тэматычныя прадстаўленні "Мне з сябрамі добра жыць", "За здароўем у Трыдзявятае царства" з'явіліся яскравым дадаткам да раённых і гарадскіх святаў.

Традыцыйна супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі арганізоўваюць экскурсію-прысвячэнне ў чытачы. Каб першая сустрэча дзятвы стала незабыўнай, падарожжа ў Кнігаград праходзіць з удзелам літаратурных персанажаў лялечнага тэатра. Першакласнікаў сёлета сустрэлі дапытлівы Фунцік і цікаўная Дзюдзюка, якія разам з дзецьмі захацелі стаць чытачамі, ды не ведалі, як ім гэта зрабіць. Спектакль "Экскурсія ў Кніжны горад" дапамог юным чытачам разам з лялечнымі героямі здзейсніць займальную вандроўку і паўдзельнічаць у конкурсе "Казка Дзюдзюкі". Ну а Кніжынка пазнаёміла дзяцей з цікавымі фактамі са старажытнай гісторыі бібліятэкі.

Па завяршэнні экскурсіі 101 школьнік горада атрымаў "Памятку юнага чытача". Супрацоўнікі бібліятэкі выказалі надзею, што пасля гэтай сустрэчы ў кніжак стане значна больш маленькіх сяброў.

Алена РАБЧАНКА,
метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Свіслацкай раённай бібліятэкі

Глыбоччына /

Фарбы талентаў

"Палітра талентаў" — пад такой назвай у Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці працуе выстава народнага клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў "Крыніца" Глыбоцкага цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці.

Гісторыя клуба пачынаецца з 1986 года. І ўвесь гэты час насычаны падзеямі: выставамі і святамі. Майстры неаднаразова станавіліся дыпламантамі абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. А ў 2014 годзе традыцыйнае мастацтва маляваных дываноў Віцебскага Паазер'я — тая самая глыбоцкая маляванка — атрымала статус гісторыка-культурнай каштоўнасці краіны. Дарэчы, на адкрыцці выставы майстар Святлана Скавырка для ўсіх прысутных правяла майстар-клас па маляванцы.

Гледачам прадстаўлены керамічныя цацкі і сувеніры, выцінанка, вырабы з лазы і саломкі, лялькі-тыльды, пано з воўны, роспіс па дрэве, ручнікі і вышыўка. Нездарма дэвіз клуба — "Прыгожае нараджае добрае".

Надзея УЛІНОВІЧ,
вядучы метадыст Віцебскага АМЦНТ

Брэст /

Канцэрт у цытадэлі

Сваё майстэрства выканання сімфанічных твораў прадэманстраваў на канцэртнай пляцоўцы музея Брэсцкай крэпасці лаўрэат міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў Яўген Лук'янчык.

31-гадовы ураджэнец Бярозы паспеў пабываць з канцэртамі ў многіх еўрапейскіх краінах, выхаваць таленавітых маленькіх артыстаў.

Канцэрт прыцягнуў брэстчан яшчэ і тым, што мерапрыемства адбылося ў зале музея, дзе ў гэтыя дні экспанавалася выстава "Горад нашай памяці" з твораў вядомых мастакоў абласнога цэнтра, што захоўваюць фонды Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея.

Мікола ПАНАСЮК
Фота Святланы САСОННАЙ

пасіўнасць...

Вось і Жгунская Буда. Яна некалі славілася майстрамі, што вышывалі накідкі для падушак, посцілкі, фіранкі. Прычым вышывалі для сябе, не на продаж. Па вёсцы хадзілі мастакі з маляванымі на дыванах-цыратах лебедзямі на сажалцы і русалкамі — інтымная ды наіўная творчасць. Ганчары рабілі збаны для малака, адмыслоўцы плялі кошыкі.

— Сёння ўсё гэта ў вёсках практычна знікла — як нешта штодзённае ды натуральнае, для душы, — разважае Пракапцоў. — Зараз гэтым займаюцца ў цэнтрах рамёстваў, на платнай аснове, як правіла. Добра, што рамёствы, промыслы падтрымліваюць такім чынам, але ёсць у мяне асцярога, што камерцыялізацыя ў такім кантэксце традыцыйнай культуры можа ёй нашкодзіць. Далёка не ўсе бацькі могуць дазволіць сабе аплачваць захапленні дзяцей. Можа, патрэбна адмысловая праграма, якая закранае сферу народнай культуры, накіраваная на яе захаванне ды развіццё і фундаваная дзяржавай? Нацыянальная культура — гэта тое, што вылучае адну краіну ад іншай, што дазваляе ідэнтыфікаваць сябе народу. Мае ён патрэбу ў самаідэнтыфікацыі? Несумненна. Ва ўмовах глабалізацыі адной датычнасці да чагосьці недастаткова, каб, акрамя матэрыяльнага насычэння, быць яшчэ і духоўна напоўненым. І вось бы ўсю захопленасць вышыванкамі распаўсюдзіць на народнае мастацтва ў цэлым!

На жаль, з-за хваробы бібліятэкара ў Жгунабудскую сельскую бібліятэку мы патрапіць не змаглі. Зрэшты, менавіта ў гэты будынак юны Валодзя па літаратуру не завітваў: у гады яго дзяцінства і малалецтва ўстанова размяшчалася ў іншым месцы, пазней пераехаўшы ў памяшканне Дома вольнага часу, а ў 2014-м "выцесніўшы" той: у ходзе аптымізацыі клубную працу ў жгунскім арэале акумуляваў у сабе клуб у аграгарадку "Жгунь".

Тым не менш, без іншага культурнага жыцця Жгунская Буда не засталася: яго пастаўляе ў вёску аўтаклуб, што мінімум 2 разы на месяц прывозіць з канцэртнымі нумарамі артыстаў з Жгунскага сельскага дома культуры, Добрушскага раённага палаца культуры.

Сякую-такую інфармацыю пра бібліятэку я ўсё ж атрымаў з вуснаў Аляксандра Агеева, намесніка начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Добрушскага райвыканкама. У бібліятэцы зарэгістравана 290 чытачоў (Жгунская Буда без уліку дачнікаў, якія пражываюць у прылеглых да яе пасёлках, налічвае 430 чалавек; а дачнікаў, дарэчы, таксама абслугоўваюць), з іх ва ўзросце да 15 гадоў — 55, ад 15-ці да 24-х — 25. Кнігавыдача за мінулы год склала 8000 асобнікаў (1657 — творы беларускіх аўтараў, часопісы ды газеты на беларускай мове; з жанраў перавага аддаецца фантастыцы, дэтэктывам, любоўным раманам, сучаснай прозе); наведванне — 3200 чалавек. Пры ўстанове функцыянуе аматарскае аб'яднанне "Скарбонка ўласных фантазій" — клуб эстэтычнага выхавання, дзе займаюцца дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам. А вечарамі ў бібліятэцы часам збіраюцца людзі пенсійнага веку — пагутарыць "за жыццё", папіць гарбаты, паспяваць песні.

— Калі казаць пра праблемы, то галоўная сярод іх — абнаўленне фондаў, — дзеліцца Аляксандр Уладзіміравіч. — Гэта тычыцца і дадзенай бібліятэкі, і іншых сельскіх кніжніц раёна. Сродкаў на закупкі новай, сучаснай літаратуры не стае. Другая праблема заключаецца ў тым, што моладзь сёння завабіць у такія ўстановы вельмі цяжка: асноўная яе частка аддае перавагу электроннай, а не папяровай літаратуры, і на "пернікі" ў выглядзе акцый, скіраваных на папулярызацыю бібліятэк, яна рэагуе вяла.

За 5 гадоў на Добрушчыне аптымізавана 11 бібліятэк. "Але пра людзей мы не забыліся, — адразу дадае Агееў. — Населеныя пункты, колькасць жыхароў у якіх не перавышае 250 чалавек, абслугоўвае бібліобус, што двойчы на тыдзень развозіць па раёне літаратуру. Бібліятэкі, якія працуюць у 11 аграгарадках, камп'ютарызаваны ды падлучаныя да Інтэрнэту. На 90 % камп'ютарызаваны іншыя сельскія бібліятэкі, і ва ўсіх іх таксама маецца доступ да Сеціва.

Матэрыяльна-тэхнічнай базе "сваіх" бібліятэк па 5-бальнай шкале спадар Агееў выставіў моцную "чацвёрку". (Звонку Жгунабудскую я б ацаніў на «чатыры з плюсам" — будынак выглядаў самавіта, моцна.) На кадравы голад Аляксандр Уладзіміравіч не скардзіцца, абагульніўшы, што ва ўстановах культуры Добрушскага раёна збольшага працуюць тутэйшыя выхадцы, якія вярнуліся на радзіму пасля заканчэння профільных навучальных устаноў. Радуе яго і тое, што немалы адсотак такіх работнікаў складаюць людзі маладога і сярэдняга веку.

— Уладзімір Іванавіч, а вы ў маладыя гады кнігачэм былі? — цікаўлюся я ў свайго спадарожніка, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

— Так, і пах тых кніг памятаю да гэтага часу, — прызнаецца Пракапцоў. — Памятаю, як у класе сёмым праходзілі "Як гартавалася сталь" Мікалая Астроўскага. Раман гэты было не дастаць. А ў доме сяброўкі мамы, у вёсцы Ларышчава, ён на этажэрцы стаяў. І я марозным, прыгожым надвячоркам пайшоў папрасіць пачытаць кнігу, вярнуўся позна ўжо, замёрз. Потым гэтая кніга ад мяне перайшла да кагосьці яшчэ з вучняў, яшчэ і яшчэ, пакуль да дзюр яе ні зачыталі! Любоў да чытання тады была велізарная.

А ў клубе Пракапцоў, бывала, у выхадныя адседжваў два кінасеансы — дзённы ды вячэрні. Тут рэгулярна выступалі школьнікі — спявалі, танцавалі, Валодзя ж чытаў вершы. Пра тагачасную самадзейную творчасць ён кажа як аб натуральным і арганічным, у параўнанні з тым, як сёння бацькі сілай адрываюць сваіх дзяцей ад камп'ютараў і настойліва рэкамендуюць ім зазірнуць у бліжэйшы дом культуры...

Уладзімір Іванавіч паказвае мне тую самую васьмігодку, дакладней, тое, што ад яе засталося: школы ў вёсцы цяпер няма. Прыводзіць да роднага дому, знаёміць са сваёй мамай, 89-гадовай Марыяй Андрэеўнай. Узнімаецца моцны вецер, і можа, праз тое ў яго на вачах і з'яўляецца вільгаць. А мо з якой іншай прычыны...

Доўгая дарога дадому

Скрозь снежную завею мы з Уладзімірам Пракапцовым вяртаемся ў Гомель па работы Сяргея Парцянкова і ўсё гутарым ды гутарым пра беларускую культуру. Пра тое, што людзей неабходна ўцягваць у яе, а не, спасылаючыся на аб'ектыўныя прычыны, разводзіць рукамі, маўляў, не хочуць студэнты навучацца фалькларыстыцы з этнаграфіяй. Што беларуская мова мае патрэбу ў папулярызацыі. Едзем, дыскутуючы пра магчымасць выкладання ў школе рэлігіі, у тым ліку як формы культуры. Уладзімір Іванавіч, адцягваючыся ад размовы, перыядычна пільна ўзіраецца ў акно мінівэна на хмурныя краявіды. Магчыма, мяркую я, задумвае новую карціну. Што на ёй будзе?..

Фота аўтара

У палацы культуры (злева — дырэктар Сяргей Стацкевіч).

Рэпеціруе ансамбль ветэранаў "Світанак".

Дзень праваслаўнай кнігі ў сценах дзіцячай бібліятэкі.

Падчас мерапрыемства "Духоўная кніга — дзецям".

Пухавічы / "Пакуль жыве бібліятэка..."

Творчы калектыў Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі арганізаваў змястоўную кніжную экспазіцыю "Культурная спадчына Беларусі. 2016 год — Год культуры ў Рэспубліцы Беларусь". Яна дзейнічае ў чытальнай зале ўстановы.

Увазе карыстальнікаў прадстаўлены самыя лепшыя выданні з фондаў бібліятэкі, прысвечаныя беларускай літаратуры, выяўленчаму мастацтву, архітэктуры, музыцы, тэатру, кінематографу.

Да кожнага раздзела падабраны адпаведныя цытаты вядомых людзей. Звяртаюць на сябе ўвагу творы, прысвечаныя нашаму земляку, кампазітару, старшыні Беларускага саюза кампазітараў, народнаму артысту Беларусі, народнаму артысту СССР Ігару Лучанку: кніга Уладзіміра Ліпскага "Ігар Лучанок. Мелодыя душы" з аўтографам і электроннае выданне, аднайменны дакументальны фільм. Вылучаецца серыя кніг "ЖЗЛБ", прысвечаных Янку Купалу, Якубу Коласу, Максіму Багдановічу, Івану Шамякіну, Уладзіміру Караткевічу…

Цэнтральнае месца займае раздзел, назвай да якога сталі словы акадэміка Дзмітрыя Ліхачова: "Пакуль жыве бібліятэка — жыве народ, памрэ яна — памрэ наша мінулае і будучыня". Тут карыстальнікі маюць магчымасць пазнаёміцца з выданнямі, прысвечанымі гісторыі бібліятэк Беларусі, а таксама — матэрыяламі аб гэтых установах на Пухавіччыне.

У дадатак да кожнага раздзела выставы распрацавана серыя буклетаў. Выставу ўдала дапаўняюць дэкаратыўныя вырабы, а таксама электронныя выданні з фондаў бібліятэкі.

Ала АНДРОСАВА,
метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу

Светлагорск / Дарога да Храма

У сценах дзіцячай бібліятэкі Кастрычніцкага мікрараёна Светлагорска намаганнямі настаяцеля Храма Успенне Прасвятой Багародзіцы і супрацоўнікаў установы праведзены Дзень праваслаўнай кнігі.

У бібліятэцы былі афармлены вялікія кніжныя выставы-прагляды: "На пачатку было Слова", "Чытаю кнігу — расту духоўна", "Праваслаўная кніга — дарога да Храма", "Духоўнай кнігі благадаць", "Святло пад кніжнай вокладкай", прэзентаваны "Духоўная медыятэка" і рэклама праваслаўнай перыёдыкі.

Бібліятэкары распрацавалі змястоўную праграму мерапрыемстваў, разлічаных на розныя ўзроставыя групы наведвальнікаў: так, напрыклад, вучні 9-х класаў знаёміліся з Бібліяй. Слухачы духоўнага лекторыя "Дабравест", вучні 6 — 7 класаў СШ №4, сабраліся на пасяджэнне, прысвечанае жыццю і духоўнай творчасці Міхаіла Ламаносава.

Чытачы дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту былі запрошаны ў медыя-падарожжа і на медыяўрок "Добрае слова". Вучні трэціх класаў прыйшлі на прэзентацыю кніг Барыса Ганагі і паглядзелі буктрэйлер. Скончыўся Дзень праваслаўнай кнігі гадзінай духоўнай культуры "Кніга і музыка — выхаванне душы", дзе слухачы нядзельнай школы Храма Святога Кірылы Тураўскага паказалі гледачам, вучням малодшых класаў школ № 4 і 6, прадстаўленне пра Васіля Блажэннага, а навучэнцы школы мастацтваў выканалі некалькі духоўных інструментальных твораў.

Мерапрыемствы Дня праваслаўнай кнігі наведалі каля 250 дашкалят і навучэнцаў 1 — 9 класаў.

Вольга КЛІМЯНОК,
загадчык дзіцячай бібліятэкі-філіяла №6 Светлагорскай РЦБС

Ашмяны / Пра дабро і міласэрнасць

Духоўнае выхаванне дзяцей і падлеткаў у раённай дзіцячай бібліятэцы вядзецца ў рамках раённай бібліятэчнай праграмы "Праз бібліятэку ў свет міласэрнасці, духоўнасці і веры". Рабоце ў гэтым кірунку спрыяе сувязь бібліятэкі з духоўна-асветніцкім цэнтрам храма Уваскрэсення Хрыстова.

Разам ладзяцца сустрэчы, урокі духоўнасці, "круглыя сталы", канферэнцыі. Да прыкладу, прайшло мерапрыемства "Духоўная кніга — дзецям". Вядучыя распавялі пра ўзнікненне праваслаўнай кнігі і падрыхтавалі відэапрэзентацыю.

У час мерапрыемства адбылася сустрэча чытачоў з настаяцелем згаданага храма Пятром Пятлёхай і служыцельніцай духоўна-асветніцкага цэнтра Наталляй Сямёнавай. Айцец Пётр звярнуў увагу дзяцей на неабходнасць чытання духоўных кніг, бо яны вучаць дабру і міласэрнасці. Наталля Сямёнава пазнаёміла дзяцей з сучаснымі праваслаўнымі выданнямі. Святар, як и заўсёды, перадаў у дар бібліятэцы літаратуру і ўзнагародзіў актыўных чытачоў кнігамі.

Гелена ГАРДЗЕЙ,
загадчык Раённай дзіцячай бібліятэкі г.Ашмяны

Хто дыктуе моду на кнігу?

Аддзел камплектавання бібліятэкі: незаўважны і неабходны

Гэтым разам "К" пагутарыла з тымі і пра тых, хто сапраўды застаецца ў ценю праз спецыфіку прафесіі. Аддзел камплектавання — найлепшы прыклад таго, як, здавалася б, нябачная дзейнасць становіцца трывалым падмуркам для магутнай кніжнай сістэмы. Дапамагла разабрацца з "кухняй" камплектавання Вольга ГІЛЬ — загадчык вышэйзгаданага аддзела Мінскай абласной бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна.

Аліна САЎЧАНКА

— Асноўная наша функцыя — гэта камплектаванне бібліятэчнага фонду Мінскай абласной бібліятэкі рознымі відамі дакументаў на разнастайных носьбітах згодна з патрэбамі чытачоў. Акрамя гэтага, мы займаемся улікам дакументаў. Таксама знаёмімся з навінкамі, але, у асноўным, працуем па адной і той жа схеме, выконваем адны і тыя ж дзеянні, і з чытачамі непасрэдных кантактаў не маем. Хаця былі выпадкі, калі да нас прыходзілі карыстальнікі бібліятэкі з просьбай набыць тую ці іншую кнігу. Але часцей да нас звяртаецца з такімі пытаннямі загадчык пэўнага аддзела ўстановы. Таксама мы афармляем падпіску на перыядычныя выданні. Зноў жа праз наш аддзел праходзіць спісанне літаратуры, выключэнне дакументаў з фонду.

Калі ў Нацыянальнай бібліятэцы аддзел камплектавання падзяляецца на спецыялізаваныя пададдзелы, то мы адказваем за ўсе паступленні. Ствараюць бібліяграфічнае апісанне дакумента, сістэматызуюць літаратуру згодна стандарту ў аддзеле апрацоўкі літаратуры і арганізацыі каталогаў. Калі ж параўноўваць абласную ўстанову з раённымі бібліятэкамі, дык там аддзелы камплектавання займаюцца і набыццём літаратуры, і апрацоўкай.

— Як вы лічыце, ці патрэбен агульны аддзел камплектавання ў маштабе дзяржавы?

— Не, у гэтым няма асаблівай патрэбы. У Нацыянальную кніжную палату ўсе выдавецтвы, прыватныя і дзяржаўныя, дасылаюць абавязковыя асобнікі са свайго накладу, спецыялісты іх рэгіструюць і ўключаюць у сістэму дзяржаўных бібліяграфічных паказальнікаў.

— У такім выпадку, ці маюць супрацоўнікі аддзелаў камплектавання Беларусі кантакты паміж сабой?

— Як правіла, у межах вобласці. Паколькі мы Мінская абласная бібліятэка, то выступаем у якасці метадычнага і каардынацыйнага цэнтра для калег з усяго рэгіёна. Публічным бібліятэкам Міншчыны аказваем дапамогу ў пытаннях камплектавання і метадалогіі: улік, захаванасць, рэгістрацыя дакументаў.

— Кантэнт вашай бібліятэкі і любой з раённых у вобласці моцна адрозніваецца?

— Наш фонд — больш універсальны, а ў іх яны арыентаваныя на зону мясцовага абслугоўвання, на свайго жыхара. Сельскія бібліятэкі таксама адрозніваюцца — складам і велічынёй фонда. Кожная кніжніца мае індывідуальную сітуацыю. Напрыклад, калі параўноўваць аб'ём бібліятэчных фондаў (а ў Пушкінскай больш за 670 тысяч адзінак), то прыблізна такі ж фонд у сістэме публічных бібліятэк Маладзечанскага раёна. Але, у асноўным, па колькасці назваў у нас будзе больш дакументаў, таму што фізічна мы маем адну бібліятэку, а па колькасці асобнікаў — наадварот. Калі мы для сябе набываем адно найменне кнігі ў 2 — 3 асобніках, то раёны бяруць 5 — 10 для сваіх філіялаў.

— Як праходзіць сам працэс камплектавання, пачынаючы ад імпульсу "патрэбна пэўная кніга ці дакумент"?

— Як правіла, усе навінкі, у прыватнасці, расійскага рынку, адсочваем самі. Калі нешта выйшла, робім заказ у кнігагандлёвую арганізацыю, нам афармляюць дагавор і рахунак, усё гэта ідзе на аплату ў казначэйства, пасля аплаты тавар прывозяць па накладных. Потым мы ажыццяўляем рэгістрацыю і апрацоўку дакументаў згодна з "Інструкцыяй па ўліку і захаванасці бібліятэчных фондаў у Рэспубліцы Беларусь". Іншым разам самі з загадчыкамі аддзелаў ходзім на прагляд літаратуры. Што тычыцца беларускіх выдавецтваў, то яны, як правіла, дасылаюць прайс-ліст, а мы апрацоўваем яго кантэнт. Хацелася б, каб кнігі навінкі выходзілі часцей, а выдавецтвы асаблівую ўвагу звярнулі на стварэнне навукова-папулярнай літаратуры для дзяцей. Скажам, у мінулы раз мы апрацоўвалі прайс выдавецтва "Мастацкая літаратура" ў лістападзе 2015 года, пасля гэтага ў іх выйшла ў свет каля 40 кніжных навінак. З адметнасцяў маем аддзел краязнаўчай літаратуры, які з'яўляецца дэпазітарыем захоўвання менавіта дакументаў пра Мінскую вобласць. Супрацоўнікі дадзенага аддзела рэгулярна звяртаюцца да нас з просьбай набыць літаратуру такога кірунку, якая выйшла малымі тыражамі. У гэтым выпадку мы замаўляем неабходныя выданні ў пэўнай кніжнай краме ці выдавецтве.

— То бок кнігі расійскіх выдавецтваў карыстаюцца большай папулярнасцю?

— Прынамсі мастацкія творы, бо беларускія выдавецтвы прапаноўваюць, у асноўным, айчынную літаратуру, а расійскія — сваю і замежную.

— Падаецца, танней было б самім друкаваць творы замежнікаў?

— Дзесьці на гэтыя працэсы паўплываў крызіс. Фактычна, кошт кніг аднолькавы.

— Для вас прынцыпова, якую кнігу набыць: Бродскага, надрукаванага ў Расіі альбо ў нас?

— Мы будзем глядзець, дзе танней. Калі яна беларуская і каштуе менш, набудзем яе тут.

— А калі ў расійскага выдання лепшая якасць паперы ці яшчэ якая вартасць відавочна выйграе?

— Як у расійскіх, так і ў беларускіх выданнях якасць паперы фактычна аднолькавая. У асноўным мы звяртаем увагу на пераплёт кнігі (цвёрды ці мяккі) і фармат.

— Ці абмяжоўваюць вас па цэнах?

— Не. Мы возьмем нават вельмі дарагую кнігу, калі яна сапраўды патрэбная ў фондзе, нават у некалькіх асобніках.

— А як вызначаецца, што яна сапраўды патрэбная?

— Тут мы глядзім анатацыю, змест. І ўлічваем попыт. Калі карыстальнікі бібліятэкі сапраўды пра кнігу пытаюцца, то факт набыцця нават не будзе абмяркоўвацца.

— Ці былі ў вас выпадкі, калі дакумент было знайсці складана?

— Такія выпадкі здараюцца, калі, напрыклад, прыходзяць запыты на вельмі старыя выданні: галіновую і навукова-папулярную літаратуру, якой, на жаль, няма ў фондзе і яна не перавыдавалася.

— А што зараз асабліва цікава людзям?

— Мы праводзім аналіз чытацкага попыту. Глядзім па кнігавыдачы, сочым, што карыстаецца асаблівай папулярнасцю, і прыблізна такой тэматыкі кнігі і набываем. З апошняга — Харпер Лі. Існуе тэндэнцыя, якую ўмоўна называюць, як толькі — дык адразу (маецца на ўвазе скон аўтара). Альбо Алексіевіч "прагрымела" з Нобелеўскай прэміяй — і на яе попыт пайшоў неверагодны. Але асобнікаў нам хапіла. Ёсць яшчэ прыкмета: людзі прыходзяць па кнігу пасля якаснай экранізацыі. Так масава перачытваўся і Фіцджэральд, і Булгакаў. Зараз моду вельмі ўпэўнена дыктуюць інтэрнэт-рэйтынгі. А са шматгадовых назіранняў нічога асаблівага вылучыць нельга, бо выбар кнігі залежыць ад густу канкрэтнага чытача. Калі чалавек чытае Данцову ці Марыніну, то і будзе іх выбіраць далей. Дарэчы, зараз жаночыя раманы і дэтэктывы фармату покет-бук сталі значна больш прыстойнымі.

— Ці можна ўсё ж такі вам як супрацоўнікам аддзела камплектавання паўплываць на развіццё і выхаванне літаратурнага густу ў чытача?

— Наўрад ці. Гэтым трэба пачынаць займацца значна раней. Мы ўжо ніякага ўплыву не маем, бо з'яўляемся надта позняй інстанцыяй у жыцці дарослага чалавека. Такімі пытаннямі трэба займацца з дзяцінства.

— А прынцыпова не закупаць нізкапробную літаратуру вы можаце?

— Тэарэтычна можам і не закупаць, а з іншага боку — менавіта так страцім вялікі працэнт сваіх наведвальнікаў. Унутрана часам мы не згодныя з чытачом, але ён заўсёды мае рацыю, бо бібліятэка — гэта сфера паслуг, і супрацоўнікі абавязаны задаволіць попыт кожнага. Згодна з законам Рэспублікі Беларусь "Аб бібліятэчнай справе", адной з асноўных задач бібліятэкі з'яўляецца забеспячэнне бібліятэчнага, інфармацыйнага і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк з улікам іх патрэб.

— Раскажыце, якую літаратуру вы спісваеце і што з ёй адбываецца?

— Мы спісваем на макулатуру дакументы, што састарэлі фізічна або па змесце. Гэта тычыцца, напрыклад, галіновай літаратуры, бо прагрэс не стаіць на месцы, асабліва ў галіне праграмавання. Перыёдыку таксама спісваем па заканчэнні тэрміну захоўвання. Пераўлік фонду мы робім рэгулярна, але выключаем не так шмат. Наш бібліятэчны фонд налічвае 678 тысяч асобнікаў разнастайных відаў дакументаў — кніг, перыёдыкі, электронных і аўдыявізуальных узораў, карт, нот. У мінулым годзе паступіла 11 тысяч адзінак, спісалі мы 16 тысяч менавіта за кошт перыёдыкі.

— Ці адчуваеце выпрабаванні ў сваёй нялёгкай і важнай рабоце?

— Бывае. Часам узнікаюць пытанні юрыдычнага і бухгалтарскага характару. Фінансуюць камплектаванне фонду бібліятэк у адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта краіны не менш як на 15% ад сумы, прызначанай для ўсёй установы. Згодна вылучаным сродкам мы стараемся якасна і паўнавартасна камплектаваць фонд.

К

ЭСТОНІЯ

Сталічная галерэя "Універсітэт культуры" вядомая як арт-пляцоўка, дзе звычайна дэманструецца перспектыўнае мастацтва — маладзёжнае альбо эксперыментальнае. Звыклымі для наведвальнікаў галерэі сталі экспазіцыі работ навучэнцаў мастацкіх каледжаў і студэнтаў мастацкіх ВНУ Беларусі і сумежных краін, а таксама сталых творцаў, што шчыруюць у кірунках і стылях, якія ў беларускай культурнай прасторы трактуюцца як не надта ўласцівыя. Нядаўна ў галерэі адбылася выстава сучаснай эстонскай графікі "Miniprint Tallinn". Гэта культурная акцыя, прэзентацыя якой адбылася ў 2011 годзе, мае, як мне падаецца, папулярызатарскі чыннік.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

"Miniprint…" не першы год гастралюе па блізкім для Эстоніі замежжы. Пазалетась яна экспанавалася ў Пскове, у 2015-м — у Маскве. Нагадаю, што ў Савецкім Саюзе да эстонскай школы графікі ставіліся з павагай і, дадам — з пэўнай доляй зайздрасці. Справа ў тым, што краіны Балтыі ўвогуле і Эстонія ў прыватнасці былі заходняй вітрынай СССР, тамтэйшым творцам дазвалялася пэўная разняволенасць. Гэтай акалічнасцю эстонцы карысталіся напоўніцу, каб прадэманстраваць сваю псіхалагічную адасобленасць і, калі хочаце,

Паралелі

Цэнтр візуальных і выканальніцкіх мастацтваў "АРТ Карпарэйшн" усё больш упэўнена дакранаецца і да такога ў многіх сэнсах "нябачнага" віду мастацтва, як музыка, намагаючыся зрабіць яе больш "візуальнай" і заўважнай у культурнай прасторы. Адметныя музычныя праекты дэманстраваліся на фестывалях "ТэАРТ", "Лістапад". А цяпер у кінатэатрах ладзяцца трансляцыі лепшых спектакляў свету — драматычных, балетных, оперных. Сярод апошніх — нашумелы моцартаўскі "Дон Жуан" з Пярмі, па некалькіх намінацыях вылучаны на расійскую Нацыянальную тэатральную прэмію "Залатая маска".

Надзея БУНЦЭВІЧ

Гледачоў было малавата — у поўнай адпаведнасці з шырынёй распаўсюджвання інфармацыі пра гэту падзею (асабіста я даведалася пра трансляцыю ўсяго за некалькі гадзін да пачатку і пачала ліхаманкава перакройваць планы на вечар пятніцы). Як і дзе анансавалася тая кінат-

Далягляды мініпрынту

хутарскую ментальнасць, якую яны супрацьпастаўлялі ўніфікацыі, увасобленай у сацыялістычным рэалізме. Такім чынам баранілі ў гэтай рэспубліцы сваю нацыянальную тоеснасць. І, прычым, даволі паспяхова. Так што паважаць іх насамрэч было за што. Падобна на тое, што сёння Эстонія хоча аднавіць на постсавецкай прасторы сваю славу савецкай пары.

Мінская экспазіцыя складаецца са 107 твораў 44 аўтараў. У асноўным гэта графічныя мініяцюры памерам 35 на 30 сантыметраў. Але ёсць і аркушы вялікага памеру. Іх, каб пазбегнуць дысананса, які візуальна "заб'е" мініпрынты, не развесілі па сценах, а расклалі гарызантальна ў шкляных вітрынах. У кантэксце выставы вялікія аркушы ўспрымаюцца як выніковая мэта, дзеля якой мастакі і ладзяць на малых фарматах эксперыменты з фактурамі, формамі і фарбамі. Цікавая экспазіцыя найперш для тых, хто займаецца друкаванай графікай прафесійна. У залах галерэі падчас работы выставы можна было б нават праводзіць лекцыі для студэнтаў мастацкіх ВНУ на тэму тэхналогій эстампа, традыцыйных і новых. Бо праект насамрэч успрымаецца як прэзентацыя выразных магчымасцей і тэхнічнага патэнцыялу мастацкага друку.

Але, зразумела, гэта не адзіная іпастась дадзенай імпрэзы. Часам хапае эпізоду, фрагменту, каб мець уяўленне пра з'яву ці тэндэнцыю. Гэта выстава, на маю думку, і ёсць такі фрагмент, у якім адбіўся далягляд немалой культурнай прасторы. Тэхнічныя практыкаванні эстонскіх графікаў, якія мы бачылі ў экспазіцыі, наўрад ці можна лічыць паўнавартаснымі творамі. Мабыць, невыпадкова яны групуюцца ў тэматычныя нізкі, бо паасобку аркушам не стае змястоўнасці. Па іх, аднак, відаць, што суб'ектывізм, шматсэнсоўнасць, мудрагельства і рэфлексіўнасць застаюцца важнымі чыннікамі ў творчасці эстонскіх мастакоў. Яшчэ я дадаў бы падкрэсленую скіраванасць на модныя эстэтычныя трэнды. Усё гэта памятна з савецкіх часоў. Можна зрабіць выснову, што прынцыповых, канцэптуальных змен за часы незалежнасці ў гэтым сегменце мастацтва не адбылося; што ў эстонскім мастацтве дамінуе плынь, якая акрэслілася яшчэ ў 1970 гадах. Тады гэта быў знак адметнасці, раскручаны брэнд, свайго роду "фірменны стыль". Сёння ж у лепшым выпадку — настальгічнае рэтра. Прытым, што сумаваць па СССР у Балтыі не прынята.



Мар'е Юксіне. "Уздымаецца" (зверху). Леў Васільеў. "Хутар".

Вось я і думаю: гэта праява інерцыі мыслення, альбо напрацоўкі савецкай эпохі так глыбока ўкараніліся ў свядомасць эстонцаў, што сталі для іх знакам нацыянальнага менталітэту і пазачасовай рэчаіснасці? Я, магчыма, памыляюся, але мне падаецца, што арганізатары выставы не ўлічылі тую акалічнасць, што за апошнюю чвэрць стагоддзя мусіла змяніцца не толькі Эстонія, але і ўся прастора, якую, згодна завядзёнцы, усё яшчэ называюць постсавецкай. Таго, што можна было пабачыць на выставе, сёння і ў нас багата. Прычым брэндам ці трэндам яно не лічыцца.

Яшчэ з прагляду эстонскай выставы можна зрабіць выснову, што і ў нашым мастацтве, і ў мастацтве нашых бліжэйшых суседзяў адбіваюцца акалічнасці спантаннага пошуку сваёй дзялянкі ў глабальнай прасторы, віртуальнай і наяўнай. Каб мы зараз павезлі на Захад выставу свайго мастацтва, канцэптуальна аналагічную згаданай эстонскай экспазіцыі, дык нас бы там, хутчэй за ўсё, прынялі за сваіх, але пытанне — ці ўспрынялі б як беларусаў?

Так што цалкам магчыма, што досвед захавання сваёй нацыянальна-культурнай тоеснасці, назапашаны ў эпоху, што скончылася ў 1991 годзе, будзе не лішнім і ў новым часе…

Хто яны — нашчадкі рэалізму?

РАСІЯ

Сёння рэалістычнае мастацтва пад уплывам сучасных мастацкіх плыняў церпіць ад сур'ёзных выпрабаванняў, аднак цікавасць да яго ў гледача па-ранейшаму не згасае. Пра гэта сведчыць экспазіцыя "Нашчадкі рэалізму" вядомых маскоўскіх мастакоў Уладзіміра Лепяшова і Барыса Кляменцьева, што адкрылася ў Бабруйскім мастацкім музеі.

Выстава адбылася дзякуючы ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле члена Саюза пісьменнікаў Расіі, філосафа Івана Ягорава. Іван Дзмітрыевіч — родам з Бабруйска, сувязь з горадам ён ніколі не перапыняў. Працягвае падтрымліваць добрасардэчныя адносіны з калектывам бабруйскай сярэдняй школы №1, у якой вучыўся і для якой зрабіў шмат добрага. Экспазіцыя "Нашчадкі рэалізму" ў Бабруйскім мастацкім музеі — яго чарговы падарунак гораду дзяцінства.

Уладзімір Лепяшоў і Барыс Кляменцьеў — выпускнікі Маскоўскага мастацкага інстытута імя Васіля Сурыкава. Кляменцьеў — вучань заснавальніка і рэктара Расійскай акадэміі жывапісу, скульптуры і дойлідства народнага мастака СССР, прафесара Ілы Глазунова. Лепяшоў вучыўся ў вядомага рускага і савецкага скульптара, народнага мастака СССР Уладзіміра Цыгаля.

У экспазіцыі прадстаўлены жывапіс Кляменцьева — партрэты "Матухна Яўстолія", "Я.Кірзін", "Ветэран В.А. Лебедзеў", у якіх аўтар дэманструе выдатнае тэхнічнае майстэрства і валоданне сакрэтамі класічнага жывапісу. Ёсць і работы ў тэхніцы пастэлі: партрэты спявачкі Валянціны Талкуновай, савецкага кампазітара Георгія Свірыдава і іншыя. У жанры пейзажнага жывапісу мастаку бліжэй за ўсё лірычная лінія расійскай школы, арыентаваная на класікаў канца XIX — пачатку XX стагоддзя, у якіх пейзаж — гэта паэтычнае пранікненне ў прыродны вобраз, напоўнены святлом, паветрам і бязмежнай прасторай.

Лепяшоў з'яўляецца аўтарам помнікаў выбітным асобам, скульптурных кампазіцый па матывах казак Паўла Бажова, якія ўпрыгожваюць парк у Маскве, помніка "Растокінскі дворнік", які стаў адной з маскоўскіх славутасцяў. На выставе ён прадставіў партрэты Патрыярха Кірыла, П'ера Кардэна, Дэніса Ціта — першага касмічнага турыста, а таксама парны партрэт пісьменнікаў-філосафаў братоў Ягоравых. Скульптар віртуозна прыкмячае характэрныя рысы мадэляў, выкарыстоўваючы розныя спосабы лепкі для перадачы індывідуальных асаблівасцяў. Работы вылучаюцца магутнасцю аб'ёмаў і выразнасцю ракурсаў.

Ала МАЛЬЦАВА,
навуковы супрацоўнік
Бабруйскага мастацкага музея

Уладзімір Лепяшоў і Барыс Кляменцьеў у выставачнай зале.

Тэатр можа быць у кіно

"Дон Жуан" прызямліўся на экран

рансляцыя? На сайце кінатэатра "Масква" — гэтак жа, як і іншыя кінапрэм'еры: акцэнтаваўся найперш… "закручаны" сюжэт. Але ж на оперы ходзяць не з-за гэтага! Дый мала каму з меламанаў магло прыйсці ў галаву вывучаць рэпертуар кінатэатра, бо ўсе ранейшыя падобныя паказы былі ў "Цэнтральным". Упэўнена, гледачоў было б куды больш, калі б ва ўсе трубы трубілі (у тым ліку, і праз навіны на сайце Вялікага тэатра Беларусі — а чаму б і не: папулярызацыя опернай культуры!), што ў пастаноўцы выкарыстаны абсалютна незнаёмыя нам фрагменты з іншай рэдакцыі гэтай оперы. Што аркестр грае на старадаўніх інструментах моцартаўскай эпохі, але без усялякага нафталіну. Што дырыжор Тэадор Курэнтзіс разбівае не толькі стэрэатыпы выканання, але і ўсё наша цяперашняе ўспрыняцце эстэтыкі музычнага класіцызму. А галоўнае, што адну з цэнтральных партый (і нават больш разгорнутую, чым самога Дон Жуана) спявае ўладальніца Гран-пры і прыза глядацкіх сімпатый нядаўняга Мінскага міжнароднага Калядна-га конкурсу вакалістаў Надзея Паўлава. І што наша публіка можа ўбачыць яе цяпер не толькі ў канцэртных нумарах, але і ў цэласным спектаклі. І што менавіта наш тэатр, зладзіўшы той конкурс, адкрыў Надзею Паўлаву, вылучаную на "Залатую маску" за партыю доны Анны, не адно для мінчан, але і для сабраных у журы прадзюсараў з усяго свету.

> Цяпер у кінатэатрах ладзяцца трансляцыі лепшых спектакляў свету, у тым ліку — оперных. На сайце кінатэатра "Масква" — гэтак жа, як і іншыя кінапрэм'еры: **акцэнтаваўся... "закручаны" сюжэт.** Але ж на оперы ходзяць не з-за гэтага!

Спектакль, пастаўлены аргенцінскім рэжысёрам Валянцінай Караска, аказаўся больш чым спрэчным. Да дробязяў "правільная" дона Анна ператварылася ў гэткую сцерву з прыкметамі маньяка-забойцы. Юная, цнатлівая сялянка Царліна — у спрактыкаваную спакушальніцу, апантаную помстай. Іх кавалеры — дон Атавіа і Маззэта — у інфантыльных даверлівых хлопчыкаў. Намёкі на такія характары мне даводзілася бачыць у адной заходняй пастаноўцы. Але ў пермскай версіі тонкасць псіхалагічных адценняў адышла на другі план, усе фарбы былі намаляваны плакатнай гуашшу. Бо на першым месцы аказаліся не людзі (а менавіта душэўныя памкненні лепш за ўсё падуладныя музыцы), а лозунг: "Няхай жыве свабода!".

Нечаканым стаў і ўласна музычны складнік: Моцарт успрымаўся скрозь прызму эстэтыкі Франсіска Гоі, ад серыі афортаў "Капрычас" якога цягнуцца ніці да сучасных кінастрашылак. Класіцысцкі твор быў прачытаны як полістылёвы, з ахопам суцэльнага зрэзу традыцый — ад барока да позняга рамантызму і нават ледзь не джазавай энергетыкі ў асобных пасажах. Але ўсё гэта таксама было прачэрчана не тонкім пэндзлем, а літаральна малярнай кісцю — настолькі гіпертрафавана, каб заўважылі не толькі музыканты, а кожны, каму знаёмая творчасць Моцарта.

Ды толькі музыка ўсё роўна аказалася хіба часткай агульнай фонасферы, як гэта бывае ў драматычным тэатры ці кіно. Да партытуры ўвесь час далучаліся разнастайныя побытавыя гукі: скрыгат вялізных стэлажоў, набітых манекенамі, прарэзлівы "віск" пры размотванні скотча. Дый спевы оперных рэчытатываў часам пераходзілі ў акцёрскае маўленне, аркестравыя ж паўзы, што ірвалі музычную тканіну на кавалачкі-шматкі, успрымаліся тэатральнай цішынёй.

Абмеркаванне трансляцыі таксама можна было выкарыстаць для далейшай папулярызацыі нашага Вялікага тэатра. Увагу оперных заўсёднікаў прыцягнулі б выказванні пра ўбачанае заўважаных у зале нашых салістаў і іншых музычных дзеячаў (а можа, і ўбачаных на экране расійскіх крытыкаў, якія неаднаразова прыязджалі на Мінскі міжнародны Калядны оперны форум).

Відавочна адно: "АРТ Карпарэйшн" застаецца верны сваёй ідэі паказваць у Мінску не шараговыя спектаклі, а тыя, што адкрываюць новыя шляхі, прапаноўваюць прынцыпова іншае стаўленне да традыцыйных рэчаў. Не ўсялякая навінка можа стаць адразу дасканалай — наадварот, даўно заўважана, што шэдэўры ўзнікаюць звычайна не на старце, а на фінішы пэўнага мастацкага кірунку. Таму, як бы мы ні ўспрымалі тое ці іншае мастацкае ноу-хау — са знакам "плюс" ці "мінус", у кожным ёсць сваё адкрыццё, якое можа і павінна натхніць нашых айчынных творцаў не на паўтор, а на далейшае развіццё самых цікавых закладзеных у яго зерняў. А гледачоў — прывучыць да таго, што тэатр, як і ўсё ў жыцці, можа быць розным. Гэта значыць, зусім не адно такім, якім мы яго сабе ўяўляем.

Будзем на сувязі!

Нам цікавае Ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby**

Нясвіжскі палац за стагоддзі свайго існавання зведаў розныя часы і набываў розныя абліччы. Але амаль заўсёды ў Нясвіжы знаходзіліся ўнікальныя калекцыі — зброі, даспехаў, карцін, манет, медалёў, паляўнічых трафеяў. Іх стваральнікамі былі прадстаўнікі роду Радзівілаў. Так ужо сталася, што ў XX стагоддзі скарбы пакінулі сцены палаца і толькі са стварэннем музея-запаведніка "Нясвіж" артэфакты зноў пакрысе пачалі вяртацца. Працэс гэты ідзе не хутка, але, як і некалькі стагоддзяў таму, да фарміравання нясвіжскіх калекцый далучыліся… князі Радзівілы.

Працяг збіральніцкіх традыцый

Што нашчадкі Радзівілаў падаравалі музею ў Нясвіжы

Нашчадкі славутай фаміліі дапамагаюць музею-запаведніку "Нясвіж" у папаўненні фондаў. Мацей Радзівіл неаднаразова перадаваў у падарунак каштоўныя экспанаты. Варта згадаць копію сямейнай рэліквіі — абраз Маці Божай Ларэтанскай; калекцыю медалёў з выявамі прадстаўнікоў роду і адмыслова зроблены медаль у гонар 600-годдзя радзівілаўскага герба і 500-годдзя рода ў Нясвіжы, гравюры XVII стагоддзя. Нядаўна Мацей і Мікалай Радзівілы зноў наведалі колішнюю рэзідэнцыю продкаў. Нагодай для візіту сталі мерапрыемствы ў памяць Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі — палітыка, мецэната, вандроўніка, чалавека, які ператварыў драўляны пасёлак Нясвіж у мураваны горад з замкам, касцёлам, ратушай. 28 лютага споўнілася 400 гадоў з дня ягонай смерці.

Пра мерапрыемствы з гэтай нагоды ўжо было сказана дастаткова. У касцёле Божага Цела прайшла жалобная імша, якую правёў арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч. У Гетманскай зале адбылася прэзентацыя выданняў, прысвечаных Радзівілам — зборніка навуковых артыкулаў "Мікалай Радзівіл Чорны: палітык, дыпламат, мецэнат" і беларускага перакладу манаграфіі польскага гісторыка Томаша Кемпы "Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка, віленскі ваявода". Таксама госці маглі ўбачыць унікальны паўдаспех XVI стагоддзя з колішняй княжацкай калекцыі.

Сярод іншага музей-запаведнік "Нясвіж" атрымаў у гэты дзень некаторыя падарункі, пра якія варта распавесці падрабязней. Найперш гэта сучасная версія генеалагічнага дрэва, складзеная Мацеем і Мікалаем Радзівіламі. Радавод пачынаецца ад Сярпуція, які згадваецца ў 1380 годзе, і завяршаецца асобамі, якія з'явіліся на свет у 2015 годзе. А ўсяго ў ім пералічаны 448 прадстаўнікоў сям'і з нясвіжскай, клецкай, біржанскай, алыцкай і іншых ліній роду! Не адзначаны толькі Станіслаў Радзівіл, які нарадзіўся… за тыдзень да перадачы радаводу ў музей.

Выклікае цікавасць і партрэт аднаго з уладароў старога Нясвіжа Міхала Казіміра Радзівіла (1635 — 1680). Пра гэтага чалавека вядома значна менш, чым пра Сіротку, або пра Чорнага, хаця ён шмат зрабіў і для Нясвіжа, і для краіны ў цэлым. Менавіта на яго часы прыпала вайна Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай. Падчас баявых дзеянняў нясвіжскі замак двойчы вытрымаў аблогі расійскіх войск, але сам горад быў спалены і разрабаваны. Жадаючы аднавіць цэнтр спадчынных уладанняў, М.-К. Радзівіл дамогся ад караля прывілея, якім нясвіжане вызваляліся ад выплаты мытных збораў і падаткаў. Ён жа рознымі ільготамі заахвочваў перасяляцца ў горад рамеснікаў, сялян, купцоў. Дзякуючы гэтым захадам неўзабаве Нясвіж зноў выглядаў як прыгожы горад, абнесены мурамі, з вялікай рыначнай плошчай і замкам.

Дарэчы, Міхал Казімір адзначыўся і ў бітвах. Ён амаль 12 гадоў быў польным гетманам (галоўнакамандуючым) Вялікага Княства Літоўскага. Удзельнічаў у змаганні з маскавітамі, шведамі, туркамі. Сярод іншага князь прывёў уласную харугву пад Хацінскі замак, дзе ў лістападзе 1673 года было разбіта войска Асманскай імперыі. Міхал Радзівіл біўся на чале аддзела, быў паранены ў галаву, але не пакінуў поле боя.

Напрыканцы жыцця Міхал Казімір па даручэнні караля Яна III Сабескага выправіўся ў дыпламатычную паездку па краінах Заходняй Еўропы. Яго мэтай было стварэнне шырокай антыту-рэцкай кааліцыі. Каб паказаць багацце і магутнасць Рэчы Паспалітай, Радзівіл не шкадаваў сродкаў на прадстаўнічыя мэты, асабліва на шыкоўныя ўезды ў Вену і Рым. Апошні нават быў адлюстраваны на карціне галандскага мастака Пітэра ван Блумэна, якая сёння захоўваецца ў адным з польскіх музеяў. Падчас гэтага падарожжа князь цяжка захварэў і памёр у італьянскай Балонні. Пазней яго цела было перавезена ў Нясвіж і пахавана ў крыпце езуіцкага касцёла.

Дырэктар музея-запаведніка Сяргей Клімаў прымае партрэт Міхала Казіміра Радзівіла.



Радаводнае дрэва і карта, якія нашчадкі Радзівілаў падаравалі музею.

На сённяшні дзень вядома няшмат выяў М.-К. Радзівіла. Прычым на ўсіх партрэтах, якія падобныя адзін на аднаго, ён паказаны яшчэ маладым чалавекам 20 — 25 гадоў, апранутым па заходнееўрапейскай модзе. З падоранай карціны на нас пазірае сталы мужчына ў рыцарскіх латах, які трымае ў руцэ жэзл ваеначальніка. Арыгінал гэтага партрэта, па словах Мацея, знаходзіцца ў Лівэрпулі. Якім чынам выява літвінскага магната трапіла на туманны Альбіён? Сам ён у Англіі не быў, а вось яго сыны Ежы Юзаф і Караль Станіслаў наведалі гэту краіну з дыпламатычнай місіяй — перадалі Якаву II Сцюарту віншаванні Яна Сабескага з нагоды ўступлення на трон. Магчыма, з'яўленне партрэта нейкім чынам звязана з гэтым візітам?

Таксама Мацей Радзівіл падараваў музею дзве карты, якія ілюструюць дзве розныя эпохі. Першая — арыгінальная лацінамоўная карта "Вялікае Княства Літоўскае і прылеглыя рэгіёны з іх дакладным апісаннем". Па сутнасці гэта паменшаны варыянт славутай карты ВКЛ, якая ўбачыла свет у 1613 годзе па ініцыятыве Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі, з некаторымі адрозненнямі. Адметна, што карта арыентавана не на поўнач, як мы прывыклі, і не на ўсход, як гэта было прынята ў сярэднявеччы, а на… захад. Хучэй за ўсё гэта было зроблена, каб работа адрознівалася ад аналагічнай прадукцыі канкурэнтаў. Сучаснаму гледачу першапачаткова цяжка ў ёй з'арыентавацца, але ўрэшце рэшт вока знаходзіць Нясвіж, Гродна, Вільню, Слуцк, Мінск, Полацк і іншыя гарады старажытнабеларускай дзяржавы. Цікава, што карта была расфарбавана ўручную, што дадае экспанату мастацкай вартасці.

Другая — "Карта ўладанняў Нясвіжскай ардынацыі князя Альбрыхта Радзівіла", складзеная ў 1925 годзе. Паводле савецка-польскага мірнага пагаднення 1921 года значная частка ўладанняў Альбрыхта Радзівіла апынулася на савецкім баку мяжы, а, значыць, была для яго страчана, і тым не менш князь заставаўся адным з буйнейшых землеўладальнікаў. Яму належалі землі на абшарах сённяшняга Нясвіжскага, Клецкага, Ганцавіцкага, Стаўбцоўскага і Баранавіцкага раёнаў. На буйнамаштабнай (1:126 000) карце пазначаны ворныя землі, пашы, лясныя масівы, якімі валодаў перадапошні нясвіжскі Радзівіл. Дакладна нанесены і падпісаны населеныя пункты, многія з якіх ужо не існуюць. Так што значэнне карты для гістарычных і краязнаўчых даследаванняў цяжка пераацаніць. Як распавёў Мацей Радзівіл, гэту карту яму перадала ў Клецку некалькі гадоў таму сталага веку кабета. Карта, выкананая ўручную, на аркушы паперы вялікага фармату, знаходзілася ў вельмі кепскім стане. Нашчадак роду адрэстаўраваў яе і вырашыў, што найлепшым месцам для далейшага захоўвання рарытэту будзе Нясвіж.

Перадаючы экспанаты музею-запаведніку "Нясвіж", Мацей Радзівіл адзначыў:

— Мае продкі заўсёды клапаціліся пра захаванне культурных традыцый. Прыемна, што ў Беларусі ёсць тыя, хто захоўвае створанае Радзівіламі. І хочацца верыць, што так будзе заўсёды, бо толькі той народ мае будучыню, які захоўвае ўласную памяць.

Андрэй БЛІНЕЦ,
загадчык сектара навукова-экспазіцыйнай дзейнасці Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж"

Версія

Дзе ж магіла рымляніна?

Няўжо Авідзій пахаваны ў Кажан-Гарадку?

Наша культурная спадчына багатая на еўрапейскія і ўсходнія культурна-стылёвыя ўплывы. Фактычна культуру беларускіх зямель не абмінуў ні адзін вялікі гісторыка-культурны стыль, пачынаючы ад візантыйскага і раманскага да постмадэрнізму. Тым не менш, старажытная Беларусь засталася за межамі вялікай еўрапейскай антычнасці, культур старажытных грэкаў і рымлян, якія вызначылі магістральны лёс народаў еўрапейскай цывілізацыі.

Разам з тым, пра беларускія землі ўзгадвалі антычныя аўтары, магчыма, пачынаючы з Гамера, іх апісваў Герадот, закраналі ў працах старажытныя рымскія аўтары Страбон, Пліній Старшы, Клаўдзій Пталямей, шматверагодна, што нашы землі наведвалі вядомыя грэкі, такія, як знакаміты падарожнік Піфей. Тым не менш, акрамя скарбаў манет і некаторых артэфактаў, — слядоў гандлёвай дзейнасці — нішто не сведчыць аб прысутнасці на нашых землях антычнай культуры і яе носьбітаў. Грэчаскія каланісты і рымскія легіёны не дайшлі да далёкага ляснога краю, які, згодна з іх уяўленнямі, насялялі загадкавыя гіпербарэі, неўры, будзіны, андрафагі, скіфы, сарматы.

Аднак тое, што не зрабіла гісторыя, стварыла фантазія міфаў. Сфармаваныя самасвядомыя народы, іх вышэйшыя саслоўі пачалі ствараць сваю сацыяльна-культурную міфалогію, міфалагічныя радаводы ад рымлян. Асэнсаваўшая сваю ідэнтычнасць шляхта Жмудзі і Літвы (Беларусі) пачала выводзіць свой радавод ад патрыцыя Палямона, як некалі ў Брытаніі першым каралём лічылі вымушанага пакінуць Італію Брута. Ішоў працэс міфалагічнай адаптацыі да мясцовых рэалій старажытнарымскай культуры, яе асоб, вынікам чаго былі дастаткова арыгінальныя міфемы. Так, у выданым Браніславай Кербеліте каталогу літоўскіх народных паданняў, а таксама ў публікацыі Віталя Вольскага пра Кажан-Гарадок (зараз вёска ў Лунінецкім раёне Брэсцкай вобласці) распавядаецца са слоў мясцовага старажыла аб тым, што каля ўскраіны майдана гэтага былога мястэчка, ва ўзвышшы, якое называюць Відушавай гарой, нібыта быў пахаваны славуты рымскі паэт Авідзій (ад гэтага гара і атрымала сваю назву як рэч незвычайная, відаль). Паэт нібыта загінуў недзе на Палессі і, адпаведна, знайшоў там свой апошні прытулак.

Рымскі паэт Публій Авідзій Назон (43 год да н.э. — 17 ці 18 гады н.э.), аўтар "Метамарфоз", "Майстэрства кахання", "Фастаў", "Трысцій (Журботных элегій)", "Лістоў з Понта", іншых твораў, — ці не самы папулярны ў Еўропе з выдатных прадстаўнікоў высокай рымскай культуры "залатога веку". У 8 годзе н.э. ён нечакана быў сасланы імператарам Аўгустам у маленькі грэчаскі горад-калонію Томы (сучасная Канстанца ў Румыніі) на заходнім узбярэжжы Чорнага мора, побач з якім жылі фракійскія плямёны "варвараў"-гетаў. Паэт тады знаходзіўся ў росквіце славы і тое, што здарылася, стала для яго цяжкім ударам. Аб прычынах ссылкі спрачаюцца да нашых дзён, аднак досыць верагодна, што Авідзій стаў ахвярай паказной маральнасці імператара Аўгуста і паплаціўся за свае любоўна-эратычныя творы. Так ці інакш, смутак, журба, успаміны аб былым жыцці, просьбы аб вяртанні зрабіліся галоўнай тэмай творчасці ссыльнага паэта, які скончыў жыццё ў Томах.

Беларускі тэкст сведчыць аб культурнай панарамнасці міфалагічнага поля, традыцыйнай беларускай здольнасці да зазямлення, лакалізацыі высокага ў тутэйшым, а таксама аб істотнай распаўсюджанасці легенды аб Авідзіі, які нібыта рабіў далёкія падарожжы і далучаў народы паўднёвай і ўсходняй Еўропы (у тым ліку славянскія) да рымскай адукаванасці. У дадзеным выпадку мы маем справу з літаратурна-кніжным пранікненнем у фальклор, мясцовай інтэрпрэтацыяй, створанай, магчыма, блізкай да паноў прыслугай, якая не раз чула звесткі аб рымскім паэце. Узнікненне на нашых землях гэтай легенды хутчэй за ўсё належыць да часоў рэнесанса і ранняга барока, XVI — першай паловы XVII стагоддзяў, калі ў Вялікім Княстве Літоўскім на хвалі культуры еўрапейскага Адраджэння ўзняўся інтарэс да антычных аўтараў, кнігі якіх паступалі з еўрапейскіх друкарань, а таксама перакладаліся на месцы. Спасылкі на Авідзія меліся ў творах прадстаўнікоў грамадскай, мастацкай думкі таго часу — Сымона Буднага, віленскага войта Аўгустына Ратундуса, уплыў паэта адзначаюць у "Песні пра зубра" Міколы Гусоўскага. Авідзій цытуецца нават у абвінаваўчай прамове на Варшаўскім працэсе Казіміра Лышчынскага 1689 года. Веданне латыні і старажытных рымскіх аўтараў склада-

З плытагонаў у песняры

Народнай капэле з Навагрудчыны магло б споўніцца 90 гадоў, але…

З даўніх часоў жыхары вёскі Дзяляцічы славіліся сваімі песнярамі. Старыя людзі распавядаюць, што сярод многіх караванаў, якія сплаўлялі па Нёмане лес, заўсёды можна было вызначыць дзяляціцкіх плытагонаў. Іхні шлях праходзіў ад вярхоўяў Нёмана аж да мяжы з Літвой, і паўсюль іх пазнавалі па прыгожых песнях.

Дзяляціцкая капэла. 1956 г.

Яшчэ ў 1926 годзе ў Дзяляцічах быў арганізаваны гурток моладзі, які займаўся прапагандай пачутых па радыё спеваў. У чэрвені гэтага ж года ў вясковым свіране адбыўся першы канцэрт невялікага хору, на які сабраліся амаль усе жыхары вёскі і навакольных хутароў. Затым выступленні прайшлі ў вёсках Любча, Вераскава, Нягневічы. Так пачалася гісторыя славутай Дзяляціцкай капэлы. У той час у ёй налічвалася 19 чалавек.

Удзельнікі хору не толькі прыгожа спявалі, але аказаліся і таленавітымі акцёрамі. У іх выкананні былі пастаўлены спектаклі "Паўлінка", "Першыя ластаўкі", "Раскіданае гняздо". Гэтыя п'есы былі забаронены польскімі уладамі, аднак усё ж іх патаемна рыхтавалі і паказвалі ў Дзяляцічах і іншых вёсках.

Пасля прыходу ў 1939 годзе савецкай улады хор пачаў адкрыта выступаць перад мясцовым насельніцтвам. А ў 1941 годзе пачалася Вялікая Айчынная вайна. Многія ўдзельнікі хору былі вывезены ў Германію, шмат вяскоўцаў пайшло ў партызаны. І нават падчас вайны яны не забываліся на песні. Іван Бушма, адзін з кіраўнікоў партызанскага хору, пасля згадваў: "Бывала, у партызанскай зямлянцы або каля вогнішча як завядзеш нашу дзяляціцкую песню, дык аж сэрца зойдзецца і такая сіла ў грудзях абуджаецца, што хочацца помсціць ворагам за скалечанае жыццё, за параненую родную зямлю!.."

Многія ўдзельнікі хору загінулі на той вайне, але хор у Дзяляцічах усё ж адрадзіўся. Так, у 1948 годзе ён стаў удзельнікам агляду мастацкай самадзейнасці, які праводзіўся ў Баранавічах. Адна з харыстак, Ніна Мамчыц, згадвала пра той час: "Выйшлі мы на сцэну і разгубіліся. У зале такое прадстаўнічае журы, такая вялікая публіка. А нас усяго жменька, і адзеты мы небагата: белыя блузачкі і чорныя спаднічкі, якія сабралі з усёй вёскі. А трэба сказаць, што да нас выступалі вялікія хары, апрануты яны былі прыгожа. Тут здарылася зусім нечаканае: пагасла святло. Гэта надало нам смеласці, і мы заспявалі. А калі электрычныя лямпачкі загарэліся зноў, мы адразу ўбачылі, з якой увагай слухаюць нас і журы, і публіка. Замест трох песень мы спявалі тады ажно восем. А потым да нас на сцэну прыбег Генадзь Цітовіч і з хваляваннем у голасе вымавіў: " А мае ж вы людцы, адкуль жа вы такія? Пазычце мне свае басочкі!" Так мы і пазнаёміліся з гэтым цікавым і таленавітым чалавекам, які потым стаў часта бываць у нас, і які, па сутнасці, зрабіўся кіраўніком нашага хору. Генадзь Іванавіч дапамог нам падрыхтаваць шмат складаных шматгалосых песень: "Ой, шумі і радуйся, беларускі бор", "Гудзіць трактар каля ства", рускую народную песню "Позарастали стежки-дорожки" і іншыя".

Капэла ў 1954-м годзе.

Дзякуючы працы пад кіраўніцтвам Генадзя Цітовіча ў 1951 годзе на Рэспубліканскім аглядзе мастацкай самадзейнасці хор заваяваў першае месца. Аднак хутка Генадзю Іванавічу дарачылі арганізоўваць Беларускі народны хор у Мінску і ён ужо не меў магчымасці наведваць Дзяляцічы.

Паступова выступленні хору прыпыніліся, але ў 1954 годзе яго кіраўніком быў прызначаны выкладчык Гродзенскага музычна-педагагічнага вучылішча Панцеляймон Радаліцкі. Чулы і добразычлівы чалавек, ён стаў душой калектыву, пачаў аднаўляць рэпертуар, запісваць песні, якія спявалі ў Дзяляцічах, аранжыроўваць іх у чатырох-, шасці- і нават у васьмігалосым выкананні. Таленавіты музыкант і педагог, ён змог арганізаваць з'яднаны калектыў, развіўшы ў многіх музычныя здольнасці.

Згадвае Марыя Дароніна: "Я у той час была школьніцай. Панцеляймон Радаліцкі прыйшоў у школу, каб паслухаць, як спяваюць дзеці. Пачуўшы стройны спеў, звонкія дзіцячыя галасы, ён адабраў дзесяць дзяўчынак для ўдзелу ў хоры. Так я, будучы кіраўнік, аказалася ўдзельніцай Дзяляціцкага хору, ці, як яго яшчэ называюць, "Хору трох пакаленняў", таму што ў ім спявалі дзеці, бацькі і дзяды. Пачаліся рэпетыцыі, канцэрты, гастролі не толькі па Беларусі, але і па Літве і Польшчы."

У 1956 годзе хор адзначаў сваё трыццацігоддзе. На святкаванні прыехалі Рыгор Шырма і Генадзь Цітовіч. За выдатнае выканальніцкае майстэрства хору было прысвоена званне народнай Дзяляціцкай харавой капэлы.

Пасля таго, як Радаліцкі пакінуў калектыў па хваробе, ніхто з наступных кіраўнікоў доўга не мог прыжыцца ў калектыве і яны часта мяняліся. У 1966 годзе кіраўніком капэлы была прызначана Марыя Дароніна. Пачалася доўгая і складаная работа па падрыхтоўцы рэпертуару. Цяжкасцей было вельмі шмат. На кожную рэпетыцыю Марыя Іванаўна ездзіла з Навагрудка два разы на тыдзень. А гэта 30 кіламетраў туды і назад.

Рэпетыцыі калектыву прызначаліся на восем гадзін вечара, таму што людзям патрэбна было пасля асноўнай работы яшчэ справіцца па ўласнай гаспадарцы. Вяртацца дадому даводзілася позна, і кіраўніка хору адвозілі дадому на дзяжурнай калгаснай машыне пад гадзіну ночы, а то і пазней. Таксама новай кіраўніцы хору было складана падабраць рэпертуар. У асноўным у праграму Марыя Дароніна брала народныя песні ў апрацоўцы беларускіх кампазітараў, нашу класіку. Рускія песні калектыў таксама выконваў, але вельмі рэдка. Спявалі таксама украінскія, літоўскія, польскія рэчы...

Вялікім стымулам у рабоце былі паездкі з канцэртамі не толькі па раёне, але і ў Гродна, Мінск, а таксама ў Расію, Літву, Польшчу. Людзі адчувалі вялікую адказнасць, старанна падыходзілі да падрыхтоўкі канцэртаў. На выступленні ў суседнія вёскі хадзілі нават пехатой.

За сваю працу ўдзельнікі хору грошай не атрымлівалі, але для іх было прадугледжана матэрыяльнае стымуляванне. За кошт калгаса яны забяспечваліся палівам, а таксама ім аплачваўся газ і электрычнасць. На падвядзенні вынікаў працы калгаснікаў за год удзельнікі хору атрымлівалі грашовыя прэміі і ўзнагароды, каштоўныя падарункі.

У 1976 годзе капэла адзначыла сваё 50-годдзе, а ў 1986 годзе — 60-гадовы юбілей. Было многа падарункаў і цёплых слоў ад Міністэрства культуры краіны, абласнога ўпраўлення культуры, ад арганізацый і калектываў вобласці. І амаль адразу пасля правядзення святочных мерапрыемстваў капэла перастала існаваць.

З той пары прайшло шмат гадоў. І ўжо сёння, на адлегласці часу, добра відаць, што тая народная харавая капэла з Дзяляціч — унікальная з'ява ў культурным жыцці не толькі Навагрудчыны, але, мабыць, і ўсёй Беларусі.

Галіна КАВАЛЬЧУК,
старшы навуковы супрацоўнік Навагрудскага гісторыка-краязнаўчага музея

ла аснову адукацыі ў шматлікіх калегіўмах на нашых землях.

Напэўна, гэтыя ўплывы не абмінулі і Кажан-Гарадок — старадаўняе пасяленне, старажытнае мястэчка, якое вяло значны гандаль па ажыўленым шляху па рацэ Прыпяць, мела кірмашы. У мястэчку быў панскі маёнтак, якім у старажытнасці ўладарылі Кішкі, Падбярэцкія. У 1635 годзе Даратэяй Падбярэцкай у мястэчку быў пабудаваны кальвінісцкі храм, што сведчыць аб уключанасці ў тагачасныя культурныя працэсы.

Цікавасць да лёсу Авідзія ў выгнанні не знікала ў Еўропе, у XVIII — пачатку XIX стагоддзяў выказваліся меркаванні аб месцы яго жыцця і пахавання. Між іншым, яно лакалізавалася нават у Паднястроў'і ці ўвогуле лічылася даследчыкамі невядомым, аднак паступова вышуквалася праўда. Цікавасць да гэтай праблемы адлюстроўвае напісаная паміж 1792 і 1800 гадамі балада рускага паэта Сямёна Баброва "Магіла Авідзія, слаўнага ўлюбёнца муз", дзе Авідзій звязваецца з Томамі. Аўтар піша, што Рым "Не мыслил, чтобы мужи грозны / Ума хоть искру крыли здесь; /Чтоб пели здесь *Эоны* поздны; / Чтоб чуждые потомки днесь / *Назона* в арфе прославляли / И слезны дни благословляли." У баладзе Авідзій шануецца як пясняр, які паспяхова выканаў цывілізатарскую місію ў варварскім асяроддзі. Аб "Назонавай магіле" у стэпу ля Томіса пісаў у элегіі і рускі паэт Віктар Цеплякоў (1829 год). Досыць міфалагізаваным паўстае вобраз Авідзія ў паэме Аляксандра Пушкіна "Цыганы". Там Авідзій — няздольны да самазабеспячэння "святы стары", якога апякуюць мясцовыя жыхары, ссохлы, бледны бадзяга, які завяшчаў перанесці свой прах на поўдзень. Версію аб актыўнай культуртрэгерскай дзейнасці паэта ў мясцовым асяроддзі падтрымліваюць і некаторыя сучасныя даследчыкі. Між тым, адзіныя крыніцы — творы Авідзія — сведчаць, што паэт ставіўся да акаляючага свету (людзей — гетаў, сарматаў, скіфаў, дакаў; прыроды) як да чужога, небяспечнага, дзікага, што рабілася нават штампамі. У "Трыстыі" паэт шкадуе, што няма каму чытаць свае творы, што па большай частцы быў вымушаны размаўляць "па-сармацку" і "па-гетску". Нават калі стасункі з "варварамі" наладжваліся, гэта не выклікала задавальнення паэта. У "Лістах з Понта" Авідзій з сорамам прызнаецца, што напісаў кніжку на гетскай мове (лічаць, што грэчаскім алфавітам) "нашымі строямі" аб Цэзары. Ён чытаў яе варварам, спадабаўся і пачаў "звацца паэтам" сярод гетаў, якіх ён назваў антыгуманнымі, нялюдскімі (inhumanos nomen habere Getas). У гарадах, у тым ліку Томах, дзе мелася значнае грэчаскае насельніцтва, жыхары ўшанавалі Авідзія ўрачыстым святарным вянком, вызвалілі ад падаткаў. Зразумела, уплыў паэта на мясцовых жыхароў меў месца, але не варта павялічваць яго памеры і ўзаемнасць. Тым не менш, Авідзій верыў, што па шматлікіх народах пойдзе гаворка аб ім, сасланым, і што яго жальбы будуць вядомы ўсяму свету, што і здарылася.

Эжэн Дэлакруа. "Авідзій сярод скіфаў".

Таямнічы арэол вакол выгнання, жыцця і творчасці ў Томах, месца пахавання Авідзія спрыяў стварэнню беларускай легендарнай канвы, тым больш, што паэта на нашых землях не забывалі — уплыў Авідзія прысутнічаў у творчасці паэтаў Беларусі часоў Асветніцтва Міхала Карыцкага, Францішка Князніна. Безумоўна тое, што шлях, які прывёў да стварэння самай гучнай легенды, звязанай з гістарычнымі асобамі — аб жыцці, смерці і пахаванні на нашай зямлі выдатнага рымскага паэта — быў складаным і загадкавым і звязаны паходжаннем з падзеямі непасрэдна ў былым Кажан-Гарадку.

Ігар УГЛІК,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.". (У рамках экспазіцыі дзейнічае выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя".**

Выставы:
■ Выстава **"Гоя... Пікаса"** (графіка са збору Каралеўскай акадэміі прыгожых мастацтваў, Мадрыд, Іспанія) — да 17 красавіка.
■ Выстава **"Час і творчасць Льва Бакста"** — да 17 красавіка.
■ Выстава твораў Юрыя Макарава **"Музыка вясны"** — да 11 красавіка.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

Выстава:
■ **"Віленскі альбом" Яна Казіміра Вільчынскага"** — да 17 красавіка.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Напярэдадні аднаго з самых значных хрысціянскіх святаў музей да самага Вялікадня кожную нядзелю запрашае на майстар-клас **"Пісанкі"** па прыгатаванні найважнейшага атрыбута свята — размаляваных велікодных яек.
Пачатак а 12-й.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выставы:
■ Выставачны праект **"Гандаль Беларусі на шалях гісторыі"** — да 1 чэрвеня.
■ Міжнародны выставачны праект **"Усё жыццё ў адным ровары"**, арганізаваны кампаніяй "ItalyMania" сумесна з музеем.
■ Міжнародная выстава **"Радзівілы. Вялікая эпоха князёў"** — да 28 сакавіка.
■ Выстава **"Баявыя нагалоўі засцерагальнага ўзбраення і харугвы беларускіх зямель XI — XVII стст."** — да 10 чэрвеня.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыі:
■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".
■ Выстава **"Зброя і гонар. Татары на службе ВКЛ"** — да 3 красавіка.
■ Інтэрактыўная выстава **"Вар'яцкая лабараторыя"**, падрыхтаваная сумесна з мінскім музеем папулярнай навукі "Элемента" — да 3 ліпеня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:
■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 9а. Тэл.: 237 46 94.
■ Выстава **"Мумії свету"** — да 6 мая.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.
■ Выстава **"Лукамор'е"** (фігуры, якія рухаюцца) — да 1 чэрвеня.
■ Выстава **"Экзатычныя жывёлы свету"** — да 5 верасня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
■ Выстава да 110-годдзя з дня нараджэння народнай артысткі Беларусі Рыты Млодак — да 31 сакавіка.
■ Выстава сцэнічнага касцюма і эскізаў да юбілея вядомай мастачкі па касцюмах Іны Булгакавай **"Грані майстэрства"** — да 18 красавіка.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:
■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выставы:
■ **"Аўтамабіль на далоні"**.
■ Выстава аўтарскіх і абераганочных лялек **"Таямніцы чароўнага лесу"** — да 10 красавіка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:
■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".
■ Выстава па матывах новага беларускага анімацыйнага фільма "Марк Шагал. Пачатак" — да 10 красавіка.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе:
пн. — выхадны,
аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,
сер. — ад 12-й да 20-й.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава "Беларусь — радзіма марскіх герояў", прысвечаная 110-годдзю падводнага флоту — да 24 красавіка.
■ Выстава **"Не жанчыны прыдумалі вайну..."**, якая ў фотаздымках распавядае пра лёс жанчын у гады мінулай вайны — да 24 красавіка.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; + 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Мастацтва ў камені"** — да 1 мая.
■ Выстава **"Фрагменты"** — да 3 красавіка.

Выставачная зала сектара экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
■ Выстава **"Адлюстраванне"** — да 24 красавіка.

Ратуша
■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Уецца веер акрылены"** (сумесны праект музея "Замкавы комплекс "Мір" і вядомага калекцыянера Ігара Сурмачэўскага) — да 5 верасня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.

Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выставы:
■ Выстава работ пецярбургскага мастака Ігара Шаймарданава "Вясёлы Пушкін" — да 23 красавіка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

Акцыі:
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстава:
■ **"Узнагароды краін свету"** (з фондаў Тракайскага гістарычнага музея) — да 10 красавіка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва".**

Выстава:
■ Выстава твораў Маргарыты і Людмілы Шчамялёвых **"Фарбы і ніці"** — да 3 красавіка.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г.Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выставы:
■ Выстава работ Галіны Сакалоўскай **"Прыгажосць свету ў бляску камянёў Swarovski"** — да 3 красавіка.
■ Выстава **"Свет імпрэсіянізму"** — да 3 красавіка.
■ Выстава **"Машыны, якія гавораць / Talking machine"**, пры ўдзеле творчай групы "Рамзэс Экспа" — да 27 сакавіка.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстава:
■ Выстава графікі і скульптуры Уладзіміра Даўгялы і Сяргея Аганава **"Гонар. Годнасць"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.
■ Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыі:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ "Народныя іконы Беларусі 2-й пал. XIX ст.".

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МѢСТА"

г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
■ Выстава ў рамках праекта **"KOLO-ART"**, дзе выстаўляюць свае работы мастакі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія працуюць у кірунку мастацкага тэкстылю — з 30 сакавіка да 27 красавіка.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея".**
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст.".**
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выставы:
■ Выстава-рэтраспектыва работ вядомага ізраільскага фотамастака Барыса Равіча **"Маімі вачыма"** — да 10 красавіка.
■ Выстава **"Мумії свету"** — да 8 мая.
■ Выстава пейзажнай фатаграфіі Віктара Босака **"Палескія матывы"** — да 3 красавіка.
■ Выстава **"Керамічны цуд з Гжелі"** — творы майстроў мастацтва і дызайну Гжэльскага дзяржаўнага ўніверсітэта — да 24 красавіка.

Вежа палаца

Экспазіцыя:
■ **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выставы:
■ Выстава **"Кнігі ў белых халатах"** — медыцынскія выданні XIX — пачатку XX стст. з аддзела рэдкай кнігі Гомельскай абласной бібліятэкі.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстава:
■ Выстава **экзатычных жывёл**.

Зімовы сад
■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл".**

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Па праве Памяці"**, прысвечаная Чырвонай арміі першай паловы XX стагоддзя, з фондаў музея.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.
■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выставы:
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Музейна-вобразная зала **"Як жылі нашы продкі"**.
■ Выстава **"Праваслаўныя храмы Лідскага краю"**.
■ Выстава **"Ад пяра гусінага да камп'ютара сучаснага"**.
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
■ Выстава **"Прыпавесці"** Міжнародных майстар-класаў іканапісу ў Навіцы (Польшча) — да 9 красавіка.
■ Выстава ласкутнага шыцця аўтараў з Беларусі, Расіі і Латвіі (у рамках міжнароднага дабрачыннага праекта **"Трыкатажныя куплеты-2016"**) — да 9 красавіка.
■ Выстава жывапісу Генадзя Сухамлінава — да 9 красавіка.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.
■ Міжнародная выстава аўтарскай лялькі і мядзведзяў Тэдзі "Панна Doll'я" — да 27 сакавіка. У рамках мерапрыемства — персанальная выстава Ганны Сілівончык, Васіля і Марыі Пяшкун **"Цудоўны сад"**.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
■ **26 — "Іаланта"** (опера ў 2-х дзеях з удзелам салісткі тэатра "Санкт-Пецярбург Опера" Валянціны Федзянёвай (Украіна).
■ **27 — "Маленькі прынц"** (балет у 2-х дзеях) Я.Глебава. Прэм'ера.
■ **29 — "Сівая легенда"** (опера ў 2-х дзеях) Дз.Смольскага.
■ **30 — "Баядэрка"** (балет у 3-х дзеях) Л.Мінкуса.
■ **30 —** Вечар старадаўняга раманса. Камерная зала імя Л.П.Александроўскай. Пачатак у 19.30.
■ **31 — "Тоска"** (опера ў 3-х дзеях) Дж.Пучыні.
■ **1 красавіка — "Сільфіда"** (рамантычны балет у 2-х дзеях) Х.Левянсхольда.
■ **2 — "Турандот"** (опера ў 3-х дзеях) Дж.Пучыні.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.
■ **26 — "Фінт-круазэ"** (дзве сучасныя камедыі) Д.Багаслаўскага, В.Красоўскага.
■ **27 — "Мабыць?"** (спектакль-даследаванне) А.Марчанкі.
■ **29 — "Тры Жызэлі"** (драма) А.Курэйчыка.
■ **30 — "Любоў людзей"** (пасялковая меладрама пасярод 70-х) Д.Багаслаўскага.
■ **31 — "Раскіданае гняздо"** (народная трагедыя) Я.Купалы.
■ **1 красавіка — "Містар Розыгрыш"** (гульні дарослых) С.Кандрашова.
■ **2 — "А мне не сорамна!.."** (больш, чым казка) Л.Усцінава. Пачатак а 12-й.
■ **2 — "Сталіца Эраўнд"** (парадаксальная камедыя) С.Гіргеля.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.
■ **27 — "Бураціна.BY"** (мюзікл для дзяцей і дарослых у 2-х дзеях) А.Рыбнікава. Пачатак у 11.30.
■ **27 — "Лятучая мыш"** (аперэта ў 3-х дзеях) І.Штраўса.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **26 — "Горад клоўна Піка"** (тэатральна-цыркавая фантазія) М.Барценева. Пачатак аб 11-й.
■ **31 — "Дзядзька Ваня і сястры тры"** (дыялогі для дарослых). Пачатак а 18-й.
■ **2 красавіка — "Цудоўная скрыня з зялёным гарошкам"** (для дзяцей ад 5 —7 гадоў). Пачатак аб 11-й.